

Н. С. Старжынская
Дз. М. Дубініна

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ



«Белы Вецер»

Н. С. Старжынская
Дз. М. Дубініна

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

Дапаможнік для педагогаў
устаноў, якія забяспечваюць атрыманне
дашкольнай адукацыі

*Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны
інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мазыр
ТАА ВД «Белы Вецер»
2008

УДК 373.21
ББК 74.102
С77

Рэцэнзенты:
кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры дашкольнай педагогікі і псіхалогіі Дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» **Л. Г. Тарусава**;
намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці дашкольнай установы № 92 г. Мінска **Л. К. Ладуцька**

**Старжынская, Н. С.**
С77 Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Н. С. Старжынская, Дз. М. Дубініна. — Мазыр : ТАА ВД «Белы Вецер», 2008. — 112, [4] с.
ISBN 978-985-514-126-7.

У дапаможніку прадстаўлены канспекты заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Змест заняткаў дапаможа ўзбагаціць слоўнік дзяцей найбольш часта ўжываемымі беларускімі словамі і іх граматычнымі формамі, сфарміраваць у іх паняцці (сацыяльна замацаваныя значэнні слоў), элементарнае разуменне беларускага слова як моўнай адзінкі, актывізаваць слоўнік, пазнаёміць дзяцей з асноўнымі асаблівасцямі гукавымаўлення на рускай і беларускай мовах.

Прызначаны для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі.

**УДК 373.21**
**ББК 74.102**

**ISBN 978-985-514-126-7**

© Старжынская Н. С., 2008
© Дубініна Дз. М., 2008
© ТАА ВД «Белы Вецер», 2008

# *Прадмова*

Авалоданне беларускімі дзецьмі рускай мовай — гэта авалоданне багацейшай крыніцай ведаў, сродак глыбокага рознабаковага развіцця дзіцяці. Авалоданне разам з рускай мовай беларускай складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці, засваення ім нацыянальнай культуры, станаўлення нацыянальнай самасвядомасці.

Блізкасць рускай і беларускай моў стварае спецыфічныя ўмовы для маўленчага выхавання дашкольнікаў. Большасць дзяцей адрозніваюць маўленне на кожнай з названых моў, разумеюць беларускую мову, могуць завучыць і ўзнавіць невялікія па аб'ёму вершы, загадкі і да т. п. на беларускай мове. Гэта значыць, маўленчае развіццё дашкольнікаў характарызуецца рэцэптыўным і ў пэўнай меры рэпрадуктыўным двухмоўем.

Але стыхійнае засваенне беларускай мовы ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя прыводзіць да моўнай інтэрферэнцыі — пранікненню беларусізмаў у рускае маўленне дзяцей і русізмаў — у беларускае. Дашкольнікі не заўважаюць сваіх памылак, у іх не фарміруецца «чуццё» адной і другой мовы. Авалодаць правільным беларускім маўленнем рускамоўныя дашкольнікі могуць толькі ў ходзе мэтанакіраванага навучання нацыянальнай мове.

Псіхалагічна правільным шляхам навучання дашкольнікаў беларускай мове, развіцця ў іх беларускага маўлення з'яўляецца той, які спалучае, з аднаго боку, неўсвядомленае засваенне беларускай мовы ў штодзённых зносінах (праслухоўванне і абмеркаванне мастацкіх твораў, удзел у беларускіх народных гульнях і да т. п.), і з другога — спецыяльна арганізаванае навучанне (заняткі па развіцці беларускага маўлення і мастацкай літаратуры).

Развіццё беларускага маўлення дзяцей неабходна ажыццяўляць паэтапна, пачынаючы з паступовага ўвядзення беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці дзяцей ужо ранняга ўзросту. Гэта робіцца з мэтай развіцця ў малых першапачатковых навыкаў разумення мовы, умення паўтараць за выхавальнікам і па меры магчымасці самастойна ўзнаўляць узоры беларускага маўлення (асобныя словы, кароткія пацешкі, песенькі, лічылкі і да т. п.), што служыць фарміраванню ў іх пачуццёвай асновы руска-беларускага двухмоўя. На наступным этапе працягваецца навучанне дашкольнікаў малодшага і сярэдняга

ўзросту рэпрадуктыўнаму беларускаму маўленню (пераказ, завучванне і ўзнаўленне кароткіх паэтычных твораў), ажыццяўляецца навучанне прадуктыўнаму маўленню, гэта значыць, уменню будаваць самастойныя па змесце і форме выказванні на беларускай мове (расказванне па карціне, пра цацку або прадмет, з асабістага вопыту). Нарэшце, у старэйшых дашкольнікаў, акрамя рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага маўлення (з элементамі творчасці), фарміруецца пачатковае асэнсаванне некаторых асаблівасцей беларускай мовы (фрыкатыўнае вымаўленне гукаў [г], [г'], заўсёды цвёрдае вымаўленне гука [р], наяўнасць спецыфічных сінтаксічных формаў тыпу *хвіліны са тры*, *хварэць на...* і г. д.). Навучанне на кожным наступным этапе ажыццяўляецца на фоне далейшага развіцця і ўдасканалення маўленчых навыкаў дзяцей, набытых на папярэдніх этапах.

Навучанне рускамоўных дзяцей беларускай мове дае станоўчыя вынікі пры строгім захаванні ў зносінах з дзіцём прынцыпу «адна асоба ў адной сітуацыі зносін — адна мова». Гэта значыць, што адзін і той жа выхавальнік можа выкарыстоўваць у зносінах з дзіцём і рускую, і беларускую мовы, але строга прытрымлівацца адной з іх на пэўных занятках, у гульнях і да т. п. або ў пэўныя дні. Такім чынам у дзяцей фарміруецца дыферэнцыраваная маўленчая ўстаноўка на выкарыстанне беларускай або рускай мовы ў адпаведных сітуацыях. Маўленчая ўстаноўка дапамагае пазбегнуць змешвання дзвюх моў у маўленчай практыцы, выступае перадумовай прадухілення і выкаранення памылак інтэрферэнцыі.

Спецыфіка методыкі навучання рускамоўных дашкольнікаў беларускай мове заключаецца ў абавязковым супастаўленні з'яў рускай і беларускай моў (па-беларуску кажам *у лісы лісяня*, а як па-руску?), каб размежаваць іх асаблівасці ў свядомасці дзіцяці. Такое супастаўленне тым больш важна, што толькі шляхам фарміравання элементарнага ўсведамлення з'яў беларускай і рускай моў і параўнання іх паміж сабой можна пазбегнуць або пераадолець інтэрферэнцыю.

Паўнацэннае маўленчае развіццё дзіцяці не можа ажыццяўляцца без апоры на мастацкае слова. У сучаснай сацыялінгвістычнай сітуацыі, калі дзіця часта чуе змешаную руска-беларускую гаворку, недасканалае маўленне выхавальніка, далучыць дзяцей да жывога беларускага слова, садзейнічаць засваенню выразных сродкаў роднай мовы на ўзроўні чуцця і тым самым забяспечыць узбагачэнне духоўнага свету кожнага дзіцяці магчыма толькі праз мастацкую літаратуру.

Беларуская мова выступае як «мова прыемнасці» (А. А. Лявонцьеў) у працэсе гульні, якая стварае асаблівую «сферу зносін» і выклікае найбольшую ўнутраную актыўнасць у дашкольнікаў. Пры гэтым пэўную сферу зносін замацоўвае для кожнай з моў прынцып «адна гульня — адна мова»: на занятках па развіцці маўлення на рускай ці беларускай мове выкарыстоўваюцца розныя гульні, што стварае неабходную маўленчую ўстаноўку на выкарыстанне той або іншай мовы.

Выхавальнік імкнецца забяспечыць дзецям радасць, задавальненне пры аваладанні беларускай мовай і захаваць станоўчую матывацыю яе засваення. Ён наладжвае асобасна значныя і эмацыянальна яскравыя зносіны на другой роднай мове. Асобасна арыентаваны падыход праяўляецца ў тым, што беларуская мова як другая родная мова для дзіцяці ўводзіцца як натуральны спосаб самавыражэння. Тады дзіця знаходзіць задавальненне ў зносінах з беларускамоўным суразмоўцам, у асобасным самавызначэнні, адчуванні поспеху і прасоўванні наперад у аваладанні беларускай мовай як сродкам зносін, у апраўданым павышэнні самаацэнкі.

На наш погляд, задачам рэалізацыі асобасна арыентаванага падыходу да навучання дашкольнікаў беларускай мове ў найбольшай ступені адпавядаюць заняткі ў форме спецыяльна арганізаваных *сеансаў актывізуючых зносін*. Сцэнарый зносін, паводле А. Г. Арушанавай, можа ўключаць размову выхавальніка з дзецьмі, дыдактычныя, рухавыя народныя гульні, інсцэніроўкі, гульні-драматызацыі, заняткі выяўленчым мастацтвам, канструяваннем, імітацыйныя практыкаванні, абследаванні прадметаў, разглядванне цацак, прадметаў, карцін — такія віды дзейнасці, у якіх маўленне выступае ва ўсіх разнастайных функцыях, нясе асноўную нагрузку пры вырашэнні практычных і пазнавальных задач. Асноўнае адрозненне паміж навучальнымі заняткамі і сцэнарыямі актывізуючых зносін складаецца з таго, што ў апошнім выпадку дарослы выступае як старэйшы партнёр па зносінах. Гэта чалавек, які імкнецца да ўстанаўлення раўнапраўных асобасных узаемаадносін. Ён паважае права дзіцяці на ініцыятыву, яго жаданне гаварыць на тэмы, што яго цікавяць, пазбягаць непрыемных сітуацый (не адказваць на незразумелыя і нецікавыя пытанні, не паўтараць за выхавальнікам тое, што ўсе чулі і да т. п.). Выхавальніка цікавіць перш за ўсё ўласнае ініцыятыўнае маўленне маленькага чалавека, дыялогі паміж дзецьмі, іх лінгвістычныя эксперыменты (песенькі, рыфмоўкі, словатворчасць). Удзел дзяцей у такіх занятках добраахвотны [1, с. 133—241].

У прапануемым дапаможніку прыводзяцца прыкладныя сцэнарыі зносін выхавальніка з дзецьмі на беларускай мове. У сцэнарыях вылучаюцца задачы развіцця маўлення, для вырашэння якіх падабраны канкрэтны моўны матэрыял, гульнявыя заданні, праблемныя сітуацыі такім чынам, каб актывізаваць маўленчыя зносіны дзяцей з дарослым і паміж сабой, іх неадвольнае сітуатыўнае маўленне, у тым ліку ініцыятыўнае, выкарыстанне невербальных сродкаў зносін. Галоўная мэта такіх заняткаў — устанаўленне эмацыянальнага кантакту, дасягненне ўзаемаразумення паміж усімі ўдзельнікамі дыялога, што складзе фундамент далейшых беларускамоўных зносін.

# АЗНАЯМЛЕННЕ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ДЗЯЦЕЙ РАННЯГА ЎЗРОСТУ

Ступень авалодання як роднай, так і другой мовай у дзіцячым узросце ў многім залежыць ад таго, наколькі поўна і правільна дзіця засвоіла іх на пачуццёвым узроўні. Моўнае чуццё — гэта неўсвядомленае веданне моўнай нормы, традыцыі ўжывання слоў, іх форм і спалучэнняў. Пачуццё роднай мовы набываецца ў працэсе штодзённых зносін з іншымі людзьмі. Без гэтага, сцвярджаў вялікі знаўца дзіцячага маўлення К. І. Чукоўскі, дзіця заставалася б «да канца сваіх дзён у галіне роднай мовы іншаземцам...» [10, с. 14]. Што датычыцца другой мовы, якую дзіця зусім або амаль не чуе ў штодзённым жыцці, то чуццё яе неабходна спецыяльна фарміраваць.

Значыць, у малых трэба выхоўваць пачуццё беларускай мовы, ствараючы для гэтага адпаведныя маўленчыя ўмовы, у якіх дзіця магло б пад кіраўніцтвам выхавальніка спакваля засвойваць «народны дух» беларускай мовы, далучацца да яе паэзіі. Азнаямленне дзяцей з беларускай культурай, літаратурай, музыкай ажыццяўляецца падчас розных рэжымных момантаў на працягу дня. Найбольш спрыяльным для разумовага і маўленчага развіцця малых з'яўляецца паступовае ўключэнне беларускай мовы ў розныя віды дзіцячай дзейнасці — гульнявую, выяўленчую, пазнавальную і інш.

Спрадвеку ў выхаваўчых і дыдактычных мэтах выкарыстоўвалася паэтычнае слова. Першыя ўздзеянні на ўспрымальную душу дзіцяці ажыццяўляюцца на ўзроўні мастацтва. Увесці рускамоўных дзяцей у атмасферу жывога беларускага слова, далучыць да багацця роднай мовы, адчуць яе прыгажосць, мелодыку, своеасаблівасць дазваляюць фальклорныя і лепшыя класічныя творы для маленькіх дзяцей: калыханкі, забаўлянкі, прыгаворкі, песенькі, казкі, вершы. Гэта, напрыклад, такія творы вуснай народнай творчасці, як «Ладачкі-ладкі», «Кую, кую ножку», «А курачка-рабушачка», «Не хадзі, коцік» і інш.; творы беларускіх паэтаў: «Бычок», «Мячык» С. Сокалава-Воюша, «Коцік-варкоцік» Н. Галіноўскай, «Чыкічыкі, сарока» Ул. Луцэвіч, «Маміна дачушка» Н. Тулупавай і інш.

Паступовасць увядзення беларускай мовы праяўляецца ў тым, што ўступная гутарка, разглядванне цацкі, тлумачэнні, звароты

да дзяцей спачатку вядуцца на рускай мове. Сам фальклорны твор чытаецца або расказваецца на беларускай мове. У час расказвання выхавальніку неабходна зацікавіць дзіця, стварыць такія ўмовы, каб у малога ўзнікла патрэба маўленчага ўзаемадзеяння з дарослым. Часцей маўленчыя ўзаемаадносіны ўзнікаюць, калі расказванне вершаваных радкоў суправаджаецца паказам нагляднасці (цацак, малюнкаў), дзеяннямі, што адпавядаюць зместу забаўлянкі: закалыхваннем лялек, плясканнем у далоні, прытупваннем, падскокамі і да т. п. Адзін з вызначальных прыёмаў, які можа быць выкарыстаны ў час расказвання твора, — інсцэніраванне. Гэта выклікае ў малых цікавасць да слухання пацешак, казак, заахвочвае да паўтарэння асобных слоў. Адны і тыя ж вершы, пацешкі чытаюцца малым некалькі разоў у розных сітуацыях: на арганізаваных занятках, падчас рэжымных момантаў, гульні, на прагулцы і г. д. Выхавальнік сам падбірае зручны момант для ўвядзення і паўтарэння таго ці іншага твора.

Ніжэй прыводзяцца прыкладныя сцэнарыі маўленчых зносін з дзецьмі 2—3 гадоў. Мэта іх правядзення — выклікаць у дзяцей цікавасць да слухання забаўлянкі ці верша на беларускай мове, пабуджаць да выканання пэўных дзеянняў, названых у творы, паўтарэння асобных слоў.

## *Маляты*
## *(сцэнарыі маўленчых зносін з дзецьмі)*

### *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Жук»*

Арганізацыя. Выхавальнік, трымаючы цацачнага жука, імітуе яго палёт, вымаўляючы: «Ж-ж-ж-ж-ж!». Пытаецца: «Хто гэта?». (Жук.) Як жук гудзе? Ж-ж-ж-ж-ж! (Дзеці паўтараюць.)

Выхавальнік зноў імітуе палёт жука, прагаворваючы забаўлянку:

Цераз плот, цераз плот
Жук ляціць у гарод
І гудзе, як самалёт:
— Ж-ж-ж-ж-ж-ж!

— Хто пакажа, як ляціць жук?

Дае цацку аднаму з дзяцей, той імітуе палёт жука, а выхавальнік у гэты час прагаворвае забаўлянку. Дзеці ўсе разам «гудзяць», як жукі.

## *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Зязюля»*

Арганізацыя. Перад дзецьмі то з'яўляецца, то знікае цацачная птушка. З'яўленне яе выхавальнік суправаджае гукаперайманнем «ку-ку». Тлумачыць: «Это птичка — кукушка, *зязюлька*. Она кукует: "ку-ку"».

Птушка сядае аднаму дзіцяці на руку, другому — на галаву, трэцяму — на нагу і г. д. Затым, трымаючы птушку ў руках, выхавальнік павольна прагаворвае пацешку (2—3 разы):

Зязюлька, зязюлька
У зялёным лясочку
Кліча на дубочку:
«Ку-ку, ку-ку, ку-ку».

— Як кліча зязюля? Ку-ку, ку-ку, ку-ку. (Заахвочвае малых да вымаўлення гукапераймання «ку-ку».)

Наступныя заняткі праводзяцца, як папярэднія. На трэціх зноў прапануецца малым паслухаць пацешку пра птушку. Тэкст павольна чытаецца 2—3 разы. Дзеці паўтараюць услед гукапераймальнае слова «ку-ку». Затым выхавальнік раздае дзецям цацачных птушак, каб яны іх разгледзелі, пагулялі з імі. Дзеці гуляюць з птушкамі, вымаўляючы «ку-ку». Выхавальнік хваліць кожнага з іх.

## *Разыгрыванне забаўлянкі Н. Тулупавай «Маміна дачушка»*

Арганізацыя. У выхавальніка лялька. Педагог звяртаецца да дзяцей: «Посмотрите, у меня Ляля, Лялечка. Это моя доченька, дачушка. (Падкрэслівае голасам слова *дачушка.*) Кто это? (Дачушка.) А что у Ляли на лице — *на тварыку*? Давайте посмотрим:

Гэта — вочкі,
Гэта — носік,
Гэта — роцік,
Гэта — вушка,
*(паказвае ўсе названыя часткі твару)*

Гэта — маміна дачушка!»

*(абдымае і прыціскае лялъку да сябе)*

Паўтарае забаўлянку яшчэ раз. Далучае малых да чытання забаўлянкі: дае аднаму з іх у рукі ляльку і прапануе паказаць, что ў Лялі на тварыку. Прагаворвае словы забаўлянкі, прыцягваючы дзіця да іх паўтарэння:

Гэта — ...

*(бярэ ручку малога і яго пальчыкам дакранаецца да аднаго, потым да другога вока лялькі)*

...вочкі, *(дзіця паўтарае)*

Гэта — ...

*(пальчыкам малога дакранаецца да носа лялькі)*

...носік *(дзіця паўтарае)*

І г. д.

Забаўлянка паўтараецца столькі разоў, колькі дзяцей удзельнічае ў занятках.

## *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Кую, кую ножку»*

Арганізацыя. У выхавальніка лялька ў беларускім убранні. Педагог звяртаецца да дзяцей: «Посмотрите, какая красивая у нас кукла — лялька. (Падкрэслівае голасам слова *лялька*, дзеці паўтараюць яго.) Лялька очень любит танцевать, вот только туфельки у нее порвались. Нужно их починить, подковать вот этим молоточком (показывает молоточек). Давайте ей поможем».

Чытае забаўлянку:

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.

*(імітуе падбіванне туфліка малаточкам)*

Трэба ножку падкаваць,
Каб умела танцаваць.

*(лялька «танцуе»)*

Чытае забаўлянку яшчэ раз.

Пры паўторным чытанні праз дзень-два дзеці могуць выконваць усе дзеянні. Выхавальнік, працягваючы дзіцяці малаточак, прапануе: «Коля, зрабі ляльцы "кую, кую ножку"". Чытае пацешку, а дзеці па чарзе «падбіваюць лялыцы туфлік». Прапануе малым паўтараць разам з ёю: «Кую, кую ножку, паеду ў дарожку».

## *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Коцік шэры»*

А р г а н і з а ц ы я. Выхавальнік паказвае цацачнага коціка: «Кто это? (Котик.) Посмотрите, какой котик? Котик серый, хвостик белый, котик пушистый. (Гладит котика.) Как котик поет? (Мур-мур-мур.) Котик поет: «Мур-мур-мур», так хорошо спать под его песенку! Поэтому мамы зовут котика, когда укладывают своих деток спать. Послушайте, как они его зовут».

Чытае забаўлянку:

А ты, каток шэры,
У цябе хвосцік белы.
Прыйдзі, каток, начаваць
І дзіцятка калыхаць.

Чытае забаўлянку яшчэ раз.

— Давайце і мы паклічам коціка: «Хадзі, коцік, да нас!»

Прапануе кожнаму дзіцяці паасобку паклікаць коціка: «Валя, пакліч коціка, скажы: "Хадзі, коцік да нас!"»

— Коцік шэры, хвосцік белы прыйшоў дзіця калыхаці. Давайце пакалышам нашых лялек.

Дзеці бяруць лялек, закалыхваюць іх, спяваючы: «А-а-а, а-а-а».

## *Разыгрыванне беларускай народнай калыханкі «Ой на коціка варкота»*

А р г а н і з а ц ы я. Выхавальнік паказвае цацачнага коціка. Пытаецца: «Как котик поет песенку?» (Мур-мур-мур.)

— Да, котик поет: «Мур-мур-мур». Он мурлычет. А еще можно сказать, что котик *варкоча*. Что котик делает? (Дети повторяют слово *варкоча*.) А что делают детки, когда котик мурлычет, *варкоча*? (Детки спят.) Послушайте, я вам расскажу про котика:

Ой, на коціка варкота,
А на дзіцятка дрымота,
Будзе коцік варкатаць,
А дзіцятка будзе спаць.

— А зараз я раскажу пра коціка і Андрэйку.

Чытае калыханку, замяняючы слова *дзіцятка* імем малога: «...а Андрэйка будзе спаць».

— Андрэйка, пакажы, як ты будзеш спаць. (Малы складвае ручкі пад шчочку, заплюшчвае вочы.)

Затым выхавальнік чытае калыханку «пра кожнага з дзяцей», якія ўдзельнічаюць у занятках. Кожнае дзіця паказвае, як яно будзе спаць.

Прапануе малым узяць лялек, пакалыхаць іх. Прагаворвае, заахвочваючы дзяцей да паўтарэння слоў: «Будзе коцік варкатаць, а дзіцятка будзе спаць».

## *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Сонейка-сонца»*

А р г а н і з а ц ы я. Выхавальнік загадзя загатаўлівае вялікі аркуш паперы, фламастары або каляровыя алоўкі для сябе і дзяцей.

— Сегодня мы с вами будем рисовать солнышко. (Малюе на аркушы паперы сонца.) Вот какое получилось солнышко, *сонейка*. Что мы нарисовали? (Солнышко, сонейка.)

Выхавальнік хавае аркуш з малюнкам. Пытаецца: «Дзе ж наша сонейка? Давайце яго паклічам:

Сонейка-сонца,
Выглянi ў аконца.
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку».

Дастае малюнак, усклікае: «Вось наша сонейка!»

Гульня паўтараецца 2—3 разы.

— Давайце дадзім гарошку нашаму сонейку. (Раздае малым алоўкі.) Намалюем гарошкі побач з сонейкам.

Малюе сам і запрашае дзетак маляваць, прагаворваючы: «Пасвяці нам трошку, дам табе гарошку».

## *Разыгрыванне беларускай народнай заклічкі «Слімак, слімак»*

А р г а н і з а ц ы я. Выхавальнік інтрыгуючым тонам гаворыць: «Посидите тихонько, сейчас к нам кто-то в гости должен прийти». Дастае цацку або малюнак з выявай слімака, павольна рухае да дзяцей.

— Кто это так медленно ползет? Это улитка. (Дети повторяют.) А по-белорусски называется *слімак*. Як скажам па-беларуску? (Слімак.) Паглядзіце, што ў слімака на галоўцы? (Рожкі.) Так, у слімака на галоўцы маленькія рожкі, вось такія! (Прыстаўляе да галавы з двух бакоў указальныя пальцы.) Пакажыце і вы, якія рожкі ў слімака. (Дзеці пальчыкамі паказваюць рожкі.) Слімак

можа хаваць свае рожкі. (Згінае пальцы ў кулак). Пакажыце, як слімак хавае рожкі. (Дзеці пераймаюць рухі выхавальніка.) А можа выпускаць рожкі. (Зноў разгінае пальцы.) Давайце пагуляем. Вы будзеце слімакамі. Калі я папрашу, выпусціце рожкі.

Выхавальнік прагаворвае забаўлянку:

Слімак, слімак,
Выпусці рожкі,
*(дае ўзор выканання дзеяння, дзеці паўтараюць)*
Дам мукі
На пірожкі.

Гульня паўтараецца некалькі разоў. Выхавальнік робіць паўзу перад словам *рожкі*, каб даць магчымасць дзецям дагаварыць яго.

Падчас наступных паўтарэнняў пацешкі выхавальнік робіць паўзы і перад іншымі словамі:

Слімак, слімак,
Выпусці... (рожкі),
Дам... (мукі)
На... (пірожкі).

Дзеці лепяць піражкі для слімака.

## *Разыгрыванне верша С. Сокалава-Воюша «У адной руцэ — сцяжок...»*

Арганізацыя. Выхавальнік трымае ў адной руцэ сцяжок, а ў другой — дудачку-ражок.

— Дзеці, паглядзіце, што ў мяне ёсць!

Паказвае дзецям, прагаворваючы:

У адной руцэ — сцяжок,
У другой руцэ — ражок.
*(прыкладвае ражок да вуснаў, імітуючы ігру)*
Ду-ду-ду, ду-ду-ду! —
Гэта я на свята йду.
*(крочыць на месцы)*

Раздае дзецям сцяжкі і дудачкі. Зноў прагаворвае: «У адной руцэ — сцяжок». Падымае руку са сцяжком, просіць малых: «Пакажыце свае сцяжкі». Працягвае: «У другой руцэ — ражок». Падымае руку з ражком, прапануе дзецям паказаць свае ражкі.

— Давайце паіграем *(зноў прыкладвае ражок да вуснаў, імітуючы ігру)*:

Ду-ду-ду, ду-ду-ду! —
*(дамагаецца, каб усе дзеці «ігралі»: «Вася, пайграй: ду-ду-ду. Каця добра іграе: ду-ду-ду. Малайцы!»)*
Гэта я на свята йду.
*(крочыць на месцы)*

— Зараз усе пойдзем на парад, на свята. Станем адзін за адным. Строіць малых. Ідзе наперадзе, прагаворваючы верш. Дзеці хорам «іграюць» на ражках: «Ду-ду-ду, ду-ду-ду!».

## *Разыгрыванне верша Н. Галіноўскай «Коцік-варкоцік»*

Арганізацыя. У выхавальніка ў руках цацачны коцік. Дзеці разглядваюць яго, называюць у адказ на пытанне: «Хто гэта?» — «Коцік».

— Як коцік спявае песеньку, помніце? (Мур-мур-мур.) Коцік спявае, варкоча: «мур-мур-мур». Як пра яго можна сказаць? Коцік-варкоцік. Як можна сказаць пра коціка? Коцік-... (варкоцік).

— Што коцік-варкоцік умее рабіць? Паглядзіце, коцік скача: скок, скок! (Імітуе з цацкай адпаведнае дзеянне.) Што коцік робіць? (Скок, скок! Скача.) А цяпер што робіць коцік? (Дастае мячык, імітуе гульню коціка з мячыкам.) Коцік гуляе з мячыкам. Вось так! Вось так! Што коцік робіць? (Гуляе з мячыкам.) Мячык пакаціўся, а коцік за ім пабег! Не дагнаў! Стаміўся коцік, захацеў спаць. Як коцік спіць? Паглядзіце:

Коцік-варкоцік
Лёг на жывоцік,
Лапкі пад вушка —
Не трэба падушка.

— Ёсць у коціка падушка? Няма падушкі! Ён лапкі палажыў пад вушка і спіць. Пакажыце, як коцік палажыў лапкі пад вушка.

Чытае вершык яшчэ два разы. Дае магчымасць дзецям дагаворваць асобныя словы:

Коцік-... (варкоцік)
Лёг на... (жывоцік),
Лапкі пад... (вушка) —
Не трэба... (падушка).

Дзеці зноў паказваюць, як спіць коцік.

## *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Ладкі ладком»*

Арганізацыя. Разыгрыванне забаўлянкі наладжваецца пасля заняткаў, на якіх дзеці ляпілі «піражкі» для лялькі. Выхавальнік прапануе пачаставаць лялек:

— Давайте угостим наших кукол — нашых *лялек* — пирожками. (Лялек саджаюць за сталы, перад імі ставяць талеркі з піражкамі.) Вкусные пирожки! Их нужно есть с медом. (Ставіць на стол «мёд».)

— Что еще дадим нашим лялькам? Давайте покормим их кашей. (Перад лялькамі ставяцца талеркі «з кашай».)

— Что нужно сказать лялькам? Кушайте пирожки с медом, кушайте кашу! (Дети повторяют.) Лялечки наши маленькие и кушать еще не умеют.

Пляскаючы ў далоні, выхавальнік прагаворвае забаўлянку:

Ладкі ладком,
Піражкі з мядком,
Кашка з алеем,
Есці не ўмеем.

— Давайце ўсе разам зробім ладачкі: ладкі ладком! (Паказвае, заахвоўваючы дзяцей паўтараць.)

Зноў чытае забаўлянку 1—2 разы, дзеці пляскаюць у далоні, па магчымасці дагаворваюць асобныя словы.

## *Разыгрыванне беларускай народнай забаўлянкі «Верабейчык»*

Арганізацыя. Выхавальнік узімку наладжвае назіранне за вераб'ямі (на прагулцы або праз акно):

— Посмотрите, как воробушки прыгают, скачут. На улице мороз, снег. Им, наверное, холодно. Холадна верабейчыкам, вось яны і скачуць.

Чытае забаўлянку:

Верабейчык скача, скача,
Яму холадна, няйначай,
Бо мароз трашчыць,
Бо сняжок блішчыць.

— Покажите, как прыгают воробушки, *верабейчыкі.*

Верабейчык скача, скача,
*(дзеці скачуць, «як верабейчыкі»)*
Яму холадна, няйначай.

— Пакажыце, што верабейчыку холадна. (Дзеці ахопліваюць сябе рукамі, нібы спрабуючы сагрэцца.) Вось як холадна верабейчыку.

Бо мароз трашчыць,
Бо сняжок блішчыць.

Гульня праводзіцца 2—3 разы.

## *Разыгрыванне верша А. Мясткоўскага «У зайчыка лапкі»*

А р г а н і з а ц ы я. Выхавальнік паведамляе: «Когда я вчера шла домой, я встретила... Кого бы вы думали? (Паказвае цацачнага зайчыка.) Кто это?» (Зайчик.) Зайчик какой? У него длинные... (Ушки.) Сзади у него коротенький... (Хвостик.) А это что у зайки? (Лапки.) У зайчика лапки, а у нас что? (Ножки.) Покажите ваши ножки! Вот какие ножки! Зайчик прыгает: скок-скок! (Показывает.) А мы ножками тупаем: туп-туп. Покажите, как вы тупаете.

Паказваючы цацку, чытае забаўлянку, імітуючы ўсе названыя дзеянні:

У зайчыка лапкі,
А ў мяне ножкі.
Зайчык сабе — скок-скок,
А я сабе — туп-туп.
Зайчык бег да лесу,
Я ішла дадому.
Зайчык сабе — скок-скок,
А я сабе — туп-туп!

— Зараз раскажам пра нашых дзетак. З каго пачнем? Раскажам спачатку пра Танечку (чытае забаўлянку «пра Таню», прыцягваючы малых да прагаворвання асобных слоў):

У зайчыка... (лапкі),
А ў Тані... (ножкі).
Зайчык сабе — скок-скок,
А Таццянка — туп-туп.

— Як Танечка тупае? (Дзіця паказвае.) Туп-туп!

Зайчык бег да лесу,
Таня ішла дадому.
Зайчык сабе — ... (скок-скок),
А Таццянка — ... (туп-туп!)

— А цяпер раскажам пра Колю. І г. д.

## *Разыгрыванне верша А. Якімовіча «Ліска»*

Арганізацыя. У выхавальніка цацка «Ліса». Ліса «асцярожна выглядвае» з-за стала.

— Дзеці, хто гэта выглядвае? (Ліса.) Чаго ж яна хоча? Чаго яна навастрыла вушы і ўглядаецца?

Навастрыла вушы ліска,
Пачала ўглядацца:
*(выхавальнік з дапамогай цацкі імітуе дзеянні лісы)*
Ці няма спажывы блізка —
Птушкі або зайца?

— Чаго навастрыла вушы ліска, пачала ўглядацца? Каго яна хоча злавіць? Птушку або зайца! Вось якая хітрая ліска! Пакажыце, як ліска навастрыла вушы. (Прыстаўляе да галавы ўказальныя пальцы, імітуючы лісіныя вушы. Заахвочвае дзяцей да пераймання.)

Навастрыла вушы ліска,
Пачала ўглядацца.

— Як ліска пачала ўглядацца? (Імітуе дзеянне, заахвочваючы і дзяцей.)

Ці няма спажывы блізка —
Птушкі або зайца?

Чытае вершык яшчэ 1—2 разы, разам з дзецьмі імітуючы дзеянні лісы.

## *Разыгрыванне верша А. Вольскага «Ліска»*

Арганізацыя. У выхавальніка цацка «Ліса». «Ад імя лісы» педагог чытае:

Я, ліса, лісіца, ліска,
Вельмі зайчыкаў люблю.
Падбяруся блізка-блізка
*(падносіць цацку блізка да дзяцей)*
І за хвосцік учаплю.
*(робіць рэзкі рух цацкай)*

Прапануе пагуляць у ліску і зайчыкаў. Выбіраецца адно дзіця-ліска (яму надзяюць шапачку-маску), астатнія — зайчыкі. Выхавальнік, трымаючы «ліску» за плечы, выразна чытае вершык зноў. Вымаўляючы словы «падбяруся блізка-блізка», робіць з дзіцём

некалькі крокаў наперад. Пасля апошніх слоў верша дзеці-зайчыкі разбягаюцца. Ліска спрабуе іх злавіць.

Гульня паўтараецца некалькі разоў з рознымі «ліскамі». Выхавальнік заахвочвае паўтарэнне слоў верша дзіцём, які выконвае ролю ліскі.

### *Разыгрыванне верша С. Беставай «Мышаняты»*

Арганізацыя. Сярод дзяцей выбіраюцца мышка і кот. Астатнія дзеці — мышаняты. Два-тры крэслы ставяцца побач, гэта — хата мышкі. «Кот» хаваецца за хатай. Выхавальнік прамаўляе:

З мамай мышкай мышаняты
Скачуць, скачуць каля хаты:
Тра-та-та, тра-та-та,
Жыць на свеце любата,
Толькі б далей ад ката.

«Мышаняты» з «мышкай» скачуць «каля хаты». На апошнія словы «кот» выбягае з-за хаты, дзеці-мышаняты разбягаюцца, а «кот» іх ловіць. Тое дзіця, якое злавілі, становіцца «катом».

Гульня паўтараецца некалькі разоў. Выхавальнік заахвочвае дзяцей паўтараць спачатку песеньку мышанят (апошнія тры радкі), а потым і ўвесь верш.

### *Разыгрыванне верша А. Кавалюк «Мыюцца кацяняты»*

Арганізацыя. У выхавальніка мяккая цацка «Кот». Імітуючы дзеянні коціка — мыццё (коцік аблізвае лапку, затым мые вушы, нос і г. д.), чытае верш:

Лапкай мяккай без вады
Умываюцца каты.
Мыюць вушы і насы,
І на спінцы валасы.
Так, як мамы,
Так, як таты,
Мыюцца і кацяняты.

— Як умываюцца каты? Мяккай лапкай без вады! Што яны робяць? Лапкай мыюць вушы, насы і на спінцы валасы. (Паказвае.)

— Хто хоча паказаць, як мыецца коцік?

Адно з дзяцей імітуе з дапамогай цацкі дзеянні ката, выхавальнік чытае верш.

Паўтараецца некалькі разоў. Выхавальнік заахвочвае дзяцей да паўтарэння асобных слоў і радкоў верша.

# ЗАНЯТКІ ПА НАВУЧАННІ ДАШКОЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Асноўнай мэтай навучання беларускай мове ў дашкольнай установе з'яўляецца авалоданне дзецьмі элементарнымі зносінамі на нацыянальнай мове. Адначасова вырашаюцца і іншыя педагагічныя задачы: развіццё мыслення, фантазіі, увагі, памяці, патрыятычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне і г. д.

Методыка навучання дашкольнікаў беларускай мове спалучае рысы методыкі роднай мовы і другой мовы. З дапамогай першай уводзяцца моўныя з'явы, што супадаюць у беларускай і рускай мовах. Гэта асабліва датычыцца развіцця лексічнага запасу на другой мове і вымаўленчых навыкаў. Чым больш адрозніваюцца беларуская і руская тэматычная лексіка, фанетыка, граматыка, тым с большай падставай выкарыстоўваецца методыка навучання дзяцей другой мове. Але і ў гэтым выпадку шырокае выкарыстанне такога займальнага матэрыялу, як вершы, загадкі, прыказкі і прымаўкі і да т. п., элементаў народных гульняў, гутаркі па змесце заняткаў выключна на беларускай мове набліжаюць прыёмы навучання другой мове да прыёмаў навучання рускай мове.

Перш за ўсё навучальны працэс неабходна будаваць такім чынам, каб дзеянні дзяцей былі сапраўды маўленчымі. Гэта значыць, што асноўная роля ў навучанні належыць не паўтарэнню асобных слоў, сказаў, не завучванню гатовых дыялогаў з наступным іх разыгрываннем, а творчаму працэсу, у якім кожнае выказванне пачынаецца з матыву, жадання нешта сказаць, падпарадкоўваецца мэце, дзеля якой будуецца выказванне. Натуральнай крыніцай матываў, якія пабуджаюць дашкольнікаў да маўлення на беларускай мове, з'яўляюцца гульнявыя сітуацыі. Менавіта ў такіх сітуацыях, падначаленых пэўнай тэме, дзеці засвойваюць групы беларускіх слоў па прынцыпе сэнсавай блізкасці: назвы птушак, колеру, дзеясловаў руху і інш.

Псіхалагічна нематываваным і найменш цікавым для дашкольнікаў з'яўляецца авалоданне правільным гукавымаўленнем, паколькі адрозненне ў вымаўленні гукаў рускай і беларускай моў не пару-

шае значэння слова і не перашкаджае яго разуменню. Таму немэтазгодна дабівацца ад выхаванцаў дакладнага, безакцэнтнага беларускага вымаўлення. Асэнсаванне асаблівасцей беларускай мовы ажыццяўляецца на аснове параўнання яе з рускай. Гэта садзейнічае размежаванню ў свядомасці дашкольнікаў элементаў адной і другой моў, служыць падставай для развіцця асэнсаванага самакантролю.

Навучанне беларускай мове ажыццяўляецца на спецыяльных занятках, якія ўяўляюць сабой зносіны выхавальніка з дзецьмі. Сцэнарый зносін можа ўключаць размову выхавальніка з дзецьмі, дыдактычныя, рухавыя, народныя гульні, інсцэніроўкі, гульні-драматызацыі, разглядванне карцін і інш. — такія віды дзейнасці, у якіх маўленне выступае ў разнастайных функцыях. У сцэнарыях актывізуючых зносін ставяцца і вырашаюцца задачы камунікатыўнага развіцця дзяцей, прабуджэння іх уласнай маўленчай актыўнасці, дыялогаў паміж дзецьмі. Набытыя падчас заняткаў веды і ўменні замацоўваюцца ў паўсядзённым жыцці, а таксама ў час індывідуальнай работы з дзецьмі.

З выхаванцамі чацвёртага года жыцця прапануецца праводзіць заняткі, пачынаючы з другой паловы года. Калі выхавальнік палічыць гэта немэтазгодным, таму што дзеці яго групы яшчэ не гатовы да такіх заняткаў, то ён абмяжуе сваю работу азнаямленнем з беларускай мовай толькі на пачуццёвым узроўні, а заняткі пачне праводзіць са старэйшымі «Чамучкамі».

У гэтым выпадку, адпаведна, першымі застаюцца заняткі па тэме «Родная мова», а наступныя выхавальнік плануе па сваім меркаванні.

Тое ж самае тычыцца поўнага пераходу правядзення заняткаў на беларускай мове. Першыя заняткі можна пачынаць праводзіць на рускай мове, а затым, у залежнасці ад поспехаў дзяцей у авалоданні мовай, паступова пераходзіць да беларускай. У прыкладных планах заняткаў актывізуючых зносін для дзяцей чацвёртага, пятага і шостага гадоў жыцця, якія прапануюцца ўвазе выхавальнікаў, не заўсёды падкрэсліваюцца моманты параўнання слоў, граматычных форм, гукавымаўлення на рускай і беларускай мовах. Аднак педагог не павінен забываць пра гэту работу.

Пры падрыхтоўцы матэрыялу для дадзенага раздзела выкарыстоўваліся фрагменты заняткаў, змешчаныя раней у часопісе «Пралеска» [5].

## *Чамучкі*
## *(4-ты год жыцця, 2-е паўгоддзе)*

### *Знаёмства*

П р а г р а м н ы   з м е с т. Пазнаёміць дзяцей з гучаннем іх імёнаў на беларускай мове. Вучыць называць рухі. Практыкаваць у правільным ужыванні дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку. Садзейнічаць наладжванню дзіцячых узаемаадносін, выклікаць у дзяцей жаданне ўступаць у зносіны, размаўляць адно з адным.

М а т э р ы я л. Цацкі «Мядзведзік» і «Буслік» — персанажы «Калыханкі»; малюнак «Дзеці ў карагодзе».

П л а н   п р а в я д з е н н я

Выхавальнік звяртаецца да дзяцей:

— Добры дзень, дзеці! Паглядзіце, хто да нас прыйшоў у госці. Гэта Мядзведзік і Буслік з «Калыханкі». Яны хочуць з вамі пазнаёміцца.

Мядзведзік і Буслік звяртаюцца да кожнага з дзяцей:

— Як цябе зваць? А цябе? А цябе? (Дзеці называюць свае імёны.)

— Зараз праверым, як Мядзведзік і Буслік запомнілі вашы імёны. Толькі яны гавораць па-беларуску.

Мядзведзік і Буслік гавораць:

— Мы помнім, як зваць дзяцей. Гэта Настачка, а вось Таццянка, гэты хлопчык — Янка, і цябе мы запомнілі: ты — Юрась (Міхаська, Васілёк, Пятрусь, Даша, Маша, Волечка, Дзяніска, Кастусь, Міколка, Пятрок, Гануля і г. д.).

Выхавальнік прапануе пагуляць у гульню «Абярніся». Дзеці становяцца ў кола, бяруцца за рукі. Выхавальнік прыгаворвае:

Топ, топ, гоп!
На пагорку чабор,
А пагорак круты.
Абярніся, Юрась, ты!

На словы «топ, топ» дзеці прытопваюць, а на слова «гоп» усе прысядаюць. Толькі Юрась (дзіця, якое назвалі) пасля апошніх слоў паварочваецца спіной да дзяцей. З гэтай прыгаворкай выхавальнік звяртаецца да кожнага. Заахвочвае малых прагаворваць пацешку разам з ім. Гульня працягваецца, пакуль усе не павернуцца спіной да цэнтра кола.

— А цяпер пагуляем інакш. Гульня называецца «Люстэрка». Люстэрка — гэта зеркало.

Дзеці стаяць у крузе. Адно дзіця ў цэнтры. Малыя ідуць па крузе пад словы выхавальніка:

Роўным кругам
У карагодзе
Любім мы, сябры, хадзіць.
Што нам Валечка (Танечка, Дзімачка і г. д.)
Пакажа —
Будзем дружна мы рабіць.

Дзіця ў цэнтры круга паказвае які-небудзь рух. Выхавальнік называе дзеянне па-беларуску, запрашае ўсіх дзяцей паўтарыць яго: «Настачка пляскае ў далоні, і мы давайце папляскаем. Вось так! Малайцы».

Гульня паўтараецца некалькі разоў. З цягам часу дзеці завучваюць словы гульні і прагаворваюць іх разам з выхавальнікам, міжволі запамінаючы назвы рухаў.

— Мядзведзік і Буслік задаволены. Цяпер яны ведаюць, як ваша імя гучыць па-беларуску. І вы ведаеце, як ваша імя гучыць па-беларуску.

— А зараз, калі ласка, паглядзіце на малюнак. Хто намаляваны? (Дзеці. Яны водзяць карагод.) Давайце дадзім імя кожнаму дзіцяці.

Калі дзеці даюць рускае імя, выхавальнік паўтарае яго па-беларуску, просіць дзяцей паўтарыць за ім.

Праз 1—2 дні з дзецьмі праводзяцца **гульні «Як цябе зваць?», «Назаві сваё прозвішча», «Маша»**.

З а ў в а г а! Праводзячы гульні тыпу «Знаёмства», неабходна выразна размяжоўваць гульні на рускай і беларускай мовах. Калі, напрыклад, дзяцей пазнаёмілі з гульнёй «Зеркало» на рускай мове, то на беларускай яе праводзіць не трэба. Тут і далей павінна спрацоўваць правіла «Адна гульня — адна мова», інакш дзецям вельмі складана дыферэнцыраваць рускую і беларускую мовы.

## *Гэта я*

П р а г р а м н ы з м е с т. Пазнаёміць дзяцей з назвамі колераў. Вучыць называць па-беларуску часткі цела чалавека (твар, вочы, вушы, галава, валасы, бровы, вусны). Практыкаваць у правільным выкарыстанні формы 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў (смяецца, плача). Фарміраваць уменне адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

М а т э р ы я л. Лялька; аркушы паперы з намаляваным пункцірам авалам (для кожнага дзіцяці); рознакаляровыя зорачкі, колькасць якіх на 1—2 перавышае колькасць дзяцей у групе.

П л а н п р а в я д з е н н я

Выхавальнік вітаецца з дзецьмі і паказвае лялькү:

— Добры дзень! Да вас завітала Алёнка. Помніце, мы з вамі расказвалі вершык пра Алёнку:

Гэта — вочкі,
Гэта — носік,
Гэта — роцік,
Гэта — вушка,
Гэта — маміна дачушка.

*Н. Тулупава*

— Давайце пакажам і разам са мной скажам гучна: гэта — ... (вочкі), гэта — ... (носік), гэта — ... (роцік), гэта — ... (вушка), гэта — ... (маміна дачушка).

— Цяпер няхай раскажа гэты вершык кожны з вас і пакажа вочкі, носік, роцік, вушка ў лялькі Алёнкі.

Выхавальнік прапануе малым пагуляць у гульню «Нос, нос, рот».

— Станьце, калі ласка, так, каб вы ўсе маглі мяне бачыць. Апусціце свае рукі ўніз, дакранайцеся далонькамі да сваіх каленак і гаварыце хутка разам са мной: «Паехалі, паехалі, паехалі». А цяпер я скажу «Нос!». (Выхавальнік паказвае на свой нос.) Пакажыце свае носікі. Так, малайцы! Зноў: «Паехалі, паехалі, паехалі. Рот!».

Спачатку выхавальнік называе і паказвае часткі твару правільна. Калі дзеці добра спраўляюцца з гульнявымі дзеяннямі, гульню можна ўскладніць.

— Слухайце мяне ўважліва. Я назаву якую-небудзь частку твару (лица), але пакажу зусім другую, а вам трэба паказаць на сваім твары тое, што я назаву, а не тое, што пакажу... Паехалі!..

Выхавальнік раздае малым аркушы паперы, на якіх пункцірам намаляваны круг.

— Давайце разам намалюем тварык. Спачатку намалюем кружок (тварык), цяпер намалюем вочкі, да вочак броўкі, затым носік. Чаго не хапае на нашым малюнку? Так, роціка. Намалюем роцік двума маленькімі дужкамі. Кожная дужка — вусны. Калі намаляваць вусны рожкамі ўверх, тады тварык, што робіць? (Смяецца.) А калі намаляваць вусны рожкамі ўніз? (Тварык плача.) А вы як зробіце?

— Што яшчэ трэба намаляваць, каб атрымаўся прыгожы тварык? Так, вушкі, на галаве — валасы.

— Вось якія прыгожыя тварыкі ў вас атрымаліся.

— Якога колеру шчочкі на тварыку? Расфарбуйце іх.

— Якога колеру вочкі? Расфарбуйце іх.

— Якога колеру вусны? Расфарбуйце іх.

— Якога колеру валасы? Расфарбуйце іх.

— Вы так добра малявалі, што кожны з вас атрымае за гэта зорачку. Зорачкі рознага колеру.

— Міхасік, якую табе даць зорачку: блакітную ці ружовую? (Выхавальнік паказкае зорачкі і называе колер кожнай з іх. Дзіця выбірае зорачку, якая спадабалася, з дапамогай педагога называе яе колер.)

— Алёнка, якую ты хочаш зорачку: жоўтую ці чырвоную?

Так працягваецца, пакуль усе дзеці не атрымаюць зорачкі.

— Да пабачэння, дзеці! Да скорай сустрэчы!

## *Мая сям'я*

П р а г р а м н ы  з м е с т. Пазнаёміць дзяцей са словамі *сям'я, мама, тата, бабуля, дзядуля, сын, дачка, брат, сястра.* Практыкаваць ва ўжыванні назоўнікаў у памяншальна-ласкальнай форме. Фарміраваць камунікатыўныя ўменні выхаванцаў, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

М а т э р ы я л. Карціна, на якой намалявана сям'я; атрыбуты для гульні «Жывыя карцінкі»: фартух, акуляры, вязаная рукавічка, хустка, барада, газета, цацачныя тэлевізар, пліта.

П л а н  п р а в я д з е н н я

Выхавальнік звяртаецца да дзяцей:

— Паглядзіце ўважліва на карціну. Хто тут намаляваны? (Свабодныя выказванні дзяцей.) Паслухайце, як я назаву членаў сям'і: мама, тата, бабуля, дзядуля, сястрычка, брацік. Хочаце, я раскажу пра гэту сям'ю верш?

Мы — працоўная сям'я —
Дзед, бабуля,
Тата, мама,
Брат з сястрой,
Таксама — я.

*В. Лукша*

Паўтарае верш яшчэ раз. Пры гэтым дзеці паказваюць на карціне пералічаных членаў сям'і па меры іх называння. Пры словах «таксама — я» паказваюць на сябе.

Па просьбе выхавальніка асобныя дзеці называюць членаў сям'і самастойна і паказваюць іх на карціне.

— Міколка, спытай у Тані, ці ёсць у яе сястра.

Дзіця з дапамогай выхавальніка будуе сказ: «Таня, у цябе ёсць сястра?» Таня адказвае: «Так, у мяне ёсць сястра» або «Не, у мяне няма сястры». Аналагічным чынам будуюцца сказы: «Каця, у цябе ёсць бабуля?» і да т. п.

Выхавальнік наладжвае гульню «Жывыя карцінкі»: Бабуля (на ёй акуляры, хустка) вяжа рукавічку (або шкарпэткі); дзядуля (акуляры, барада) чытае газету; мама (у фартуху) гатуе ля пліты; у дзяўчынкі — лялька, у хлопчыка — машынка і г. д. Астатнія дзеці адказваюць на пытанні: хто гэта? Што робяць? Каму мама гатуе абед? Што робіць бабуля? (Калі дзеці прапануюць іншыя ролі і дзеянні, выхавальнік будуе гульнявыя дзеянні ў адпаведнасці з іх пажаданнямі і прапановамі.)

— Як аб усіх гэтых людзях можна сказаць адным словам?

Дзед, бабуля,
Тата, мама,
Брат з сястрой,
Таксама — я.
Мы — вялікая... (сям'я).

— Як вы называеце сваю маму ласкава? (Свабодныя выказванні дзяцей.)

— Паслухайце, як ласкава можна назваць маму па-беларуску: мамачка, матуля, матулька, матулечка.

Педагог чытае ўрывак з верша Л. Пранчака:

Мілая, пяшчотная —
Мамка мая родная.
Светлая зараначка —
Дарагая мамачка.

— Давайце яшчэ раз назавём нашых мам вельмі ласкава. (Дзеці называюць усе вядомыя ім ласкавыя словы, выхавальнік дапамагае.) Вось колькі слоў мы ведаем пра дарагіх мамачак. Калі прыйдзеце дамоў, не забудзьцеся назваць сваіх мам ласкава.

## *Цацкі*

Праграмны змест. Вучыць дзяцей называць цацкі (лялька, ваўчок, зайчык, мядзведзік, мячык, посуд для лялькі, ложак для лялькі, крэсла для лялькі); увесці словы *цацкі*, *гуляць*. Практыкаваць ва ўжыванні слоў *так*, *не*, *дзякуй*, *калі ласка*. Практыкаваць у правільным вымаўленні гука [ў] (*ваўчок*), выкарыстанні загаднага ладу дзеяслова. Вучыць слухаць педагога, адказваць на яго пытанні. Заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

Матэрыял. Цацкі ў гульнявым кутку; цацка «Буслік».

План правядзення

Выхавальнік звяртаецца да дзяцей:

— Добры дзень, дзеці! Сёння да нас у госці зноў завітаў Буслік. Яму ўсё цікава (интересно) у нашай групе. Асабліва яму спадабаўся (понравился) наш гульнявы куточак. (Абводзіць куток рукой, паказваючы яго дзецям.) Як вы думаеце, чаму Бусліку так спадабаўся гульнявы куток? (Свабодныя выказванні дзяцей.) Так, тут вельмі шмат цацак (игрушек).

— Паглядзіце, якія цацкі ёсць у нашым гульнявым куточку. (Дзеці называюць цацкі.)

— Паслухайце, як Буслік назаве гэтыя цацкі па-беларуску. Гэта... хто ведае? Гэта лялька. Тоня, што гэта? (Лялька.) А гэта што? Канешне, мячык. Адгадайце, калі ласка, пра што я загадаю загадку:

> Б'юць яго,
> А ён не плача.
> А б'юць мацней.
> Вышэй ён скача.

Загадваючы загадку, выхавальнік дэманструе ўзгаданыя ў ёй дзеянні.

— Што ж гэта? (Мяч.) Вунь колькі мячыкаў у нашым кутку! Усе розныя.

— Волечка, прынясі сіні мячык. Пакажы дзеткам. Вось сіні мячык. Дзіма, прынясі нам чырвоны мячык. І г. д.

Выхавальнік раздае малым аркушы паперы, на якіх алоўкам намаляваны мячык з палоскай пасярэдзіне. У куточку аркуша фарбай прастаўлена невялікая пляма таго ці іншага колеру. Выхавальнік прапануе дзецям:

— Зафарбуйце (закрасьте) на мячыку белую палоску тым колерам, які вам больш падабаецца. Кацярынка, ты якім колерам зафарбуеш палосачку? Пакажы. Як гэты колер называецца? (Блакітны.) І г. д.

— Паглядзіце, у куточку аркуша паперы Буслік кожнаму з вас паставіў каляровую плямку (цветное пятнышко). Размалюйце кожны свой мячык поўнасцю тым колерам, які вам падарыў Буслік. Васілёк, які колер падарыў табе Буслік? (Сіні.) Значыць, расфарбуй мячык у сіні колер. Толькі палосачку не фарбуй. Яна ўжо каляровая. І г. д.

— Раскажыце, якога колеру ў вас мячыкі і якога колеру на іх палоскі. (Сіні мячык — ружовая палоска, чырвоны мячык — жоўтая палоска, зялёны мячык — карычневая палоска, жоўты мячык — блакітная палоска і да т. п.)

— А вось цікавая цацка, у яе толькі адна ножка. Што гэта? Ваўчок. Пакажыце Бусліку, як гуляюць з ваўчком.

Хто-небудзь з дзяцей заводзіць ваўчок, а выхавальнік прагаворвае:

Ваўчок-ваўчок,
Не лажысь на бачок.

— Дзякуй вам, дзеткі, цяпер Буслік будзе ведаць, як з гэтай цацкай гуляюць.

— А зараз уважліва паслухайце маю загадку, знайдзіце адгадку ў гульнявым куточку і назавіце яе:

Доўгае вуха,
Камячок пуху,
Скача лоўка,
Любіць маркоўку.

— У каго доўгія (длинные) вушы? (У зайчыка.) Правільна. Пакажыце зайчыка. Бачыце, ён такі пушысты, як камячок пуху. Што зайчык умее рабіць? (Імітуе дзеянне: «зайчык скача».) Зайчык скача. (Дзеці паўтараюць.) Паслухайце загадку яшчэ раз (чытае загадку, паказваючы цацку і імітуючы адпаведныя дзеянні):

Доўгае вуха,
Камячок пуху,
Скача лоўка,
Любіць... (маркоўку).

— Хто гэта? (Зайчык.)

— А гэта вось — мядзведзік Мішка, ён і плача, і раве... (Выхавальнік дэманструе, як раве мядзведзік — гучальная цацка.) Ён можа зрабіць, дзеці, усё, што вы папросіце: заспяваць, заплакаць, патанцаваць, легчы, устаць, паскакаць. Толькі трэба яго правільна папрасіць, абавязкова сказаць ветлівыя словы... Вось я папрашу: «Міша, калі ласка, паскачы». («Мішка скача».)

Дзеці просяць медзведзяня выканаць розныя дзеянні. Выхавальнік дапамагае ім.

Выхавальнік гаворыць, што Буслік хоча пагуляць з дзецьмі ў загадкі. Ён будзе адгадваць цацкі. Калі ён правільна назаве цацку, дзеці скажуць: «Так!», а калі няправільна, — «Не!». Бусліку завязваюць вочы хустачкай. Выхавальнік ставіць перад ім якую-небудзь цацку (напрыклад, ваўчок), а той спрабуе адгадаць яе: «Гэта лялька». Дзеці разам адказваюць: Не!» — «Гэта мядзведзік» — «Не!» — «Гэта ваўчок» — «Так!». І г. д. (Выкарыстоўваюцца цацкі: зайчык, мядзведзік, мячык, кубік, посуд для лялькі, крэсла для лялькі і інш.) Можна праводзіць адгадванне, выкары-

стоўваючы колеры цацак: пасля таго як будзе адгаданы, напрыклад, мячык, Буслік працягвае: «Гэта блакітны мячык» і да т. п.

— Буслік развітваецца з вамі: «Да спаткання».

## *Ветлівыя словы*

Праграмны змест. Пазнаёміць дзяцей з некаторымі формамі ветлівых зваротаў па-беларуску. Вучыць будаваць сказы з ужываннем ветлівых зваротаў, адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей на беларускай мове.

Матэрыял. «Беларускамоўныя» лялькі Янка і Алёнка; цацкі «Буслік» і «Кот»; мячык.

План правядзення

Выхавальнік звяртаецца да дзяцей:

— *Добры дзень*, дзеці! Я сёння прыйшла да вас не адна. Разам са мной прыйшлі хлопчык Янка, дзяўчынка Алёнка і маленькі Буслік. Яны хочуць з вамі павітацца (поздороваться).

— *Добрага ранку*, сябры! (Вітаецца Янка.)

— А вы, дзеці, як адкажаце Янку? (Добрага ранку!)

— *Добрага ранку!* (Вітаецца Алёнка.)

— Добрага ранку!

— *Прывітанне!* (Вітаецца Буслік.)

— Прывітанне!

— Вось мы і прывіталіся, пажадалі ўсім добрага дня. Якія словы мы гаварылі? (Добрага ранку! Прывітанне!) Так гавораць заўжды, калі сустракаюць чалавека першы раз за дзень.

— А зараз павітайце адзін аднаго. Можна прывітацца так, як з вамі прывіталася я; можна, як Янка; можна, як Алёнка; можна, як Буслік. А можна сказаць: «Добры дзень!», «Добры вечар!».

Дзеці вітаюцца адно з адным:

— Добры дзень, Міхасік!

— Добрай раніцы, Кацярынка!

— Прывітанне, Паўлік! І г. д.

— Вось якія мы з вамі ветлівыя.

— Акрамя прывітальных, ёсць і іншыя ветлівыя словы. Паслухайце вершык пра коціка (паказвае цацку), які ведаў такое слова:

Кот Мацей пад лаўкаю
Скварку з'еў —
І мяўкае:
— *Дзякуй*, бабка!
— *Дзякуй*, дзед!
— *Дзякуй*, Данік, за абед!

*М. Чарняўскі*

— Якое ветлівае слова ведае коцік? (Дзякуй!) Дзякуй — гэта значыць *спасибо*. Калі трэба казаць *дзякуй*? (Свабодныя выказванні дзяцей.)

— Для таго каб папрасіць што-небудзь, таксама ёсць прыгожае ветлівае слова *калі ласка*. Давайце ўсе разам скажам: «Калі ласка».

— У мяне ёсць мячык. Аксанка, папрасі ў мяне мячык. Як ты скажаш? Надзея Міхайлаўна, дайце мне, калі ласка, ... (мячык). Паўтары, Аксанка. Малайчына. На табе мячык! Што цяпер трэба сказаць? (Дзякуй!)

— Міколка, папрасі ў Аксанкі мячык.

Дзеці па чарзе «просяць» адзін у аднаго мячык, ужываючы ветлівыя словы.

## *Чамучкі*
## *(5-ты год жыцця)*

### ***Родная мова***

П р а г р а м н ы  з м е с т. Выхоўваць у дзяцей цікавасць да беларускай мовы, жаданне навучыцца размаўляць на ёй. Вучыць слухаць беларускае маўленне педагога. Звярнуць увагу на падабенства рускай і беларускай моў. Пазнаёміць з асобнымі словамі і словазлучэннямі (беларуская мова, гульня, калыханка і інш.).

М а т э р ы я л. Запіс мелодыі калыханкі з тэлевізійнай перадачы «Калыханка»; малюнкі з выявамі персанажаў «Калыханкі»; 2—3 лялькі або іншыя буйныя цацкі-жывёлы, кубік, цукерка (імітацыя); малюнак «Янка і Алёнка».

П л а н  п р а в я д з е н н я

Гучыць мелодыя калыханкі. Выхавальнік пытаецца:

— Что это за песня? Что такое калыханка? (Это песня, которую поют перед сном, чтобы дети лучше засыпали.) Давайте подпоем все вместе.

— Какие персонажи из «Калыханки» вам нравятся? На каком языке они разговаривают? (На белорусском.) Нравится вам, как они говорят по-белорусски? Где вы еще слышите, как разговаривают по-белорусски? (В деревне, по радио, телевизору, белорусский язык учат в школе старшие братья и сестры, мама читала книжку на белорусском языке...)

— Хотите и вы так же хорошо говорить по-белорусски, как Буслик?

— Белорусский язык и русский язык очень похожи. В них много одинаковых слов. Вот, например, что это? (Показывает кубик.) І па-беларуску таксама *кубік*. А это? (Стол.) І па-беларуску гаворым *стол*.

— В русском и белорусском языках очень много похожих слов. Вот послушайте: по-русски мы говорим *дети*, а по-белорусски — *дзеці*. По-русски мы говорим *детский сад*, а по-белорусски — *дзіцячы сад*. Правда, похоже?

— Но есть слова, совсем не похожие друг на друга. Например, как называется эта игрушка? (Кукла.) А як яна называецца пабеларуску, хто ведае? (Лялька.) Правильно. А что это у нашей куклы — ляльки? (Конфета.) А як сказаць па-беларуску? (Цукерка.)

— Мы с вами разучивали белорусские стихи, пели белорусские песенки. Давайте вспомним их. Я буду начинать, а вы будете подсказывать мне белорусские слова.

Выхавальнік чытае знаёмыя дзецям пацешкі або вершыкі, не дагаворваючы апошнія словы ў радках. Калі малыя спрабуюць дагаворваць не толькі словы, а цэлыя радкі або пасля чытання першага радка працягваюць увесь верш, педагог падтрымлівае гэтае імкненне.

Баю, баю, баю,
Не кладзіся з краю,
Прыйдзе шэранькі... (ваўчок),
Схопіць цябе за... (бачок).

Ого-го, каза,
Ого-го, шэра!
На даліне воўк
З ваўчанятамі,
На гары каза
З... (казлянятамі).

Ой бычок, мой бысенька!
Залатая лысінка.
Бадучыя... (рогі),
Тупучыя... (ногі).
Ты паціхеньку хадзі
І дзіцятка не... (будзі).

Сонейка, сонца,
Выгляні ў... (аконца).
Пасвяці нам трошку,
Дам табе... (гарошку).

Я аладачкі з пяску
Сёння цэлы дзень... (пяку).
Але мой рахманы кот
Не бярэ аладкі ў... (рот).
— Коцік, коцік, не ўцякай!
Чаго хочаш?
— ... (Ма-ла-ка!)

*В. Іпатава*

Мы вядзем паіць на... (рэчку)
Кучаравую... (авечку).
Пі, авечачка, ... (ваду)
І вяртайся ў чараду.

*С. Сокалаў-Воюш*

Навастрыла вушы ліска,
Пачала... (углядацца):
Ці няма спажывы блізка —
Птушкі або... (зайца)?

— Ці любіце вы слухаць беларускія казкі і забаўлянкі, якія расказвае вам бабуля? А ці гаворыце вы на беларускай мове?

— Цяпер вы будзеце вучыцца гаварыць па-беларуску, гаварыць на беларускай мове. Вы будзеце гуляць у беларускія гульні — што такое гульні, хто ведае? (Игры.) Будзеце слухаць казкі і расказы на беларускай мове і самі навучыцеся гаварыць па-беларуску.

— Паглядзіце на малюнак. На малюнку Янка і Алёнка. Паслухайце, які вершык расказвае пра сябе Янка:

**Блакіт нябёс**

Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус...
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я — хлопчык-беларус.

*С. Сокалаў-Воюш*

— Паслухайце, які вершык расказвае пра сябе Алёнка:

Твар румяненькі,
Белая хустачка,
Я ўжо ведаю,
Я — беларусачка!
І хачу
Так, як тата і мама,
Родны край свой любіць
Я таксама!

*А. Бадак*

— Як мы завем хлопчыка, які нарадзіўся ў Беларусі? (Беларус.)

— Як мы завем дзяўчынку, якая нарадзілася ў Беларусі? (Беларусачка.)

— Янка і Алёнка размаўляюць паміж сабой на беларускай мове. Іх родная мова — беларуская.

— Вазьміце алоўкі (карандаши) чырвонага (красного) і чорнага колераў і ліст паперы, намалюйце ўзор на кашулі хлопчыка і на спадніцы дзяўчынкі.

## *Нашы імёны*

П р а г р а м н ы з м е с т. Замацоўваць ужыванне традыцыйных беларускіх форм імёнаў. Увесці ў слоўнік новыя словы, замацоўваць вядомыя: імя, прозвішча, працаваць, запрашаць, гаспадыня, пакупнік, сябар, дачка, унук, унучка, бабуля, дзядуля і інш. Замацоўваць правільнае вымаўленне гука [ц']. Практыкаваць у выкарыстанні інтанацыйных сродкаў у дыялозе. Вучыць карыстацца тыповымі канструкцыямі: «Мяне завуць...», «Яе (яго) завуць...», «Мне (яму, ёй) ... гадоў», «Як цябе завуць?». Звярнуць увагу на спосабы ўтварэння некаторых слоў. Развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей на беларускай мове.

М а т э р ы я л. Лялькі Янка і Алеся; малюнкі з выявамі казачных жывёл; сцяжок.

П л а н п р а в я д з е н н я

— Янка хоча загадаць вам загадку: «У цябе яно ёсць, у мяне яно ёсць, у яго таксама ёсць». Што гэта? (Дзеці выказваюць свае меркаванні.) У кожнага з нас ёсць імя. І ў мяне яно ёсць, у цябе таксама ёсць, і ў цябе ёсць (выхавальнік звяртаецца да некалькіх дзяцей), і ў нашых лялек ёсць — ва ўсіх нас ёсць сваё імя. Давайце назавем свае імёны.

Выхавальнік бярэ сцяжок і называе сябе: «Я — Іна Андрэеўна, а цябе як завуць?», перадае сцяжок «ляльцы» — «Я — Янка, а цябе як завуць?» — «Я — Алеся, а як цябе завуць?» — «Я ...» і г. д.

Алеся гаворыць:

— Акрамя тых імёнаў, што вы назвалі, у вас ёсць яшчэ шмат імёнаў. Не верыце? Я вам дакажу. Алёша, як цябе называюць мама і тата? (Алёша, Лёша.) А яшчэ як? (Сынок.) А цябе, Віта, як называюць мама і тата? (Дачка, дачушка.) А як вас называюць дзядуля і бабуля? (Унук, унучка.)

— Як вас называюць вашы родныя ласкава? (Сонейка, зайчык, коцік, радасць мая...)

— Вось бачыце, колькі ў нас імёнаў.

Колькі іх у нас — не злічыць,
Я і ты, яна і ён,

Столькі пад адным аблiччам
Можа розных быць імён.

Прымяраем мы імёны
Ў магазіне, у трамваі,
Дома і на стадыёне,
Кожны з нас іх прымярае,
ды адразу забывае.

— Давайце ўспомнім гэтыя імёны. Калі вы ідзяце па вуліцы, вы хто? (Пешаходы.) А калі едзеце ў аўтобусе ці поездзе? (Пасажыры.) А хто вы ў магазіне? (Пакупнікі.) А калі вас мамы прыводзяць у паліклініку да доктара, вы тады хто? (Пацыенты.) А на стадыёне хто з вас быў? Хто назіраў за спаборніцтвамі па тэлевізары? Вы балелі за любімую каманду? Значыць, вы былі... (балельшчыкі). А калі мы прыходзім у госці, мы становімся... (гасцямі). Вось, аказваецца, колькі ў нас яшчэ назваў.

— А як назваць дзяўчынку, якая дапамагае маці па гаспадарцы: гатаваць абед, мыць посуд, бялізну? Такая дзяўчынка добрая... (гаспадынька). Можа, хто яшчэ нагадае якія-небудзь імёны?

— Паслухайце верш пра іншыя імёны:

Я — Ілья,
Ты — Улас,
Ён — Тарас,
Колькі нас?
Ілья — раз,
Улас — два,
Тарас — тры.
Мы — сябры!

*Л. Пранчак*

— Хто гэтыя дзеці? (Сябры.) А хто вашыя сябры? Коля, у цябе ёсць сябар? Хто ён? Наташа, у цябе ёсць сяброўка? Хто яна? І г. д.

— Давайце пагуляем. Кожны з вас пераўтварыцца ў які-небудзь казачны персанаж. А хто ў які — вам падкажа малюнак. Я вам дам малюнкі. У каго хто намаляваны, той у таго і ператварыцца. Толькі нікому не паказвайце свае малюнкі і спачатку не гаварыце, кім вы будзеце. Скажаце, калі будзеце знаёміцца адно з адным.

Выхавальнік раздае малюнкі з выявамі казачных персанажаў: ваўка, Чабурашкі, вавёркі, зайца і інш. Па парах або па тройках персанажы вядуць дыялогі тыпу: «Добры дзень! Я мядзведзь. Мяне зваць Міхайла Таптыгін. Гэта мая сяброўка Ліса Патрыкееўна. А цябе як зваць? Колькі табе гадоў? Куды ты ідзеш? Прыходзь да мяне ў госці. Я цябе мёдам пачастую» і да т. п.

Гульня «Назаві сваё прозвішча». Дзеці ідуць па крузе. У сярэдзіне стаіць вядучы (спачатку гэта выхавальнік), які прыгаворвае:

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Бавім час мы не дарма —
Просім хуценька назваць
Сваё прозвішча, імя!

*Т. Шылько*

Вядучы паказвае на якое-небудзь дзіця, а тое хуценька называе сваё імя і прозвішча.

## *Садавіна і агародніна*

Праграмны змест. Замацоўваць у маўленні дзяцей назвы колераў. Вучыць называць па-беларуску садавіну і агародніну (яблык, груша, персік, абрыкос, кавун; бурак, бульба, цыбуля, морква, часнок, гарбуз, капуста, агурок); увесці словы *садавіна, агародніна.* Адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [р], [ў] у складах, словах, сказах. Практыкаваць у правільным дапасаванні назоўнікаў да прыметнікаў. Вучыць адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

Матэрыял. Лялькі Янка і Алёнка; кошыкі з агароднінай і садавінай; яблыкі на ўсіх дзяцей.

План правядзення

Выхавальнік пытаецца ў дзяцей, якая зараз пара года. (Восень.) Так, прыйшла восень. А разам з ёй — і ўраджай на агародах і ў садах.

— Алёнка і Янка завіталі да нас у госці і прынеслі ў кошыках садавіну і агародніну. Давайце разам з вамі паглядзім, якую садавіну і агародніну яны нам прынеслі.

Янка і Алёнка «вітаюцца»: «Добры дзень, дзеці!»

Восень залатая,
Ты нам прынясла
Поўны агароды
Ўсякага дабра:
Моркаўкі, цыбулькі,
Бручкі, бурачкоў,
Бульбы і капусты,
Рэдзькі, гарбузоў.

*В. Жуковіч*

(Па меры называння агародніны выхавальнік паказвае моркву, цыбулю, бурак, капусту, гарбуз.)

— Алёнка і Янка хочуць з вамі пагуляць. Яны будуць называць садавіну і агародніну і паказваць яе, а вы — у адказ будзеце гаварыць, ці правільна яны яе называюць. Спачатку паглядзім, якая ў кошыку агародніна.

Праводзіцца гульня «Так ці не» на пасіўнае распазнаванне слоў. Янка з завязанымі вачыма «называе» агародніну. Калі цацка названа правільна, дзеці кажуць: «Так!», а калі няправільна — «Не!».

— Бурак. (Так ці не.) Морква. (Так ці не.) І г. д.

Гэтак жа з лялькай Алёнкай праводзіцца гульня на распазнаванне садавіны.

— Паслухайце верш Рыгора Барадуліна «Загадкі на градках», знайдзіце адгадкі на загадкі ў кошыку:

У гародзе каля градак
Шмат цікавых ёсць загадак.
Той, хто градкі даглядае,
Той загадкі адгадае.

От бабуля важна села
і глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць,
як зачэпіш — будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
Называецца... *(цыбуля)*.

У бабулі родны брат
Ласкавейшы быццам,
А да слёз давесці рад
Так, як і сястрыца.
Ты не вельмі плач, сынок,
Калі шчыплецца... *(часнок)*.

Не сыдзе з месца
Ні на крок,
Зарыўшыся ў пярыну.
Цярэбіць ціхі вецярок
Зялёную чупрыну.

А возьмуць за чупрыну
Ды выцягнуць з пярыны —
Пачырванее небарак.
Вядома, што гэта... *(бурак)*.

Гэта што за важны туз,
Хвост зялёны,
Чэпкі вус?

Усім вядомы карапуз
Пузан Пузанавіч... *(гарбуз)*.

На градцы — доўгі і зялёны, а ў бочцы — жоўты і салёны. *(Агурок.)*

Тоўста наша маці, у яе лата на лаце. *(Капуста.)*

Сядзіць панна ў каморы, а яе косы на двары. *(Морква.)*

— Дзе растуць морква, капуста, агуркі, цыбуля, часнок, бурак, гарбуз? (На градках, у агародзе.) Як назваць усё, што расце на агародзе, адным словам? Усё гэта расце на агародзе і таму называецца... (агародніна).

— Хто бачыў, як расце агародніна? Дзе вы бачылі градкі? (Адказы дзяцей.) Як трэба даглядаць за градкамі з агароднінай? (Трэба палоць, паліваць.) Хто гэта ўсё робіць? А вы дапамагаеце дарослым? Як вы дапамагаеце?

— Паэтка Тадзіяна Кляшторная расказвае пра адну дзяўчынку, якая дапамагала сваёй бабулі:

На гародзе ў бабулі
Многа морквы і цыбулі,
Памідораў, агуркоў,
Часнаку і буракоў.
Я на грады пабягу
І бабулі памагу:
Моркву з рэпай прапалю,
А пасля гуркі палью.

— Давайце раскажам гэты верш разам. Я пачынаю, а вы заканчваеце радкі (у ходзе расказвання выхавальнік паказвае агародніну):

На гародзе ў бабулі
Многа морквы і... (цыбулі),
Памідораў,... (агуркоў),
Часнаку і... (буракоў).
Я на грады пабягу
І бабулі... (памагу):
Моркву з рэпай прапалю,
А пасля гуркі... (палью).

— Паглядзіце ўважліва на агародніну. Я буду называць агародніну, а вы будзеце гаварыць, якога яна колеру (агурок — зялёны, цыбуля — залацістая, бурак — бардовы і г. д.).

— А зараз пагуляем наадварот: я буду называць колер, а вы агародніну такога колеру, які я назаву.

— Паглядзім, што ляжыць у другім кошыку. (Яблык, груша, персік, абрыкос, кавун.) Дзе ўсё гэта расце? (На дрэвах, у садзе.) Гэта ўсё расце ў садзе і таму называецца... (садавіна).

Выхавальнік, трымаючы ў руках яблык, чытае верш І. Муравейкі:

Залацісты, спелы яблык
На маёй ляжыць далоні.
Залацісты, буйны яблык,
Быццам сонейка малое.

— Пра што гэты верш? (Пра яблык.) Па-беларуску кажам *яблык*, а як па-руску? (Яблоко.) А па-беларуску *яблык*. Які яблык? (Залацісты, спелы.) Які яшчэ? (Смачны, сакавіты, чырвоны...)

— Паглядзіце ўважліва на садавіну. Я буду называць садавіну, а вы будзеце гаварыць, якога яна колеру (яблык — чырвоны, груша — жоўтая, кавун — зялёны і г. д.).

— А зараз пагуляем наадварот, я буду называць колер, а вы садавіну таго колеру, што я назаву.

— Алёнка і Янка прынеслі нам смачныя яблыкі. Дзякуй вам! Пачастуйцеся, а потым скажыце, які яблык на смак (салодкі, кісла-салодкі, смачны, сакавіты).

— Давайце падзякуем сваім сябрам за частаванне і развітаемся з імі.

## *Мой дзень у дзіцячым садзе*

Праграмны змест. Замацоўваць ужыванне знаёмых слоў — назваў мэблі, цацак, колераў. Увесці ў слоўнік дзяцей назвы некаторых вучэбных прылад (пэндзаль, фарбы, лічыльныя палачкі і інш.), дзеясловы: гуляць, займацца, маляваць, рабіць, снедаць, вячэраць. Замацоўваць вымаўленне фрыкатыўнага гука [г] у словах і фразах. Практыкаваць у правільным выкарыстанні загаднага ладу дзеяслова (сядай), прыналежных прыметнікаў (Віцяў, Наташын і да т. п.). Замацоўваць уменне ўтвараць множны лік назоўнікаў (хлопчык — хлопчыкі, дзяўчынка — дзяўчынкі, кветка — кветкі і інш.). Надалей вучыць дзяцей слухаць, разумець маўленне выхавальніка, адказваць на яго пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

Матэрыял. Лялька Ганулля; цацачнае крэселка, сцяжок; у выхавальніка пэндзаль, фарбы, кошык,ваўчок, рукавічкі, хустка або іншыя рэчы, назвы якіх неабходна замацоўваць.

План правядзення

Хтосьці стукае ў дзверы. Выхавальнік уносіць ляльку Ганулю. Ганулля вітаецца з дзецьмі:

— Добры дзень, дзеці! Як у вас прыгожа! Які светлы пакой. Колькі ўсяго цікавага! Раскажыце мне, дзеці, пра свой пакой, што ў ім ёсць, чым вы тут займаецеся.

Выхавальнік прапануе запрасіць Ганулю сесці ў крэселка:

— Скажыце: «Сядай, Гануля, у крэселка». (Некалькі дзяцей паўтараюць.)

— Давайце пакажам і раскажам Ганулі, хто ёсць у нашым пакоі (комнате). Я — выхавальнік. Мяне завуць Настасся Іванаўна. Дзіма, раскажы Ганулі, хто я.

— Ганулька, глядзі, у нас ёсць хлопчыкі. Хлопчыкі, станьце каля мяне. Гэта... (хлопчыкі). Бачыш, якія лоўкія, моцныя! Яшчэ ў нас ёсць дзяўчынкі. Дзяўчынкі, станьце з гэтага боку. Вось якія ў нас... (дзяўчынкі). Усе прыгожыя, як прынцэсы!

— Давайце пакажам Ганульцы, якія рэчы ёсць у нашым пакоі. Гэта... (сталы), за сталамі... (крэселкі), тут... (шафа), у шафе... (кніжкі, цацкі, алоўкі, пэндзлі, фарбы для малявання, лічыльныя палачкі для заняткаў па матэматыцы і г. д. ), на падаконніку — ... (кветкі) і г. д.

Дзеці паўтараюць словы за выхавальнікам, называюць асобныя цацкі, іх колер.

Выхавальнік паказвае і называе рэчы, назвы якіх трэба замацаваць, выкладвае іх на стол. (Напрыклад: пэндзаль, фарбы, ваўчок, кошык, хустка, гузік.) Прапануе некальнкім дзецям узяць па адной рэчы. Дзеці хаваюць рэчы за спіны.

Праводзіцца гульня «Чыя рэч?». Выхавальнік «адгадвае»: «Ваўчок Коляў?» — «Не!», «А чый жа? Пецяў?» — «Не!», «Машын?» — «Так!». І да т. п.

Пасля таго як выхавальнік адгадае, чыя рэч, уладальнік перадае яе іншаму дзіцяці.

У ходзе гульні выхавальнік пачынае задаваць і альтэрнатыўныя пытанні: «Кошык Волін ці Дзімаў?» — «Дзімаў», «Пэндзаль Колеў ці Наташын?» і г. д.

— Лялька Гануля хоча, каб вы адгадалі, з якога гука пачынаецца яе імя: Гггануля. (Паўтарае 2—3 разы, прапануе паўтарыць некальнкім дзецям.) З якога гука пачынаецца слова *Гануля*? (З гука [г].)

— Гануля таксама хоча навучыцца правільна вымаўляць словы з гукам [г]. Давайце ёй дапаможам. Яна ведае слова *магггазін*. А вы якія ведае словы з гукам [г]? (Дзеці называюць словы, час ад часу «лялька» таксама ўключаецца ў гульню — называе чарговае слова. Гануля дапускае і памылкі: вымаўляе слова, у якім няма гука [г]; дзеці з дапамогай выхавальніка заўважаюць гэта.)

Праводзіцца дыдактычная гульня «А што потым?». Дзеці сядзяць паўкругам. Яны па парадку расказваюць аб тым, што робяць у дзіцячым садзе з самай раніцы. Адказвае тое дзіця, якое атрымала

сцяжок. Хто памыліцца, сядае на апошняе крэселка, а астатнія перасоўваюцца. Выхавальнік пачынае:

— Мы прыйшлі ў дзіцячы сад. Пагулялі на пляцоўцы. А што было потым? (Перадае сцяжок першаму дзіцяці.)

Дзіця працягвае:

— Мы рабілі гімнастыку. А потым? (Перадае сцяжок наступнаму дзіцяці.)

У працэсе гульні ўводзяцца словы: снедалі, займаліся, малявалі, вячэралі і інш.

— Вось колькі мы ўсяго рабілі! Колькі ў нас спраў:

У дзетсадаўскіх малят
Спраў цікавых вельмі шмат.

— Давайце развучым гэты вершык.

## *Наш пакой*

П р а г р а м н ы з м е с т. Вучыць называць часткі дома (падлога, столь, сцяна, вокны, дзверы), замацоўваць назвы колераў. Паказаць розніцу паміж словамі — міжмоўнымі амонімамі *дыван* і *диван*. Практыкаваць у правільным вымаўленні гука [р] у словах і сказах; вучыць утвараць множны лік назоўнікаў (акно — вокны), спалучаць прыметнікі (назвы колераў) з назоўнікамі, паказваць адрозненне паміж формамі беларускага слова *дзверы* і рускага *дверь*. Развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей, працягваць вучыць адказваць на пытанні, будаваць сказы.

М а т э р ы я л. Лялькі Алёнка і Янка; цацачны разборны домік або кубікі.

П л а н п р а в я д з е н н я

— Добры дзень, дзеці! Янка і Алёнка просяць паказаць наш групавы пакой.

— Якога колеру ў пакоі сцены? Колькі іх?

— Ці ёсць у сценах вокны?

— Падлічыце, колькі вакон у сцяне. Якой яны формы?

— Што яшчэ ёсць у пакоі?

— Што гэта ляжыць у нас пад нагамі? (Ковер.) На русском языке мы говорым *ковер*, а па-беларуску говорым — *дыван*. Давайце пагуляем. Я спачатку скажу па-руску: «Олечка, посади куклу на диван». (Дзіця саджае ляльку на цацачную канапу.) А зараз я скажу па-беларуску: «Юлечка, пасадзі ляльку на дыван». (Дзіця саджае ляльку на дыван.)

— На чым ляжыць дыван? На беларускай мове *пол* — гэта *падлога*. Дыван ляжыць на падлозе. (Дзеці паўтараюць.)

— А над галавой у нас столь. *Столь* — на рускай мове — *потолок*. Не перабльтайце са сталом. Стол — гэта мэбля. На стол

можна што-небудзь паставіць, палажыць. Што ляжыць зараз на стале? Што яшчэ можна палажыць ці паставіць на стол? (Адказы дзяцей.) А столь — гэта тое, што ў нас над галавой. Паглядзіце на столь. Можна што-небудзь паставіць на столь?

— Адгадайце загадку і знайдзіце ў нашым пакоі адгадку (выхавальнік адчыняе і зачыняе дзверы):

Яны ў кожных сенцах
Назад і ўперад ходзяць.
Адной рукой сустрэнуць,
Другой рукой праводзяць. *(Дзверы.)*

*Ул. Мацвеенка*

— Так. У пакоі ёсць дзверы. На рускай мове мы гаворым *дверь*, а на беларускай — *дзверы.* (Дзеці паўтараюць. Падкрэсліваецца цвёрдае вымаўленне гука [р] у слове *дзверы.*)

— Якога колеру дзверы?

Педагог прапануе дзецям паскакаць па падлозе, падысці да сцяны (акна, дзвярэй), паглядзець на столь і да т. п.

— Янка і Алёнка, ці падабаецца вам наш пакой?

— Раскажыце, а які ў вас пакой? (Лялькі расказваюць.)

— Давайце скажам усе разам (выхавальнік пачынае чытаць чыстагаворку, паказвае на адпаведны прадмет, дашкольнікі заканчваюць чыстагаворку, потым паўтараюць яе):

Ога-ога-ога — чыстая... (падлога).
Оль-оль-оль — высокая... (столь).
Еры-еры-еры — скрыпучыя... (дзверы).
На-на-на — белая... (сцяна).
Но-но-но — светлае акно.

— А зараз уявіце сябе будаўнікамі. Давайце разам пабудуем хатні пакой.

Гульня «Будоўля дома». Дзецям раздаюцца часткі разборнага дома. Педагог пытаецца: «У каго падлога? У каго сцяна?». Дашкольнікі адказваюць: «У мяне падлога», «У мяне сцяна», падыходзяць да стала і з дапамогай выхаваўцеля складваюць хатні пакой.

— Мы пакой у доме пабудавалі. А зараз мы з вамі станем малярамі і будзем наш дом і пакой у доме фарбаваць.

Гульня «Рознакаляровыя дамы». Кожны ўдзельнік называе колер, які яму больш падабаецца. Затым дзеці бяруць у рукі ўяўныя пэндзлі, фарбуюць дамы ў выбраныя колеры і расказваюць: «Я жыву ў чырвоным доме. У мяне чырвоная падлога, чырвоныя сцены і да т. п».

— Янку і Алёнцы вельмі спадабалася, як вы расфарбавалі свае дамы. Малайцы! Да пабачэння! Да сустрэчы!

## *Прадукты харчавання*

П р а г р а м н ы  з м е с т. Пазнаёміць дзяцей з назвамі прадуктаў харчавання (цукар, цукерка, каўбаса, пячэнне, абаранак, пернік, смятана і інш.), увесці прыметнікі (смачны, салодкі). Вучыць карыстацца інтанацыйнымі адценнямі ў мэтах зносін (просьба, пытанне). Фарміраваць навыкі ўтварэння множнага ліку назоўнікаў, актывізаваць веданне розных форм дзеяслова *есці*. Працягваць работу па фарміраванні ўменняў адказваць на пытанні, самастойна будаваць сказы.

М а т э р ы я л. Малюнак з выявай вітрыны прадуктовага магазіна; абсталяванне для гульні ў прадуктовы магазін; малюнкі з выявамі аднаго і некалькіх прадметаў: яблык — яблыкі, пернік — пернікі, цукерка — цукеркі.

П л а н  п р а в я д з е н н я

— Добры дзень, дзеці! Перад вамі вітрына магазіна, дзе прадаюцца розныя прадукты. Як называецца магазін, дзе прадаюцца прадукты? (Гастраном.) Паглядзіце, якія прадукты харчавання (продукты питания) прадаюцца ў гастраноме.

Выхавальнік чытае верш М. Чарняўскага «Гастраном» і паказвае прадукты харчавання на вітрыне:

Запрашае шчыра дом,
Дом пад назвай «Гастраном».
Шакалад, пячэнне, сушкі,
Абаранкі і ватрушкі,
Сыр, цукеркі, хлеб духмяны,
Кошык яблыкаў, бананы —
Бы расквечана вітрына
Велікана магазіна!

— Якія яшчэ прадукты прадаюцца ў магазіне?

(Калі дзеці называюць прадукты харчавання па-руску, выхавальнік услед гаворыць, як называюцца гэтыя прадукты па-беларуску.)

— Што мы кожны дзень купляем у магазіне? (Выказванні дзяцей.) Самае галоўнае, што мы купляем, — гэта хлеб.

На сняданак і ў абед
На стале заўсёды хлеб.
Хлеб — святыня.
Хлеб — багацце.
Хлеб у хаце —
Шчасце ў хаце.

*Л. Пранчак*

— Якая самая галоўная наша яда? (Хлеб.)

Выхавальнік развучвае з дзецьмі першыя два радкі з верша.

— Давайце пагуляем у «Магазін»: я буду прадаўцом, а вы — пакупнікамі. Я буду прадаваць вам прадукты, а вы — выбіраць тое, што вам неабходна, і купляць.

— У магазіне ёсць каўбаса і сасіскі. Пятрок, што ты купіш: каўбасу ці сасіскі? (Я куплю каўбасу.) Калі ласка, падыходзь, бяры.

— У магазіне ёсць пячэнне і батон. Маша, што ты купіш: батон ці пячэнне?

— У магазіне ёсць сухары і хлеб. Любачка, што ты купіш: хлеб ці сухары?

— У магазіне ёсць цукеркі і абаранкі. Кастусёк, што ты купіш: цукеркі ці абаранкі?

— У магазіне ёсць мука і крупы. Таня, што ты купіш: муку ці крупы?

— Ірачка, якія крупы ты купіш: рыс ці грэчку? І г. д.

— Абаранкі і цукеркі вельмі смачныя, усе дзеці іх любяць. А якія цукеркі на смак? Як пра іх можна сказаць? (Салодкія.)

— Якія яшчэ смачныя і салодкія прадукты прадаюцца ў магазіне?

Выхавальнік паказвае цукар, пернікі, пячэнне, называе іх, прапануе паўтарыць гэтыя словы.

— Калі вы прыйдзеце ў магазін купляць прадукты, вам неабходна сказаць, колькі вам трэба купіць: адзін ці многа. Калі вы будзеце купляць адзін яблык, вы скажаце: «Дайце, калі ласка, адзін яблык», а калі многа — «Дайце, калі ласка, яблыкі».

Праводзіцца дыдактычнае практыкаванне «Адзін — многа».

Выхавальнік гаворыць:

— Тут ляжыць адна цукерка, а тут многа. Як сказаць пра іх? (Цукеркі.)

Аналагічна праводзіцца работа над словамі *пернік — пернікі, абаранак — абаранкі, яблык — яблыкі.*

— А зараз пагуляем інакш. Закончыце сказ, які я пачну:

Раніцай Настачка піла салодкі... (чай, кампот, сок).

Мама купіла ў магазіне свежы... (хлеб, батон, абаранак).

Алёша любіць есці салодкія... (цукеркі, пернікі, абаранкі).

— А што вы больш за ўсё любіце есці?

— Віця, што ты любіш есці? Закончы сказ: «Я ем...».

— Дзеці, што Віця есць?

— Запытайцеся адзін у аднаго: «Што ты ясі?». (Адно дзіця запытваецца ў другога, а тое адказвае: «Я ем...».)

— Давайце пагуляем. Уявіце, што вы зараз ясце ў сталоўцы ці ў кафэ. Я паспрабую адгадаць, што кожны з вас есць. Я буду пытацца, напрыклад: «Таня, ты ясі кашу?». Калі Таня задумала кашу, то яна адкажа: «Так, я ем кашу». Калі не — скажа: «Не, я не ем кашу, я ем суп».

— Усе мамы хочуць, каб іх дзеткі добра елі і раслі здаровымі. Калі сын ці дачка ядуць мала, дрэнна, мамы вельмі перажываюць, дакараюць: «Чаму ясі так мала?».

Выхавальнік развучвае з дзецьмі верш-скорагаворку М. Янчанкі:

Валерка
Над талеркай,
Матуля
Над Валеркам.
Стаяла, дакарала:
— Чаму ясі так мала?

— А чым любіць ласавацца наш Буслік? Што б вы яму купілі пачаставацца, калі б запрасілі да сябе ў госці?

— Малайцы! Да пабачэння! Да сустрэчы!

## *Адзенне і абутак*

Праграмны змест. Вучыць называць прадметы адзення і абутку (паліто, футравая шапка, футравы каўнер, рукавічкі, хустка, шалік, сукенка, шкарпэткі, боцікі), увесці абагульняючае слова *адзенне*, дзеяслоў *надзяваць*. Адпрацоўваць вымаўленне гука [ч] у словах і сказах. Звярнуць увагу на асаблівасці ўтварэння некаторых склонавых форм назоўнікаў (дапамагчы Алёнцы), практыкаваць ва ўжыванні прыназоўнікаў. Працягваць фарміраваць уменне адказваць на пытанні. Развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей на беларускай мове.

Матэрыял. Лялькі Янка і Алёнка; малюнак з выявай вітрыны магазіна дзіцячага адзення; цацачнае адзенне.

План правядзення

— Добры дзень, дзеці! Да нас зноў прыйшлі Янка і Алёнка. Яны гавораць, што ўчора хадзілі ў магазін дзіцячага адзення «Апранайка». Там вельмі шмат рознага адзення для маленькіх дзетак. Яны нават сфатаграфавалі вітрыну гэтага магазіна. (Выхавальнік паказвае малюнак.)

— Давайце паглядзім разам, якое адзенне ў вітрыне магазіна «Апранайка».

Дзеці разглядваюць вітрыну, выхавальнік называе прадметы адзення па-беларуску.

— Давайце разам з вамі раскажам чыстагаворку.

Выхавальнік паказвае па адной рэчы цацачнага адзення, пачынае чытаць радкі чыстагаворкі, а дзеці іх заканчваюць:

Енка-енка-енка — сіняя (сукенка).
То-то-то — купілі (паліто).

Нер-нер-нер — футравы (каўнер).
Устка-устка-устка — зялёная (хустка).
Эткі-эткі-эткі — белыя (шкарпэткі).

— Як усе гэтыя рэчы назваць адным словам? (Адзенне.)

— Скажыце, якое адзенне ў магазіне вы выбралі б для Янкі? (Штаны, кашулю, трусы, майку, шкарпэткі, туфлі, куртку, кепку.)

— Якое адзенне вы выбралі б для Алёнкі? (Сукенку, спадніцу, кофту, хустачку, шкарпэткі.)

Выхавальнік развучвае з дзецьмі радкі з вершыка С. Сокалава-Воюша:

Апранулі нашы дзеткі
Шапкі, шалікі, шкарпэткі.

— Магазін «Апранайка» — гэта магазін дзіцячага адзення. Чаму гэтае адзенне называецца дзіцячым? (Выказванні дзяцей.) Так, дзеці носяць дзіцячае адзенне. Але вельмі цікава прымяраць што-небудзь дарослае! Хто з вас прымяраў татава ці маміна адзенне? Асабліва дзяўчынкі любяць памоднічаць, ці не так?

Выхавальнік чытае малым жартоўны верш Л. Мароза «Маленькая модніца»:

Матуліну сукенку прымярае,
Завязвае блішчасты паясок...
І ў брацiка пытаецца малая:
— Ну як мне гэта мода, Петрусёк?

— Чаму Леў Мароз назваў дзяўчынку маленькай модніцай?

— Маленькая лялька Алёнка апранаецца пасля сну, давайце дапаможам ёй. Якое адзенне трэба Алёнцы, каб апрануцца? (Дзеці з дапамогай выхавальніка называюць прадметы адзення.)

— Адзеньце ляльку і раскажыце, што вы робіце.

Дзеці па адным апранаюць ляльку і тлумачаць свае дзеянні: «Я надзяваю на Алёнку белыя шкарпэткі» і да т. п. У заключэнні педагог пытаецца: «Каму мы дапамаглі апрануцца пасля сну?». (Алёнцы.)

— Малайцы, дзеткі! Лялька Алёнка ўдзячна вам за тое, што вы дапамаглі ёй апрануцца.

— Выберыце і назавіце летняе (зімовае, дэмісезоннае) адзенне для Алёнкі.

— Выберыце і назавіце летняе (зімовае, дэмісезоннае адзенне) для Янкі.

— Вызначыце, дзе абутак для Янкі, а дзе для Алёнкі, і назавіце яго.

— Падуў моцны вецер і сарваў некаторыя рэчы з людзей. Паглядзіце на малюнак і скажыце, якія прадметы адзення згублены і хто іх згубіў.

— Янка і Алёнка вам вельмі ўдзячны за тое, што вы расказалі ім пра іх адзенне.

— Усяго вам добрага. Да пабачэння.

## *Свойскія жывёлы*

Праграмны змест. Вучыць называць свойскіх жывёл (трус, карова, авечка, свіння, сабака, конь, кошка), увесці абагульняючы выраз *свойскія жывёлы.* Звярнуць увагу на цвёрдае вымаўленне гука [р], практыкаваць у вымаўленні гэтага гука ў словах і сказах. Фарміраваць уменне суадносіць з малюнкамі назвы жывёл і іх дзіцянят. Развіваць камунікатыўныя ўменні дашкольнікаў.

Матэрыял. Малюнак «Вясковы двор» з выявай свойскіх жывёл: козы, каровы, коні, свінні, авечкі, сабака; мяч; прадметныя малюнкі з выявамі свойскіх жывёл.

### План правядзення

— Добры дзень, дзеці! Хто з вас бываў у вёсцы? Да каго вы ездзілі? Раскажыце, якія жывёлы ёсць у вашых бабулі з дзядулям?

— Паглядзіце на малюнак. Што тут намалявана?

— Назавіце жывёл, якія тут намаляваны (козы, каровы, коні, свінні, авечкі, сабака). А хто гэта з доўгімі вушкамі? (Некаторыя дзеці выказваюць меркаванне, што гэта зайчык.) Не, гэта не зайчык. Але вельмі падобны (похожий) на зайчыка. У гэтай жывёлы вельмі смешная назва. Гэта трус (кролик). Як называецца гэтая жывёла? Давайце разам прагаворым: «У маленькіх трусікаў маленькія вусікі».

— Дзе жывуць гэтыя жывёлы? Хто іх даглядае? Навошта яны патрэбны людзям? (Выказванні дзяцей.)

— Гэтыя жывёлы прыносяць людзям карысць (пользу). Кожная жывёла патрэбна чалавеку ў гаспадарцы. Для чаго трымаюць карову? А навошта патрэбны конь? Для чаго ў двары жыве сабака? Навошта ў хаце кот? І г. д.

— Усе гэтыя жывёлы жывуць побач з чалавекам, таму што яны яму дапамагаюць, прыносяць карысць. Чалавек зрабіў жывёл сваімі, таму яны называюцца свойскімі жывёламі. Якіх свойскіх жывёл вы ведаеце? А якіх дзікіх жывёл вы ведаеце?

— Адгадайце загадкі пра свойскіх жывёл і знайдзіце іх на малюнку:

Пасярод двара стаіць гара, спераду вілы, ззаду мятла. (Карова.)

— На што падобныя рогі і хвост каровы?

Двое глядзяць, двое слухаюць, чатыры скачуць, семсот свішчуць. (Конь.)

Не згубіла, а ўсё шукае, не хворая, а ўсё стогне. (Свіння.)

Па гарам, па далам ходзіць шуба ды кафтан. (Авечка.)

З людзьмі сябруе, хату вартуе, жыве пад ганкам, хвост абаранкам. (Сабака.)

Маленькія лапкі, на лапках драпкі, ціхенька ступае, мышак пужае. (Кот.)

— Як называюцца ўсе гэтыя жывёлы? (Свойскія.)

— Давайце пагуляем. Я буду называць розных жывёл. Калі я назаву свойскую жывёлу, той, каму я кіну мячык, скажа: «Свойскі», а калі дзікую — скажа: «Дзікі». Давайце паспрабуем: «Заяц (кідае мяч дзіцяці), што ты адкажаш: свойскі ці дзікі?». (Дзікі.) Сабака — свойскі, кот — свойскі, ліса — дзікая і г. д.

— А зараз я буду расказваць вершык пра некаторых свойскіх жывёл, а вы — мне дапамагаць:

— Скажы, Янучок,
Як коцік мяўкае?
— ... (Мяў-мяў-мяў),
Прашу цішэй.
Трэба мне
Лавіць мышэй.
Вось то так, вось то гэтак,
Гэтак коцік мяўкае.
— Скажы, Янучок,
Як сабачка гаўкае?
— ... (Гаў-гаў-гаў,
Гаў-гаў-гаў),
Злодзей красці
Спрабаваў.
Вось то так, вось то гэтак,
Так сабачка гаўкае.
— Скажы, Янучок,
Як кароўка рыкае?
— ... (Му-му-му,
Му-му-му),
Малако аддаць каму?
Вось то так, вось то гэтак,
Так кароўка рыкае.

*К. Якубенас*

Верш чытаецца два разы.

— Як падаюць голас свойскія жывёлы? Кот што робіць? (Мяўкае: мяў-мяў), сабака... (брэша: гаў-гаў), карова... (мыкае: му-му), авечка... (бляе: бе-бе), конь... (іржэ: і-го-го) і г. д., акрамя свінні.

Гульня «Чый голас?». Выхавальнік раздае дзецям малюнкі з выявамі свойскіх жывёл (апрача свінні). Дзіця, якое атрымае малюнак, падае голас, «як яго жывёла», астатнія адгадваюць, хто гэта.

У рэшцэ рэшт выхавальнік паказвае малюнак свінні і гаворыць, што яна таксама хоча пагуляць, але не ведае, як ёй падаць голас. Ці ведаюць дзеці, як падае голас свіння? Дзеці звычайна адказваюць: «Хрю-хрю». Але выхавальнік кажа, што гэта на рускай мове свіння «хрюкает», а на беларускай мове свіння рохкае: «Рох-рох-рох».

Выхавальнік чытае верш І. Махоніна «Парсючок», паказваючы адпаведны сюжэтны малюнак і прыцягваючы дзяцей да прагаворвання гукапераймальнага слова *рох-рох-рох*:

Парсючок салодка спаў,
Рох-рох-рох.
Ён прачнуўся і сказаў:
Рох-рох-рох.
Мне не трэба на зарадку,
Рох-рох-рох.
Лепш пайду парыю градку,
Рох-рох-рох.
Мыцца не цярплю я дужа,
Рох-рох-рох.
Лепш паплёхаюся ў лужы,
Рох-рох-рох.
Няхай дзеці пазайздросцяць,
Рох-рох-рох.
Запрашаю ўсіх у госці,
Рох-рох-рох.

Практыкаванне «Хто за каго большы».

— Я пачну сказ, а вы паглядзіце на малюнак і закончыце яго: «Конь большы за... (карову). Сабака большы за... (труса). Кот меншы за... (сабаку). Каза меншая за... (карову)». І г. д.

— Добра, вы шмат ведаеце пра жывёл. Малайцы, дзеці.

## *Звяры нашых лясоў*

Праграмны змест. Вучыць называць жывёл (вавёрка, вожык, воўк, бабёр, мядзведзь), увесці абагульняючае слова *жывёлы*. Замацоўваць назвы колераў. Вучыць вымаўляць гук [ў] у словах і сказах. Фарміраваць уменне суадносіць з малюнкамі назвы жывёл і іх дзіцянят. Развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей.

Матэрыял. Цацка «Буслік»; малюнкі з выявамі жывёл і іх дзіцянят; лялька «Калабок».

План правядзення

— Добры дзень, дзеці! Буслік хоча пазнаёміць вас са сваімі сябрамі і добрымі суседзямі, жыхарамі нашых лясоў. Вы іх таксама ведаеце.

— Буслік будзе вам іх паказваць на малюнках і называць, а вы будзеце гаварыць, так ён іх называе ці не. (Праводзіцца гульня «Так ці не?».)

— А цяпер, калі ласка, адгадайце загадкі, знайдзіце на малюнках адгадкі і назавіце іх:

Ён прысмакаў з'еў нямала,
А калі харчоў не стала,
Лапу смокчучы, заснуў.
Ледзьве не праспаў вясну. (Мядзведзь.)

У ваду нырае смела.
Хатку ён будуе ўмела.
Пад вадой і на вадзе
Будаўніцтва ён вядзе. (Бабёр.)

*В. Жуковіч*

Гэта ж трэба!
На сцяжынцы —
Шпількі вострыя
І шыльцы! (Вожык.)

*Р. Ігнаценка*

Што за гаспадынька
Ходзіць каля гаю,
Залатую футру
Па зямлі цягае? (Ліса.)

*А. Клышка*

Калі гэта ў яблыкаў
Выраслі ножкі?
Яблыкі бегаюць
Каля дарожкі!

— Не, яны не маюць
Ножак, —
Адказаў
Маленькі... (вожык).

*М. Мрэўлішвілі*

Назбірала арэхаў
Пяць мяхоў і паўмеха.
Насушыла грыбоў
Сто дванаццаць карабоў.
Нацягала шышак горку
Працавітая... (вавёрка).

*В. Зуёнак*

Хоць таўстун занадта ласы,
На зіму сабе прыпасы
Па крупіцы ён збірае,
Бо заўжды наедак мае:
Спаць кладзецца, скіне тапак
І паціху смокча лапу,
А вясна дыхне ледзь-ледзь —
Прачынаецца... (мядзведзь).

*В. Зуёнак*

— Як назваць адным словам усіх тых, пра каго адгадалі загадкі? (Звяры.) Дзе жывуць звяры? (У лесе.)

— Паглядзіце, хто гэта завітаў да нас у госці па лясной сцяжынцы? (Калабок.) Вы памятаеце, з якімі звярамі ён сустракаўся ў лесе? Назавіце гэтых звяроў.

— Калабок хоча з вамі пагуляць. Ён раскажа вам пра свае прыгоды, а вы ўважліва слухайце і адказвайце на яго пытанні.

Выхавальнік трымае ў руках ляльку «Калабок» і задае пытанні, а дзеці адказваюць:

Я з вакна на сцежку — скок?
Скок.
Я ад бабы і дзеда ўцёк?
Уцёк.
Зайцу па вуху надаваў?
Надаваў.
І ваўка я напужаў?
Напужаў.
І лісіцу абхітрыў?
Абхітрыў.

І мядзведзя абваліў?
Абваліў.
Значыць, дужы я і смелы?
А ўжо ж!
Значыць кемлівы і ўмелы?
А што ж!
Я ж і спрытны? Хіба не?
Вельмі спрытны!
Залічыце ж вы мяне
У турысты.

*Т. Каламіец*

— Залічым Калабка ў турысты? (Так, залічым.)

— У звяроў ёсць маленькія дзеці-звераняты. Яны хочуць хадзіць у дзіцячы садзік.

Чытае верш С. Валодзькі, паказваючы адпаведныя малюнкі і падкрэсліваючы голасам суфікс *-ня*:

Вось бы разам сабраць
Усіх зверанят:
Зубраня,
Зебраня,
Ласяня,
Лісяня,
Ваўчаня, бабраня —
Быў бы і ў заасадзе
Дзіцячы сад.

— Якія звераняты хочуць хадзіць у дзіцячы сад? Давайце разам раскажам чыстагаворку «Хто ў каго?» (паказвае малюнкі з выявамі дзіцянят звяроў):

Ня-ня-ня — у лісы... (лісяня),
Ня-ня-ня — у зайчыхі... (зайчаня),
Ня-ня-ня — у мядзведзіцы... (медзведзяня),
Ня-ня-ня — у ваўчыцы... (ваўчаня),
Ня-ня-ня — у вавёркі... (ваверчаня).

— Буслік прапануе нам пагуляць у гульню «Звер ці рыба?». Адкажыце, гэта звер ці рыба?

Воўк — звер, а карась?
Карась — рыба, а ліса?
Ліса — звер, а мядзведзь?
Мядзведзь — звер, а шчупак?
Шчупак — рыба, а сом?
Сом — рыба, а заяц? і г. д.

— А зараз давайце пафантазіруем. Уявіце сабе, што вы трапілі ў казачную краіну. Там усе жывёлы незвычайнага колеру. Назавіце, якога колеру жывёлы ў гэтай краіне.

Дзеці фантазіруюць, прыдумваюць, якога колеру жывёлы ў гэтай краіне (чырвоны слон, зялёны сабака і г. д.).

— Паглядзіце на малюнак.

— Жывёлы вырашылі паспаборнічаць. Назавіце, якія жывёлы выйшлі на старт. (Вожык, заяц, ліса, вуж.)

— Як вы думаеце, хто з іх будзе пераможцам, хто будзе на другім месцы, хто на трэцім? Вазьміце ліст паперы і намалюйце гэтых жывёл на п'едэстале ў адпаведнасці з тымі месцамі, якія яны занялі.

## *Птушкі*

Праграмны змест. Вучыць называць птушак (качка, певень, курыца, гуска, індык), увесці абагульняючы выраз *хатнія птушкі*. Практыкаваць у вымаўленні гука [ц] у словах і сказах. Фарміраваць у дзяцей уменне суадносіць з малюнкамі назвы птушак і іх дзіцянят, звярнуць увагу на род некаторых назоўнікаў (гусь). Працягваць развіваць камунікатыўныя ўменні ў дзяцей.

Матэрыял. Малюнак «Птушыная ферма»; мячык.

План правядзення

— Добры дзень, дзеці!

— Паглядзіце на малюнак. Гэта — птушыная ферма. Хто ведае, што гэта за птушка? (Петушок.) А па-беларуску гэтая птушка называецца *певень*. Як крычыць певень? (Ку-ка-рэ-ку!) Так, певень спявае: «Ку-ка-рэ-ку!». Паглядзіце, які певень прыгожы, якое ў яго рознакаляровае пер'е.

Выхавальнік развучвае з дзецьмі вершык:

Па двары
У яркім пер'і
Ходзіць важна
Певень-спевень.

*К. Камейша*

— Чаму птушку назвалі певень-спевень? (Таму што яна ўмее спяваць.) Хто бачыў пеўніка ў вёсцы? Ён спявае рана-рана і будзіць людзей.

— Адгадайце загадкі і знайдзіце на малюнку адгадкі:

Адмысловы гадзіннік,
Крылаты будзільнік.

Адметны ў спеве.
А хто гэта?.. (Певень.)

*М. Бусько*

— Чаму пеўня назвалі будзільнікам?

— Што ў пеўня на галаве? (Грабеньчык.) Вось яшчэ адна загадка пра пеўня: «Ходзіць цар па гародзе, носіць два бліны ў барадзе, а трэці на галаве». З чым параўноўваецца грабеньчык і бародка пеўніка?

— А як называецца гэтая птушка? (Курица.) Так, гэта курыца. (Падкрэслівае голасам цвёрдае вымаўленне гука [р].) Як сказаць правільна па-беларуску? (Курыца.) Паглядзіце на курыцу. Якая яна? Курыца пакрыта пер'ем. Яе адзенне — многа-многа маленькіх пёрак. Паслухайце загадку пра курыцу: «Семсот сарочак, семсот намётак, дуне вецер — адкрывае да голага цела, хоць і адзенне цэла». Што на галаве ў курыцы? (Маленькі грабеньчык.) У яе маленькі грабеньчык, нібы чубчык, таму курыцу яшчэ называюць чубаткай. Як крычыць курыца? (Куд-куда!)

Круглыя, як мячыкі,
Быццам адуванчыкі,
На двары ля хаты
Ходзяць... (кураняты).

*А. Лойка*

— Знойдзе пеўнік зярнятка і кліча курыцу і куранят, каб яны пачаставаліся. Вось як пра гэта расказваецца ў вершы:

Певень клікае Чубатку:
— Ко-ко-ко! — знайшоў зярнятка.
На, нясі яго дахаты,
Пачастуй там куранятак.

*С. Бестава*

— Хто такія кураняткі? (Дзеткі курыцы.) Давайце разам раскажам гэты вершык:

Певень клікае... (Чубатку):
— Ко-ко-ко! — знайшоў... (зярнятка).
На, нясі яго... (дахаты),
Пачастуй там... (куранятак).

— Вось яшчэ адна птушка на птушынай ферме. Хто гэта? (Гусь.) Можна сказаць *гусь*, а можна — *гуска*. Якая гуска? Паслухайце загадку пра яе: «Белая, як снег, цэлы дзень у рэчцы купаецца, на бераг выйдзе — сухая». Хто гэта? (Гусь, гуска.)

— З чым параўноўваецца гуска ў загадцы? Як крычыць гусь? (Га-га-га.)*

— Назавіце ўсіх птушак, якіх вы бачыце ў двары птушынай фермы. (Гусі, пеўні, куры.) А гэта хто? Гэтая птушка — качка. (Дзеці паўтараюць.) А гэтая птушка — індык. (Дзеці паўтараюць.)

— Паслухайце, што аднойчы адбылося, калі курыца знесла яйка:

— Куд-кудак!.. Куд-кудак!
Яйка знесла я з кулак, —
Узняла чубатка крык.
— Так, так, так!.. — сказаў індык.
І карова кажа:
— М-му!
А каму?
І авечка,
Як пачула пра яечка,
Забляяла:
— Ме-ме-ме!
Можа, мне?
Гусак крыкнуў:
— Ого-го!
Захацела ты чаго!
Тут якраз прыйшла Марынка,
Невялічкая дзяўчынка:
— Яйка курачка знясла!
І сабе яго ўзяла.

*І. Шуцько*

— Як крычала курыца-чубатка, калі знесла яйка? (Яна кудахтала.)

— Што сказаў індык? (І г. д. па змесце верша.)

Гульня «Хто як крычыць?». Праводзіцца з мячом. Выхавальнік называе птушку і кідае мяч дзіцяці, тое дае адказ і кідае мяч назад:

— Гусь... (гагоча).

— Качка... (кракоча).

— Пеўнік... (кукарэкае).

— Курыца... (кудахча).

— Індык... (балбоча).

— Давайце разам пагуляем з вамі ў гульню «Гусі-гусі». Вы будзеце «гусямі», а я вашай «гаспадыняй». Вы пасвіцеся тут «на траўцы» (паказвае месца), а ў тым куце будзе «логава ваўка».

---

* Увага! У беларускай мове гукаперайманне «га-га-га», як і ў рускай, вымаўляецца з выбухным гукам [г].

З дапамогай лічылкі дзеці выбіраюць «ваўка». «Гусі» знаходзяцца ў адным канцы пакоя, «гаспадыня» — у другім, «воўк» — убаку.

Паміж «гаспадыняй» і «гусямі» адбываецца такая размова:

— Гусі-гусі!
— Га-га-га!
— Есці хочаце?
— Ага!
— Дык ляціце...
— Го-го-го,
Воўк зубаты за гарой.
— Гусі-гусі!
— Го-го-го...
— Вы не бойцеся яго!
Першай гуска паляцела,
Потым — гусяняты.
Ї гусак падняўся смела,
Следам — воўк зубаты.

«Гусі» бягуць да «гаспадыні», а «воўк» стараецца злавіць каго-небудзь. Злавіўшы «гуся», ён вядзе яго ў сваё «логава». Калі «воўк» нікога не зловіць, «гаспадыня» гаворыць:

Скочыў шэры на дарогу,
Толькі не злавіў нікога!

— Знайдзіце на малюнку хатніх птушак. А зараз паглядзіце ўважліва на курачку. Пакажыце, дзе дзюба, дзе грабеньчык, дзе крыло, дзе хвост, дзе лапкі. Чым пакрыта курачка? (Пёркамі.)

— Вазьміце ліст паперы з відарысам курачкі і намалюйце пер'е.

— Давайце разам з вамі раскажам вершык пра курачку:

А курачка-рабушэчка!
Пазыч жа мне грабушэчка!
Гута-та, гута-та!
Не пазычу, не прадам!
Прыйдзі ка мне — дарма дам!
Гута-та! Гута-та!

— Якія казкі вы ведаеце пра хатніх птушак?

— Паглядзіце на малюнкі (пеўнік, курачка, гусак, індык, куранятка). Пазнайце, з якіх яны казак. Аб чым гаворыцца ў гэтых казках?

— Малайцы! Вы добра ведаеце казкі пра птушак. Да скорай сустрэчы.

## *Летні дзень*

П р а г р а м н ы з м е с т. Вучыць дашкольнікаў называць птушак: вераб'і, галубы, сарокі, вароны і г. д. Развіваць навыкі разумення мовы, камунікатыўныя ўменні дзяцей на беларускай мове. Звяртаць увагу на моўныя асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай.

М а т э р ы я л. Заняткі праводзяцца на пляцоўцы дашкольнай установы.

П л а н п р а в я д з е н н я

— Якая зараз пара года? Давайце разам раскажам пра летні дзень. Ярка свеціць... (сонейка). Яшчэ як можна сказаць пра сённяшні дзень?

— Сёння цёпла ці холадна? Так, сёння... (цёплы дзень).

— Якія прыкметы лета вы можаце назваць? Што бывае летам? (Трава зялёная, на дрэвах зялёнае лісце, цвітуць кветкі, спяваюць птушкі.)

— Якіх птушак вы ведаеце? (Галубы, вераб'і, сарокі, вароны...)

— Давайце пагуляем у гульню «Птушкі». Уявіце сябе рознымі птушкамі. Назавіце, якія вы птушкі. («Я шэранькі верабей», «Я сарока-белабока», «Я вялікая варона» і да т. п.). Па камандзе «птушкі, ляціце» «птушкі» разлятаюцца. Па сігналу або свістку «птушкі» спыняюцца і расказваюць, дзе яны знаходзяцца: «Я на дрэве», «Я ў лесе», «Я ў гняздзе».

— Паглядзіце на воблачкі на небе і раскажыце, на што яны падобныя.

— Паслухайце верш Г. Каржанеўскай «На што падобна аблачынка?»:

На што падобна аблачынка?
— На параходзік.
— На дзяўчынку.
— На куст чаромхі.
— На слана.
— Падобна на крыло яна!
Сказаў адзін:
— На апельсін.
Сказаў другі:
— На берагі.
...Пакуль кампанія гадала,
Хмурынка белая... растала.

— А зараз паслухайце ўрывак з вершыка А. Астрэйкі «Дзень добры, лета!»:

Дзень добры, лес!
Дзень добры, поле!
Зямная слаўная краса!
Дзень добры лісціку на голлі,
Табе, празрыстая раса!

— Давайце вывучым гэтае прывітанне лету разам з вамі на памяць.

# *Фантазёры*
## *(6-ты год жыцця)*

### *Восень*

Праграмны змест. На аснове ўяўленняў і ведаў замацоўваць і ўдакладняць слоўнік дзяцей. Актывізаваць словы, якія абазначаюць якасці (прыгожы, дрэнны, добры). Увесці ў слоўнік дзяцей словы *надвор'е* і *блакітны*. Вучыць правільна вымаўляць гук [дж] у словах і фразах. Звярнуць увагу на фармуліроўку пытання з дапамогай часціцы *ці*. Надалей вучыць слухаць і разумець мову выхавальніка, адказваць на пытанні па змесце карціны. Вучыць апісваць карціну.

Матэрыял. Карціна І. Левітана «Залатая восень».

План правядзення

— Давайце падыдзем да акна і палюбуемся акружаючым наваколлем.

— Якая зараз пара года? Сёння яснае, сонечнае надвор'е. А якое яшчэ бывае надвор'е восенню? (Яснае, сонечнае, добрае, цёплае, хмарнае, дажджлівае, дрэннае, халоднае.)

— Хто з вас ведае вершы пра восень? Раскажыце, калі ласка.

— Залатая восень — гэта якая восень? Сонечная, а яшчэ... працягвайце, калі ласка.

— Пра якую пару года гэтая загадка?

Шумяць па-асенняму
Пушча і бор;
На дрэвах, кустах —
Залацісты ўбор.

— Залацісты ўбор — гэта які ўбор, як ён выглядае?

— Паглядзіце на карціну І. Левітана «Залатая восень».

— Якая пара года намалявана на карціне? Як вы здагадаліся?

— Якімі колерамі карыстаўся мастак, каб перадаць прыкметы восені?

— Якога колеру неба на карціне? (Блакітнае.)

— Ці падабаецца вам карціна? Чым?

— Як бы вы назвалі гэтую карціну? («Залатая восень», «Восень», «Асенні дзень».)

— Ці падобны гэты асенні дзень на сённяшні? Чым? (Або: чаму не падобны?)

— Давайце скажам разам:

Джы-джы-джы — ідуць дажджы.
Джу-джу-джу — няма дажджу.

— А зараз кожны па-асобку.

— Паслухайце, як я раскажу пра тое, што намалявана на гэтай карціне.

— На карціне І. Левітана намаляваны асенні дзень. Гэта пачатак восені. Яшчэ горача свеціць сонца. Па чыстым блакітным і празрыстым небе плывуць лёгкія воблачкі. Лес стаіць у прыгожым залатым убранні. Толькі елкі не мяняюць свайго колеру, яны заўсёды зялёныя. Прыемна прайсціся па такім лесе і паслухаць, як шамаціць асенняе лісце.

— Паспрабуйце самі скласці апавяданне па карціне. Не забывайце пра словы *залатая восень*, *блакітнае неба*, *ясны дзень*.

## *Ветлівыя словы* (2)

Праграмны змест. Працягваць знаёміць дзяцей з формамі ветлівых зваротаў па-беларуску. Адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [ч], [г], [р]. Вучыць адказваць на пытанні, будаваць сказы з ужываннем ветлівых зваротаў, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей на беларускай мове.

Матэрыял. Лялькі Янка, Алёнка, Буслік.

План правядзення

Выхавальнік вітаецца з дзецьмі:

— Добры дзець, дзеткі! (Добры дзень!) Вось мы з вамі павіталіся. Якія словы мы сказалі? Гэта вельмі важныя словы ветлівасці. Іх яшчэ называюць ветлівымі словамі. Давайце ўспомнім іншыя словы ветлівасці. Якімі словамі мы вітаемся? Я вам буду чытаць верш Васіля Віткі «Чатыры пажаданні», а вы будзеце падказваць мне словы ветлівасці:

Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей.

Раніцай:
— Добрага... (ранку)
І апаўдня:
— Добры... (дзень)!
Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць...:
(— Добры вечар!)
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям...:
(— Дабранач)!

— Якія ж чатыры пажаданні выказаў паэт? (Верш чытаецца яшчэ раз, дзеці падказваюць словы ветлівасці.)

— Добрай раніцы, добры дзень, добры вечар, дабранач — гэтыя словы мы гаворым, калі вітаемся. Але ёсць і іншыя словы ветлівасці. Успомнім іх. Паслухайце верш пра такія словы:

Век дзяліся тым, што маеш, —
Хлебам-соллю,
Казкай-краскай.
Ну а ў госці запрашаеш,
Гавары ўсім:
— *Калі ласка!*
А з табой як тое будзе,
То за шчодры знак усякі
Пакланіся добрым людзям
І скажы ім шчыра:
— *Дзякуй!*

*У. Паўлаў*

— Якое слова нам дапамагае запрасіць сваіх сяброў у госці? (Калі ласка.)

— Якое яшчэ ветлівае слова вы пачулі ў вершы? (Дзякуй.) Можна сказаць *дзякуй*, а можна — *вялікі дзякуй*, *шчыра ўдзячны*.

Дзеці паўтараюць прапанаваныя словы.

— Каго вы хацелі б запрасіць да сябе ў госці?

Выхавальнік наладжвае разыгрыванне дыялогаў паміж дзецьмі: «Каця, калі ласка, прыходзь да мяне ў госці. — Дзякуй, я абавязкова прыйду». І да т. п.

— На жаль, не ўсе дзеці помняць пра ветлівыя словы. Вось паслухайце пра аднаго такога хлопчыка:

Баба ўнука частавала,
Сыр і мёд — усё давала.

Той, наеўшыся прысмакаў,
Не сказаў за гэта... (дзякуй).
Ён забыўся, бабчын госць,
Што такое слова ёсць.

*М. Валько*

— Пра якое слова забыўся бабчын унук? (Дзякуй.) Такіх дзяцей называюць няветлівымі.

— Бывае, што чалавек незнарок (нечаянно) штурхне каго-небудзь, наступіць на нагу ці што-небудзь разаб'е. Скажыце, калі ласка, ці ведаеце вы, якое слова трэба гаварыць, каб памірыцца? (Выказванні дзяцей.)

— Гэта слова *даруй*. Скажыце гучна гэтае слова. (Даруй!)

— Калі я (Янка) пакрыўджу каго-небудзь, я папрашу ў яго прабачэння, скажу: «Даруй мне».

— А я (Алёнка) нікога не буду крыўдзіць.

— А я (Буслік) таксама.

— Так, дзеці, нездарма ў народзе кажуць: «Ласкавае слова, што дзень ясны».

— Дык чаму ж трэба гаварыць ветлівыя словы? Чаму з ветлівымі словамі лёгка жыць? (Выказванні дзяцей.)

— Паглядзіце, калі ласка, на малюнак. Як вы думаеце, якія ветлівыя словы гавораць дзеці на малюнку?

(Два хлопчыкі ідуць насустрач адзін аднаму і працягваюць рукі, каб прывітацца — «добры дзень»; дзве дзяўчынкі малююць, адна працягвае другой аловак — «вазьмі, калі ласка»; дзяўчынка ўпала з веласіпеда, хлопчык дапамагае ёй падняцца, дзяўчынка гаворыць — «дзякуй»; дзяўчынка выглядае з акна аўтобуса і махае хустачкай матулі і тату — «да пабачэння».)

— Малайцы! Вы ўсё правільна расказалі, добра ведаеце ветлівыя словы.

— А зараз паслухайце, як гаворыцца пра ветлівыя словы яшчэ ў адным вершыку:

Калі я знаёмых
Ці родных спаткаю,
Вітаюся,
Зняўшы ўбор з галавы,
І ветла кажу,
Калі што ў іх спытаю:
— Вялікі вам дзякуй!
Прабачце. А вы?

*А. Клышка*

Дзеці адказваюць на пытанне ў вершы.

— Як вы вітаецеся з роднымі і знаёмымі? Якія словы вы кажаце?

— Якія словы мы з вамі гаварылі, калі развітваліся з персанажамі «Калыханкі»? Так, «Да пабачэння!»

— А я развітаюся так: «Да спаткання» (гаворыць Янка).

— А я — «Да сустрэчы» (гаворыць Алёнка).

— А я скажу проста: «Бывайце» і памахаю сваім крылом (гаворыць Буслік).

— Ёсць яшчэ такія развітальныя словы, як *дабранач*, *усяго добрага*. Калі мы гаворым *дабранач*? Запомніце: *дабранач* гаворым нанач.

— Развітайцеся кожны з нашымі гасцямі. Можна развітацца так, як я, як Янка, як Алёнка, як Буслік, ці іншымі развітальнымі словамі.

У далейшым выхавальнік паведамляе дзецям, што ветлівыя словы называюць яшчэ чароўнымі (волшебными) словамі. Яны, нібы чароўныя ключы, адмыкаюць сэрцы людзей:

Сэрца, нібы дзверы,
Можна адмыкаць,
Трэба толькі ведаць,
Дзе ключы шукаць.

«Калі ласка», «Дзякуй» —
Вось яны, ключы!
Ты іх, калі ласка,
Добра завучы.

*А. Стодарт*

— Давайце ж будзем помніць ветлівыя словы — чароўныя ключыкі ад сэрцаў, будзем даражыць імі.

## *Мы прымаем гасцей*

П р а г р а м н ы з м е с т. Вучыць называць прадметы посуду (кубак, шклянка, сподак, талерка, лыжка, відэлец і інш.); увесці абагульняючае слова *посуд*, дзеяслоў *есці*; замацоўваць назвы прадуктаў харчавання. Адпрацоўваць вымаўленне гукаў [г], [р] у словах і сказах. Практыкаваць у правільным выкарыстанні загаднага ладу дзеясловаў (сядай, пі, еш, паспрабуй). Фарміраваць уменне адказваць на пытанні, самастойна будаваць сказы.

М а т э р ы я л. Малюнак «Дзеці частуюцца».

### План правядзення

— Добры дзень, дзеці! Сёння да нас на абед прыйдуць Янка і Алёнка са сваімі сябрамі. Для таго каб наладзіць частаванне, трэба падрыхтавацца.

— Паглядзіце на малюнак. Ці ёсць на стале што-небудзь лішняе?

— Назавіце посуд, які стаіць на стале.

— Чым будзем частаваць сваіх гасцей? (Дзеці называюць розныя стравы.)

Выхавальнік развучвае з дзецьмі вершык А. Масткоўскага:

Піражочкі, піражкі!
Мае кожны два ражкі.
Адкушу адзін ражок —
Надта смачны... (піражок)!

— Чым бы вы яшчэ хацелі пачаставаць лялек?

— Што будуць рабіць лялькі за сталом? (Есці.)

— Як вы запросіце гасцей за стол? (Сядай, Янка, калі ласка, частуйся! Сядай, Алёнка, калі ласка, частуйся!)

— Што вы гасцям пажадаеце? (Смачна есці, дарагія госці! Калі ласка! Алесь, пі каву. Каця, бяры цукеркі. Таня, паспрабуй пірог і да т. п.)

— Давайце разам раскажам чыстагаворку.

Га-га-га — хачу пірага,
Гі-гі-гі — смачныя пірагі,
Гу-гу-гу — з'есці не магу,
Гоў-гоў-гоў — няма пірагоў.

— Паслухайце вершык пра тое, як дзяўчынка частавала Мішку, які прыйшоў да яе ў госці:

Пірагом з гарбатай
Мішку частавала,
Сподачкі і шклянкі
Са стала прыбрала,
Вымыла талерку,
Кубачак і лыжку
І закалыхала
Зморанага Мішку.

*Т. Кляшторная*

— Пачастуем і мы нашых гасцей гарбатай. Калі ласка, Таня, прынясі сподачкі. Паўлік, прынясі кубачкі. Міхасік, прынясі лыжкі. Якія лыжкі ты прынясеш — вялікія ці маленькія?

— Што яшчэ трэба паставіць на стол?

— Для сурвэтак неабходна... сурвэтніца. Прынясі яе, Юрасік.

— Для цукру неабходна... цукарніца. Прынясі яе, Кацярынка.

— Для пячэння, пернікаў, абаранкаў трэба паставіць... талерку. Якая талерка неабходна — глыбокая ці мелкая? Так, прынясі яе, калі ласка, Святланка. Давайце пакладзем сюды пернікі, абаранкі, пячэнне.

— Малайцы, дзеці. А зараз давайце запросім нашых гасцей за стол.

— Частуйцеся, калі ласка, дарагія госці. Смачна есці!

## *У пакоі*

П р а г р а м н ы з м е с т. Замацоўваць ужыванне назваў частак дома, пазнаёміць са словамі *кватэра, пакой, канапа, крэсла, шафа, дыван, лямпа, ложак*, абагульняючым словам *мэбля*; увесці прыназоўнік *каля*, дзеяслоў *падабаецца*. Практыкаваць у правільным вымаўленні гука [ў] у словах і сказах, ва ўжыванні некаторых склонавых форм назоўнікаў (у кватэры, у пакоі, дапамагчы Янку). Працягваць работу па фарміраванні ўмення адказваць на пытанні, самастойна будаваць сказы, развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей.

М а т э р ы я л. Лялькі Янка і Алёнка.

П л а н п р а в я д з е н н я

— Добры дзень, дзеці!

— Добры дзень, Янка!

— Янка, раскажы, калі ласка, яшчэ раз пра свой пакой.

— Дзеці, Янка сказаў, што ў яго пакоі няма ніякай мэблі. Трэба дапамагчы хлопчыку Янку абсталяваць пакой.

— Давайце наведаем з вамі «Магазін мэблі» і купім Янку мэблю для абсталявання пакою.

Гульня «Магазін мэблі». Выхавальнік пералічвае, што прадаецца ў магазіне, для чаго патрэбна тая ці іншая рэч: вось канапа, на ёй можна адпачываць — пасядзець або паляжаць. А гэта ложак, на ім спяць. У магазіне прадаецца і шафа, у шафу вешаюць адзенне. Дашкольнікі паўтараюць новыя словы. Затым педагог прапануе купіць для Янкі мэблю. Малыя па чарзе падыходзяць да лялькі, гутараць з ёю: «Дзень добры, Янка. Я хачу купіць табе стол. Табе падабаецца гэты стол?». Лялька (педагог) адказвае, часам пытаецца, навошта яму тая ці іншая рэч, затым дзякуе за пакупку. У канцы гульні адзначаецца, што дзеці купілі мэблю, яны дапамаглі Янку. Уся мэбля стаіць на стале.

— Малайцы, дзеці! Купілі Янку мэблю ў кватэру. Давайце разам раскажам Янку чыстагаворку:

Іў-іў-іў — канапу купіў,
Еў-еў-еў — на крэсле пасядзеў,
Аў-аў-аў — на ложку паляжаў,
Іў-іў-іў — шафу адчыніў.

Лялька з дапамогай выхавальніка выконвае дзеянні, што адпавядаюць зместу чыстагаворак.

— А зараз давайце абсталюем кватэру мэбляй.

Выхавальнік ставіць шырму, якая ўяўляе сабой сцены пакоя, і разам з дзецьмі абстаўляе пакой мэбляй і ўпрыгожвае яго.

— Што паставім каля акна? (Каля акна паставім канапу.) Дзе будзе стаяць ложак? (Ложак паставім каля сцяны.)

Затым педагог прапануе ўпрыгожыць пакой: на сцяну павесіць карціну, на стол паставіць прыгожую лямпу, на падлогу пакласці дыван. Дашкольнікі паўтараюць новыя словы, выконваючы прапановы выхавацеля. Зноў звяртаецца ўвага на слова *дыван*, яно параўноўваецца з рускім *диван* (словы гучаць аднолькава, але абазначаюць розныя рэчы).

— Малайцы, дзеці! Дзякуй вам за дапамогу!

## *Прафесія і праца*

Праграмны змест. Вучыць дзяцей называць прафесіі (выхавальнік, кухар, настаўнік, урач, будаўнік, швачка і інш.), прылады працы (прас, указка, патэльня і інш); увесці дзеясловы *вучыць, выхоўваць, лячыць, будаваць, варыць, прасаваць* і інш. Замацоўваць вымаўленне гука [ц] у словах і фразах; вучыць фармуляваць пытанні з дапамогай часціцы *ці*. Развіваць камунікатыўныя ўменні.

Матэрыял. Крэйда, указка, іголка, цацкі: прас, апалонік, тэрмометр, кельма і інш.

План правядзення

Выхавальнік чытае верш Э. Агняцвет «Хто пачынае дзень?»:

Раней за ўсіх устаў шафёр,
пабег да гаража.
Не любіць соннай цішыні
гарачая душа!
Устане рана хлебапёк,
адчуе смачны пах,
І пойдзе жытні свежы хлеб
з румянцам на шчаках.
Па-свойму радуе маляр
прыроду і людзей:

прыносіць колеры вясны
вясёлы чарадзей.
Спытайся ў сонца і зямлі,
спытайся ў чыстых рэк:
— Хто пачынае новы дзень?
— Рабочы чалавек.

— Пра каго гаворыцца ў вершы? (Пра шафёра, хлебапёка, маляра — рабочых людзей.) Калі вы вырасцеце, кім бы вы хацелі працаваць? (Адказы дзяцей.) Чаму табе падабаецца гэтая прафесія? Што ты будзеш рабіць?

(У ходзе гутаркі па меры магчымасці ўводзяцца беларускія назвы прафесій: кухар, цырульнік, настаўнік, выхавальнік, будаўнік, каваль і інш.)

Дыдактычнае практыкаванне «Каму гэта патрэбна?». Выхавальнік паказвае розныя прылады працы (цацкі), называе іх пабеларуску, пытаецца, каму яны патрэбны. Частка новых слоў уводзіцца з дапамогай вершаў і загадак:

Калі прас шыпіць, як змей,
Прасаваць тады не смей.
Ён гарачы!
Асцярожна!
Прапаліць ім дзірку можна.

*А. Платнер*

— Чым з гэтых прадметаў можна прапаліць дзірку, калі ён гарачы? (Дзеці паказваюць на прас. Выхавальнік можа паўтарыць верш.) Каму патрэбны прас? (Швачцы.)

Маю тонкі, востры нос,
Каляровы доўгі хвост.
Спрытна я ў руках мільгаю,
Носікам свой шлях шукаю.

*Ул. Мацвеенка*

Дзеці паказваюць іголку, расказваюць, хто працуе з іголкай (швачка).

— Як шые швачка іголкай? (Дзеці імітуюць адпаведныя рухі.)

Паказаўшы апалонік, які належыць кухару, выхавальнік чытае вершык:

Кухар цэлы дзень клапоча —
Накарміць нас смачна хоча.
Ён, напэўна, на абед
Смажыць тысячу катлет.

Гульня «Адгадай, хто я?». Адзін з удзельнікаў задумвае прафесію, астатнія стараюцца яе адгадаць з дапамогай пытанняў: ты будуеш дамы? У цябе ёсць іголка (указка, крэйда, паласатая палка і да т. п.)?

— Усё, што ў нас ёсць: адзенне, абутак, сшыткі, алоўкі, мэбля, посуд, — усё-ўсё зроблена людзьмі розных прафесій, іх працавітымі рукамі. Падкажыце мне слова ў вершы:

Будуюць дамы, засяваюць палі.
У сінім прасторы вядуць караблі.
З цымбал высякаюць іскрыстыя гукі,
І шыюць,
І мыюць
Нястомныя... (рукі).

*М. Гелер*

— Як вы думаеце, чаму гавораць: «Праца — усяму аснова»?

## *Зіма*

П р а г р а м н ы  з м е с т. Павялічыць слоўнікавы запас дзяцей словамі і словазлучэннямі: *лютая, марозная зіма, снег бліскучы, іскрысты, завіруха, мароз траскучы, моцны, сцюжа.* Замацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [ц], [дз]. Вучыць выразна вымаўляць ненаціскныя галосныя (*сняжынкі*). Практыкаваць у правільным выкарыстанні прыслоўя *ўзімку.* Вучыць складаць сказы па змесце карціны. Надалей развіваць уменне адказваць на пытанні выхавальніка разгорнутымі адказамі. Вучыць складаць кароткі расказ на тэму «Зіма».

М а т э р ы я л. Карцінкі з выявамі зімовых пейзажаў і сюжэтаў: на палях ляжыць снег; дзеці катаюцца на каньках; на дрэве сядзяць снегіры; Дзед Мароз нясе падарункі дзецям і да т. п.; фішкі для ўзнагароджвання.

П л а н  п р а в я д з е н н я

— Адгайце, пра якую пару года гэтая загадка:

Белым пухам замяло
І палеткі, і сяло.
Мост праз рэчку хутка ляжа.
А што гэта, хто адкажа?

*Ул. Мацвеенка*

— Ці здагадаліся вы, што гэта за белы пух, якім усё замяло?

— Снег лёгкі, нібы белы пух. Якімі яшчэ словамі можна сказаць пра снег?

— Снег лёгкі, пушысты... (белы, мяккі, іскрысты, бліскучы, рыпучы, срэбны).

— Які мост хутка ляжа праз рэчку?

— Лёд падобны на шкло. Якімі яшчэ словамі можна сказаць пра лёд? (Коўзкі, тонкі, тоўсты, блакітны.)

— Якой парой года снег замятае зямлю, дахі дамоў, палі, рэкі пакрываюцца ільдом? (Узімку.)

— Зімой холадна. Як яшчэ можна сказаць пра зімовае надвор'е?

— Яно халоднае... (марознае, снежнае, бывае сонечнае).

— Вось вы сказалі: «марознае надвор'е». А якімі словамі можна расказаць пра мароз? Мароз моцны... (траскучы, люты, пякучы).

— Узімку амаль заўсёды моцны вецер, ён круціць снег у паветры, завывае за вокнамі. Як называюць такі вецер? (Завіруха, завея.)

— Паспрабуйце знайсці адгадкі на зімовыя загадкі:

Вось вам, дзеці, верш зімовы.
Падкажыце ў вершы словы.
Зімой даліны і сцяжынкі
Пакрылі белыя... (сняжынкі).
Як шэры воўк, завыла глуха
У полі злая... (завіруха).
Сядзяць без ежы ў зіму птушкі.
Сябры, зрабіце ім... (кармушкі).

*М. Гарнак*

— Скажыце, якім птушкам трэба рабіць кармушкі. (Снегірам, сініцам, вераб'ям.)

— Пра прыгажуню зіму можна расказваць і на рускай, і на беларускай мовах. Давайце паспрабуем расказаць пра зіму на дзвюх мовах, пагуляем у перакладчыкаў:

лютая зіма — злая зима;
бліскучы снег — блестящий снег;
узімку стаяць траскучыя маразы — зимой стоят трескучие морозы;
голубой лед — блакітны лёд;
река покрылась льдом — рака пакрылася ільдом;
на дворе стужа — на двары сцюжа;
падают красивые снежинки — падаюць прыгожыя сняжынкі.

— Пра зіму складзена шмат прыгожых твораў, нават скорагаворкі ёсць. Паслухайце скорагаворку. Давайце раскажам яе ўсе разам:

У зімовы дзень на сонцы
Птах шчабеча на сасонцы:
— Цік-цік-цік! Цок-цок-цок!
Можа вас мароз прыпёк?

— Паглядзіце на карцінкі і раскажыце пра тое, што вы ўбачылі.

(На палях ляжыць снег.) Які ён? (Белы, бліскучы, месцамі блакітны, срабрысты.)

(Дзеці катаюцца на каньках.) Які лёд? (Коўзкі, празрысты, тоўсты.)

(На дрэве сядзяць снегіры.) Якія яны? (З ружовымі грудкамі, падобныя на «ружовыя яблыкі».)

(Дзед Мароз нясе падарункі дзецям.) Які падарунак ты хацеў бы атрымаць ад Дзядулі Мароза?

— Паглядзіце яшчэ раз на гэтыя малюнкі. Складзіце апавяданне пра зіму.

## *Наша краіна*

Праграмны змест. Замацоўваць у маўленні дзяцей словы *Беларусь, беларус, беларусачка, краіна*; адпрацоўваць уменне правільна вымаўляць гукі [р] і [ч]. Вучыць утвараць назвы жыхароў розных гарадоў і вёсак. Фарміраваць уменне адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

Матэрыял. Лялькі Янка і Алёнка.

План правядзення

— Добры дзень, сябры! Сёння да нас у госці прыйшлі хлопчык Янка і дзяўчынка Алёнка. Яны цікавяцца, у якой краіне вы жывяце? Давайце нагадаем.

— Як называецца наша краіна? (Беларусь.) Так, Беларусь — наша Радзіма, наша родная краіна.

— Ці любіце вы сваю Радзіму?

— Народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка напісаў верш пра нашу Радзіму Беларусь:

Змалку звалі цябе
Мы сваёю радзімаю.
Беларусь, Беларусь,
Як ты сэрцу любімая.

— Давайце паўторым усе разам:

Беларусь, Беларусь,
Як ты сэрцу любімая.

— Мы ўсе любім сваю родную краіну Беларусь! Яна для нас самая прыгожая!

— Калі хлопчык нарадзіўся на Беларусі — ён... (беларус).

— Калі дзяўчынка нарадзілася на Беларусі, то яна... (беларусачка).

— На якой мове размаўляюць беларусы? (На рускай і беларускай.)

Француз па-французску,
Па-польску паляк
Гавораць з маленства...
А ты гаворыш як?

— Мы гаворым па-руску і вучымся размаўляць па-беларуску. Родная мова беларусаў — беларуская.

— Паслухайце яшчэ верш, у якім гаворыцца пра любоў да сваёй Радзімы Беларусі і да беларускай мовы, беларускай гаворкі:

Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць,
Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць.

Бо радзімая старонка
Над усё мне прыгажэй,
Беларуская гаворка
Над усё мне даражэй.

*А. Мілюць*

— Давайце разам з вамі гучна скажам гэтыя радкі:

Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць,
Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць.

— У народзе кажуць: «Дарагая тая хатка, дзе нарадзіла мяне матка». І сапраўды, «дзе маці нарадзіла, там і радзіма». А наша Радзіма... (Беларусь).

— Прыгожую назву мае наша Радзіма, светлае ў яе імя — Белая Русь, Беларусь. Гавораць, што такую назву яна атрымала ад мноства снегу, што выпадае зімой у нашай старонцы; ад перавагі белага колеру ў адзенні насельніцтва; ад таго, што людзі, якія тут жывуць, светлавокія, статныя, прыгожыя.

— Шмат на Беларусі гарадоў, мястэчак, вёсак. Які галоўны горад у Беларусі, сталіца нашай краіны? (Мінск.) У якім горадзе (вёсцы) мы жывём? Якія яшчэ беларускія гарады ці вёскі вы ведаеце? Дзе жывуць вашыя дзядулі і бабулі? Дзе жывуць вашыя сябры?

— Як называюцца тыя людзі, што жывуць у горадзе? (Гараджане.) А тыя, што жывуць у вёсцы? (Вяскоўцы.)

— У Мінску жывуць мінчане, у Салігорску салігорцы, а ў Тураве?

— У Тураве — тураўцы, а ў Віцебску? І г. д.

— Беларускі паэт Васіль Вітка напісаў жартоўны верш пра жыхароў розных гарадоў. Верш называецца «Дзе хто які?».

Выхавальнік чытае верш, падкрэсліваючы голасам назвы гарадоў і характарыстыку іх жыхароў (Нясвіжы — хіжы, ушацкія — хвацкія і г. д.):

У Нясвіжы людзі хіжы,
Салому таўкуць — блінцы пякуць,
Сала смажаць — блінцы мажуць.
Ушацкія — людзі хвацкія,
У Ваўкавыску — ваўкалацкія,
Слуцакі — мацакі,
Гарадзенцы — умельцы,
Навагрудцы — суседзям litарадцы,
Пінчукі з мінчукамі —
Сваякі з вякоў вякамі.
Давыд-гарадзецкія —
Майстры маладзецкія.

— І Янка, і Алёнка вельмі задаволены тым, што вы ведаеце, як завецца наша краіна, хто жыве ў нашай краіне, якая мова ў нас родная.

— Алёнка нават вершык пра сябе хоча расказаць. Верш называецца «Беларусь — мая Радзіма»:

Цік-так, ходзікі,
Мне чатыры годзікі.
Чуб ільняны — светла-русы,
Тата з мамай — беларусы.

Я — дзяўчынка-беларуска
З васільковымі вачыма,
Хоць малая,
Але знаю:
Беларусь —
Мая Радзіма.

*Л. Пранчак*

— Назавіце сваю Радзіму.
— Назавіце, у якім горадзе (вёсцы) вы жывяце.
— Як завуцца жыхары вашага горада (вёскі)?
— Малайцы, дзеці! Давайце развітаемся з Янкам і Алёнкай.

## *Лічбы і формы*

Праграмны змест. Увесці назвы лічбаў ад 1 да 5, назвы лічбаў — колькасных і парадкавых; дзеяслоў *лічыць*, займеннік *колькі*; замацоўваць уменне называць знаёмыя прадметы і геаметрычныя формы. Практыкаваць у вымаўленні гукаў [р], [ч], [ц] у словах і сказах. Вучыць утвараць формы роднага склону назоўнікаў, спалучаць лічэбнікі з назоўнікамі; практыкаваць ва ўжыванні загаднага ладу дзеяслова. Развіваць камунікатыўныя ўменні ў дашкольнікаў.

Матэрыял. Лялькі Янка і Алёнка; па пяць рэчаў: лыжкі, цукеркі, мячыкі ці інш.

План правядзення

— Добры дзень, дзеці!

— Янка і Алёнка прынеслі да нас розныя рэчы. Яны просяць, каб вы іх назвалі, расказалі пра іх і дапамаглі палічыць.

— Што гэта? (Выхавальнік паказвае лыжкі. Дзеці гавораць, што адна лыжка вялікая, другая маленькая, гэтая лыжка жоўтая, а тая — чырвоная і г. д.) Давайце палічым лыжкі: адна, дзве, тры, чатыры, пяць. Усяго пяць лыжак.

— Што гэта ў Янкі? Цукеркі! Давайце палічым цукеркі.

— Што прынесла Алёнка? (Мячыкі.) Палічым, колькі мячыкаў у Алёнкі.

— Лічыць вы навучыліся, а цяпер давайце навучымся даваць розныя каманды. Перш з дапамогай лічылкі выбярэм пяць дзяцей: «Адзін, два, тры, чатыры, пяць, пойдзеш зараз ты гуляць».

— Тым, каго мы выбралі, трэба пералічыцца. Гэта робіцца так: першы, другі, трэці, чацвёрты, пяты.

— Яшчэ раз назавіце свой парадкавы нумар, каб яго запомнілі астатнія дзеці.

— Зараз вы можаце даваць гэтым дзецям любыя каманды. Напрыклад: другі, паскачы; чацвёрты, пакружыся і г. д.

— А цяпер давайце памяняемся месцамі. Пералічыцеся. Давайце адзін аднаму каманды.

— Паглядзіце ўважліва, якія геаметрычныя фігуры ляжаць на стале? (Дзеці называюць: квадрат, трохвугольнік, кола, авал.)

— Пагуляем з вамі ў гульню «Чаго не стала?». Заплюшчыце вочы, а цяпер адкрыйце іх і скажыце, якой фігуры не стала.

— Станьце ў кола. Вазьміце ў рукі сваю любімую цацку.

— Міхасік, што ў цябе?

— Карына, што ў цябе?

— А зараз пад лічэнне «адзін, два, тры, чатыры, пяць» перададзім цацкі адзін аднаму па крузе.

— Міхасік, якая цацка зараз у цябе?

Гульня паўтараецца некалькі разоў.

— Малайцы, дзеці! Янка і Алёнка задаволены тым, як вы лічыце і ведаеце розныя геаметрычныя фігуры.

## *Вясна*

Праграмны змест. Увесці назвы пералётных птушак (бусел, шпак, чапля, грак), слова *пралеска*; актывізаваць словы, якія абазначаюць якасць (прыгожы, добры, дрэнны, пяшчотны). Замацоўваць вымаўленне гукаў [ч], [г], [ў] у словах і фразах; практыкаваць у вымаўленні ненаціскных галосных (*вясна*). Вучыць ужываць прыназоўнік *у* (*у лес*, *у парк*); звярнуць увагу на асаблівасць некаторых склонавых форм назоўнікаў (рака — на рэчцы, лес — у лесе). Развіваць уменне адказваць на пытанні, заахвочваць самастойныя выказванні дзяцей.

Матэрыял. Карціна І. Левітана «Вясна. Вялікая вада» або іншая на дадзеную тэму; прадметныя малюнкі (жаваранак, грак, жураўель, чапля, шпак, бусел і іншыя пералётныя птушкі, пралеска); галінкі вярбы з коцікамі.

План правядзення

— Якая зараз пара года?

— Вясной прыпякае сонейка, тае снег. Чым вясна адрозніваецца ад зімы?

— Паслухайце, як апісвае раннюю вясну Якуб Колас:

Сонца грэе, прыпякае,
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.
Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія гудуць,
Шпак на дубе расспяваўся,
Жураўлі ўжо лятуць.

— Якія прыкметы вясны называюцца ў вершы?

— Чаму лёд на рэчцы затрашчаў?

— Надвор'е вясною цёплае, сонечнае. Працягвайце расказваць далей, якое яшчэ бывае надвор'е вясною? (Яснае, добрае, дажджлівае, халоднае, дрэннае.)

— Першымі да нас вяртаюцца вясной жаваранкі. Якія яшчэ птушкі прылятаюць з надыходам вясны? (Можна яшчэ раз прачытаць другую частку верша, паказаць адпаведныя малюнкі.)

— Як выглядаюць галінкі дрэў вясной?

— З якога дрэва стаяць галінкі на стале ў вазе? Так, гэта галінка вярбы з коцікамі.

Ручайкі вясновыя
Ціха зазвінелі,
Коцікі пуховыя
На вярбу прыселі.

Разявілі роцікі,
Не ідуць у дом!
Поіць сонца коцікаў
Цёплым малачком.

*Я. Крупенька*

— Чаму мы каташкі вярбы называем коцікамі? (Таму што яны пушыстыя, мяккія, як кацяняты.)

— Коцікі распускаюцца ранняй вясной. А якія вясновыя кветкі ў лесе расцвітаюць першымі? (Паказваецца малюнак з выявай пралескі.) Якая пралеска? (Сіняя, прыгожая, маленькая, пяшчотная.)

— Паглядзіце на гэтую карціну. (Карціна І. Левітана «Вясна. Вялікая вада».)

— Давайце разам раскажам пра тое, што адлюстравана на карціне? Я буду пачынаць сказы, а вы заканчвайце:

Пасля доўгай зімы настала... (вясна). На палях яшчэ ляжыць... (снег), але ўжо адчуваецца надыход... (вясны). Неба стала... (блакітным, празрыстым). Паявіліся першыя веснавыя... (ручаі), снег пацямнеў. На рэчцы растаў... (лёд). Цяплей прыгравае... (сонца), ажылі бярозкі. Спяваюць веснавую песню... (птушкі).

(Затым свае расказы складаюць два-тры дашкольнікі.)

— Усе мы любім добрае надвор'е. Добрае надвор'е — гэта калі... (свеціць сонейка, цёпла, яснае блакітнае неба). Дрэннае надвор'е — гэта калі... (пахмурна, холадна, сонейка схавалася за хмаркамі, ідзе дождж).

— Давайце пагуляем у «Добрае надвор'е». Я буду дыктарам (потым роль дыктара выконваюць дзеці). Паслухайце, якое сёння надвор'е: «Сёння цёпла. Дажджу няма. Свеціць сонца». Вы раскажыце, куды вы пойдзеце такім надвор'ем? (У парк, лес, на рэчку.) Назавіце не толькі месца сваёй прагулкі, але і раскажыце, чым там можна будзе займацца. (У лесе мы пагуляем. У парку мы паслухаем спевы птушак.)

## *Абазначэнне часу*

П р а г р а м н ы з м е с т. Увесці ў слоўнік дзяцей словы, якія абазначаюць часавыя адносіны, розныя часткі сутак: *было, ёсць, будзе, зараз, раніца, дзень, вечар, сёння, учора, заўтра; гадзіннік.* Замацоўваць вымаўленне гукаў [дз] (дзень), [ч] (вечар), [ў] (заўтра); вучыць вымаўляць словы з падоўжанымі зычнымі (сёння, нараджэнне, варэнне, пячэнне). Фарміраваць навыкі дыялагічнага маўлення, развіваць уменне складаць кароткія расказы з асабістага вопыту.

М а т э р ы я л. Цацка «Буслік»; малюнкі з добра знаёмымі эпізодамі з рознага часу сутак; фішкі для гульні «Калі гэта бывае?»; гадзіннік (будзільнік); малюнак з выявай дня нараджэння ў вароны.

П л а н п р а в я д з е н н я

— Добры дзень, дзеці! Да нас завітаў добры знаёмы. Хто гэта? (Буслік.) Буслік просіць разабрацца, калі было тое, пра што расказваецца ў вершыках. Я буду расказваць кароткія вершыкі, а вы паспрабуйце адказаць, гэта было, адбываецца зараз або будзе потым (выхавальнік чытае ўрыўкі толькі з добра знаёмых дзецям вершаў):

Кую, кую ножку,
*Паеду* ў дарожку.

— Калі я гавару «*паеду* ў дарожку», гэта ўжо было ці будзе потым? (Будзе потым.)

*Захварэў* парсючок,
*Лёг* на левы бачок. (Гэта ўжо было.)

Коцік басаногі
Па сняжку *гуляў*. (Гэта таксама было.)

Ой, *баліць* у мяне зуб,
Бо не *хоча* есці суп. (Гэта зараз.)

*Накармлю*, бабуля,
Я рагулю-малакулю. (Гэта будзе.)

Цераз плот, цераз плот
Жук *ляціць* у гарод. (Гэта зараз.)

*Прыляталі* птушкі
Узімку да кармушкі. (Гэта было.)

Мы *вядзём* паіць на рэчку
Кучаравую авечку. (Гэта зараз.)

Ладачкі-ладкі
Мы *палолі* градкі,

Мы *палолі* самі
Сваімі рукамі. (Гэта было.)

Па цвічку тук-ток
*Б'е* жалезны малаток. (Гэта зараз.)

— Коцік, коцік,
Дзе ж ты быў?
— Я ўсю ноч
Мышэй *лавіў*. (Гэта было.)

Каб вы зналі, як я рад:
Мне *купілі* самакат. (Гэта было.)

— Дзеці, вам цікава даведацца, чым учора займаўся Буслік? Зараз ён вам раскажа. Учора раніцай Буслік гуляў у парку, затым чытаў цікавую казку «Муха-пяюха». Сёння і мы яе пачытаем. Увечары Буслік пойдзе ў кіно, будзе глядзець цікавы фільм «Прыгоды Бураціна». Заўтра Буслік будзе рыхтавацца да заняткаў маляваннем: ён купіць альбом і алоўкі. Каб усё паспець, Буслік часта глядзіць на гадзіннік (паказвае).

— У вас дома ёсць гадзіннікі? (Канешне, ёсць.) Як яны цікаюць? (Цік-так.) Вашы мамы і таты заўсёды глядзяць на гадзіннік, каб не спазніцца на работу, глядзяць, калі вас пара ўжо весці ў дзіцячы сад, калі вам класціся спаць. Дзе ў вас стаяць ці вісяць гадзіннікі? (Адказы дзяцей.) Ёсць ручныя гадзіннікі, дарослыя носяць іх на руцэ, каб заўсёды ведаць, якая гадзіна (паказвае свой гадзіннік).

— Я таксама часта гляджу на гадзіннік. Ён нібы прыспешвае, пытаецца, ці так я раблю. Як у вершы, які я вам зараз прачытаю:

Вісіць гадзіннік на сцяне,
Ён не гадзіны лічыць, не.
Ён ціха цікае:
— Цік-так, —
нібы пытаецца:
— Ці так?
Я сёння рана-рана ўстаў,
Старанна ложак свой заслаў,
Памыўся я, наеўся ўсмак...
А ён — свае:
— Ці так? Ці так?
Прыбраць у хаце дапамог
І смецце вынес за парог...
А ён не выцярпіць ніяк —
Пытае зноў:
— Ці так? Ці так?

— Дзеці, Буслік просіць вас расказаць пра добрыя справы, якія вы зрабілі ўчора ці сёння, або будзеце рабіць сёння ці заўтра. Хто з вас дапамог маме, хто паліў кветкі, хто зрабіў які-небудзь падарунак ці што-небудзь яшчэ вельмі добрае? Каця, раскажы, што ты добрага зрабіла. (Адказ дзіцяці.) (Выхавальнік удакладняе, калі дзіця рабіла сваю добрую справу: раніцай, удзень ці ўвечары і г. д.)

— Буслік хоча з вамі пагуляць у гульню «Калі гэта бывае?». Ён прынёс вам карцінкі. (Раздае малюнкі дзецям.) Паглядзіце на іх. У каго намалявана тое, што бывае раніцай? Падыміце малюнкі. Таня, чаму ты думаеш, што гэта бывае раніцай? (Зарадку робяць раніцай.) Маладзец, гэта сапраўды бывае раніцай. (Дае дзіцяці фішку ружовага колеру.) Толя, а ты чаму лічыш, што гэта бывае раніцай? І г. д. («Буслік» далей называе «дзень», «вечар», «ноч», дзеці падымаюць свае малюнкі, тлумачаць свае меркаванні. За правільныя адказы малыя атрымліваюць фішкі рознага колеру: блакітную — дзень, шэрую — вечар, чорную — ноч.)

— Што намалявана на гэтай карцінцы? (Выказванні дзяцей.) Гэта дзень нараджэння вароны. Яна збіраецца частаваць гасцей. Чым яна будзе частаваць сваіх гасцей? (Выказванні дзяцей.) Як вы думаеце, што ў гэтай вазачцы? (Варэнне.) Што ляжыць на талерцы? (Пячэнне.)

У вароны сёння
дзень нараджэння.
На стале ў вароны
чай і варэнне.

*А. Бадак*

Выхавальнік расказвае вершык яшчэ раз, прапануючы дзецям дагаворваць апошнія словы ў радках.

## *Кветкі*

П р а г р а м н ы з м е с т. Вучыць дзяцей называць кветкі (дзьмухавец, пралеска, валошка, рамонак, званочак), увесці абагульняючае слова *кветкі*. Вучыць вымаўляць гукі [ц], [шч], [дз] у словах і сказах. Фарміраваць уменне суадносіць з малюнкамі назвы кветак. Развіваць камунікатыўныя ўменні дзяцей.

М а т э р ы я л. Прадметныя малюнкі з выявамі кветак; цацка «Буслік».

П л а н п р а в я д з е н н я

— Добры дзень, дзеці!

— Сёння да нас у госці зноў завітаў Буслік. Ён гуляў на лузе, бачыў там розныя прыгожыя кветкі і хоча вам пра гэта расказаць:

Выйдзі ў луг ці ў поле
Летам —
Колькі там
Дзівосных кветак!
Жоўтыя,
Ліловыя,
Белыя,
Ружовыя,
Сінія,
Як вочкі,
Васількі,
Званочкі.

*К. Цвірка*

Падчас расказвання верша выхавальнік паказвае малюнкі з кветкамі, пасля чаго зазначае:

— Гэта ўсё кветкі. (Дзеці паўтараюць.) Якія гэта кветкі? Буслік просіць вас дапамагчы яму правільна назваць кветкі. Каб дапамагчы Бусліку, я буду расказваць вершы пра кветкі:

Будзіць жаўранак ад сну
Поле, пералескі.
Сустракаць бягуць вясну
Сінія... *пралескі.*

*С. Кацуба*

— Гэтая кветка называецца пралеска. Яна раней усіх з'яўляецца ўвесну. (Дзеці паўтараюць назву кветкі.)

— Вось знаёмая вам кветачка. Іх вельмі шмат расце ў полі.

На лузе браточкі
З аднае сямейкі:
Залатыя вочкі,
Беленькія вейкі.

— Што гэта за кветка? (Дзеці адказваюць, што гэта *ромашка.*) А па-беларуску гэтая кветка называецца *рамонак.* (Дзеці паўтараюць назву.)

Аналагічна праводзіцца далейшая работа над назвамі кветак.

Стаіць,
Выглядаючы з жыта,
Як зорачка-знічка
Здалёк,
Што упала
Іскрынкай
З блакіту,

Палеткаў краса —
...*Васілёк.*

*А. Дзяружынскі*

*Адуванчык,*
*Дзьмухавец,*
Кучаравы маладзец.
Стаў ён
Пры дарожцы
На даўжэзнай ножцы.

Ля дарогі шарык белы.
Вецер б'е, а шарык цэлы.
А як дзьмухнуць хлапчукі —
Пух ляціць ва ўсе бакі.

*В. Жуковіч*

(Выхавальнік нагадвае, як дзеці дзьмулі на адуванчыкі падчас прагулкі.)

Каралевай называюць,
Вершы пра яе складаюць,
Прыгожая дужа
Кветка... *ружа.*

*І. Собач*

Бяры ружу асцярожна:
Пакалоць балюча можа!

*В. Даніленка*

З ціхай раніцы да ночкі,
Кожным днём вясны і лета
Звоняць кветачкі-*званочкі* —
Званары між яркіх кветак.
Звоняць кветачкі ў полі,
Звонка звоняць ля дарожкі,
І, здаецца, як ніколі
Просяцца ў скокі ножкі.

*С. Шушкевіч*

Гадаюць на лузе
Вясёлыя дзеткі,
Якія ў Анюты
Любімыя кветкі:
— Пралескі!
— Фіялкі!
— Рамонкі!

— Званочкі!
А мама смяецца:
— *Анюціны вочкі*!

*В. Гардзей*

— Зараз праверым, ці правільна Буслік запомніў назвы кветак.

Праводзіцца гульня на пасіўнае распазнаванне слова «Так ці не».

— Буслік будзе вам называць кветкі і паказваць іх на малюнках, а вы будзеце яму адказваць, так ён назваў ці не.

Буслік называе: «Дзьмухавец». Дзеці: «Так» ці «Не» і г. д.

Буслік дзякуе дзецям: «Малайцы, дзеткі, дапамаглі мне распазнаць кветкі!»

— Паглядзіце ўважліва на гэтыя кветкі. Дзе яны растуць? Дзе расце пралеска? (У лесе.) А дзе растуць званочкі? (На лузе.) (І г. д. наконт палявых і лясных кветак.)

— Паглядзіце на іншыя кветкі. (На малюнку выявы вяргіні, півоні, ружы, цюльпана.) Дзе яны растуць? (У парку, каля хаты на клумбах.) Так, іх спецыяльна саджаюць, каб было прыгожа. За гэтымі кветкамі трэба даглядаць. Што трэба рабіць, каб яны добра раслі? (Палоць, паліваць.)

— Паслухайце верш, як Алёнка даглядае за кветкамі:

Ля Алёнчынае хаты
Чмель лятае зухаваты,
І пчала ўвесь дзень гудзе.
Яны чуюць пах мядовы,
Што з Алёнчынага кветніка
Ідзе.
Працавала
Тут Алёнчына рыдлёўка:
Грунт капала.

Тут грабелькамі Алёнка
Грунт пушыла,
Кветкі роўнымі радкамі
Пасадзіла,

Між радкамі прапалола
Ўсю макрыцу,
І прыносіла з калодзежа
Вадзіцу

У маленечкім вядры,
І расаду палівала
На зары.

Тут Алёнка клопат мела
Немалы,
І ў Алёнкі падняліся, расцвілі
Каля хаты, ля паркана,
Гладыёлусы,
Цюльпаны...

Чмель лятае зухаваты,
Матылёчак і пчала.
Мёд збіраюць
І спяваюць.
Во Алёнка што зрабіла,
Што змагла!

*П. Дарошка*

— Паглядзіце на карцінку.

— Якая там намалявана кветка?

— Гэта рамонак. Давайце я вам раскажу пра рамонак. Ён прыгожы. У яго белыя пялёсткі, жоўтая сярэдзінка, зялёныя лісцікі і зялёная сцяблінка. Рамонак расце на лузе ці на палянцы ў лесе.

— А зараз, калі ласка, раскажыце вы Бусліку пра рамонак ці пра іншую кветку, якая вам спадабалася.

— Малайцы, дзеці.

— Калі ласка, адкажыце на пытанні-загадкі:

Чырвоны, пахучы. Гэта мак або ружа?

Блакітная, пяшчотная. Гэта званочак або пралеска?

Жоўтыя, невялікія. Гэта наготкі ці адуванчыкі?

— Добра ведаеце кветкі!

— Давайце пагуляем у гульню «Кветнік».

— Я буду садоўнікам, а вы выбірайце сабе назвы розных кветак. Калі я назаву кветку, яна павінна адазвацца і назваць другую кветку. Той, хто забудзецца назвацца, або адкажа не ў свой час, або назаве тую кветку, якой няма, плаціць фант. Потым гэтыя фанты мы разыграем.

— Я пачынаю гульню: «Я быў у садзе, там растуць розныя кветкі. Не было там толькі ружы». Той, хто выбраў сабе назву ружы, хутка ўстае і кажа: «Ружа ў садзе ёсць, а вось касача няма». «Касач», у сваю чаргу, павінен сказаць: «Касач у садзе расце. Там няма півоні» і г. д.

— Малайцы, дзеці, а зараз намалюйце букет з садовых кветак для сваёй матулі.

## *Героі народных беларускіх казак*

Праграмны змест. Замацоўваць характэрныя назвы персанажаў беларускіх народных казак. Замацоўваць правільнае вымаўленне спецыфічных для беларускай мовы гукаў. Вучыць карыстацца інтанацыйнымі сродкамі пры перадачы дыялога. Практыкаваць у правільным выкарыстанні клічнай формы назоўнікаў (коце, браце). Вучыць перадаваць змест кароткіх казак па частках, карыстацца дыялогам.

Матэрыял. Персанажы лялечнага тэатру.

План правядзення

— Да нас у госці прыйшлі артысты. Давайце з імі павітаемся.

Дзеці называюць знаёмых персанажаў казак: лісічка-сястрычка, мушка-пяюшка, камарык-насаты тварык, сарока-белабока, зайка-пабягайка, мышка-нарушка, курачка-сакатушка і г. д. Вітаюцца з імі.

— Звяры прыйшлі да нас з розных беларускіх народных казак. З якой казкі прыйшлі гусак Шыпун і індык Балбатун («Пшанічны каласок»)? Аб чым гэтая казка?

2—3 дзіцяці па чарзе перадаюць змест казкі. Пры неабходнасці выхавальнік падказвае. Апошні дыялог са слоў курачкі разыгрываецца па асобах.

— Здагадайцеся, хто з казачных герояў гэта сказаў:

«Я па паліцах скрабатуха». (Мышка.)
«Я па сажалках рагатуха». (Жаба.)
«Я па елках скакуха». (Вавёрка.)

— З якой казкі гэтыя персанажы? (Муха-пяюха.)

— Я пачну расказваць казку, а вы працягвайце яе далей:

— Пабегла курачка да каровы:

— Карова, карова, дай масла!

А карова адказвае: ...

— Адгадайце, які казачны персанаж так клікаў свайго сябра. Назавіце, з якой гэта казкі:

— Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, па карчах,
Аж бярэ мяне страх!..

— Паўтарыце словы, якімі пеўнік зваў коціка. Як гэтыя словы гучаць па-руску?

— Давайце паспрабуем пераказаць гэтую казку па частках.

## *Лета*

Праграмны змест. Увесці ў слоўнік дзяцей словы і словазлучэнні: горача, яскравае сонейка, прамень, праменнае, прыпякае, квітнеюць, хмарнае неба. Замацоўваць ужыванне абагульняючага спалучэння *летняе адзенне*. Замацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [дз], [дж] у словах і фразах. Вучыць правільна дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў (сонейка, неба). Практыкаваць у правільным выкарыстанні прыслоўяў *улетку, узімку, увосень, увесну*. Вучыць складаць кароткія апавяданні ў выглядзе небыліц.

Матэрыял. Карціна «Летам у парку» з серыі «Поры года» О. І. Салаўёвай; прадметныя і сюжэтныя малюнкі на тэму «Лета»; сінія сігнальныя карткі ў дзяцей; лялька Дзед-Барадзед.

План правядзення

— Знайдзіце адгадку на гэту загадку:

Цёплым сонейкам сагрэта
Прыйшло радаснае... (лета).

*Е. Лось*

— Па якіх прыкметах мы адчуваем, што прыйшло лета? (Выкарыстоўваюцца малюнкі-падказкі: дзеці купаюцца ў рацэ, збіраюць ягады, гуляюць у парку, растуць кветкі, лятаюць матылі.)

— Паглядзіце на гэту карціну («Лета ў парку»).

— Якая пара года адлюстравана на карціне?

— Апішыце летняе сонейка (яскравае, цёплае, праменнае), неба (блакітнае, высокае, светлае, празрыстае, па небе плывуць воблачкі).

— Паслухайце ўрывак з верша А. Дзяружынскага:

Дзень добры,
Сонца-сонейка!
З табой,
Ласкавым,
Добранька.

— Звярніцеся да сонейка так, як у вершы.

— Паглядзіце, якія кветкі намаляваў мастак на карціне. У якое адзенне апрануў людзей, якія гуляюць у парку?

— А як вы апранаецеся летам?

— Ці заўжды летам свеціць сонейка?

— Уявіце сабе, што раптам набеглі цёмныя хмары, неба стала... (цёмнае, чорнае, хмарнае, нізкае).

З цёмнай хмары наўскасяк
Скочыў на зямлю басяк.
І пусціўся басанож.
Вы яго пазналі? (Дождж.)

*Васіль Вітка*

— Давайце пазавём дожджык:

Ідзі, ідзі, дожджык,
Звару табе боршчык.

— Давайце пагуляем у гульню «Сонейка — дожджык».

— Да нас у госці прыйшоў Дзед-Барадзед:

«Добры дзень, дзеткі! Я вельмі люблю гарачае лета. Летам вельмі прыгожа: зялёная трава, яскравыя кветкі, ідзе белы снег. Улетку я надзяю цёплае паліто і іду ў лес збіраць грыбы, ягады і кветкі. Летам у лесе няма птушак — яны паляцелі ў вырай, у цёплыя мясціны. Улетку я вельмі люблю катацца на санках і веласіпедзе. Весела летам!»

(Па ходу расказвання дзеці заўважаюць памылкі ў апавяданні, на кожную з іх падымаюць сігнальную картку і выпраўляюць памылкі.)

— Паспрабуйце самастойна скласці небыліцы.

— Адгадайце, калі гэта бывае:

Трашчаць маразы — улетку ці ўзімку?

Растае снег — увесну ці ўвосень?

Ідзе цёплы дождж... — улетку.

Калгаснікі збіраюць ураджай... — увосень.

Рэчка пакрылася ільдом... — узімку.

— Малайцы, дзеткі! Добра ведаеце, у якую пору года што бывае.

## *Хутка ў школу*

П р а г р а м н ы з м е с т. Увесці ў слоўнік дзяцей новыя словы — назвы вучэбных прылад, замацаваць вядомыя: *сшытак, аловак, крэйда, пэндзаль, падручнік, дошка* і інш.; словы *вучань, вучаніца, настаўніца*; *адказваць, выклікаць, лічыць, ведаць, паўтараць, пытацца*; назвы колераў. Замацоўваць правільнае вымаўленне гука [дз] у складах, словах і фразах. Звярнуць увагу на спосаб утварэння некаторых слоў (аловак, сшытак, падручнік), вучыць ужываць у маўленні прыназоўнік *у* (*у школу*). Практыкаваць у правільным выкарыстанні прыналежных прыметнікаў. Фарміраваць у дзяцей камунікатыўныя ўменні на беларускай мове.

М а т э р ы я л. Вучэбныя прылады: аловак, каляровыя алоўкі ў скрыпцы, сшытак, ручка, азбука, фарбы, пэндзаль, крэйда.

План правядзення

— Дзеці, першага верасня вы, як усе школьнікі нашай краіны, пойдзеце ў школу. Вы станеце вучнямі і вучаніцамі. Дзяніс, ты кім станеш? А ты, Кася? (Апытвае некалькіх дзяцей.) Хто вас будзе вучыць? (Настаўніца.)

— Калі вы будзеце вучнямі, вам спатрэбяцца розныя новыя рэчы — вучэбныя прылады. Яны ляжаць у мяне на стале. Паглядзіце на іх. Я вам загадаю пра некаторыя з іх загадкі:

Што за дрэва ў свеце ёсць,
Што дупло ў яго наскрозь,
А ў дупло забраўся пісар:
Вечна піша і маўчыць,
Ростам гэткі ж, як і дрэва, —
Толькі нос з дупла тырчыць. (Аловак.)

— Нашы продкі пісалі алавянымі палачкамі. Адсюль пайшла назва *аловак*. Гэта які аловак? (Просты.)

Дом без вокан, без дзвярэй —
Поўна ў доме тым людзей.
Там ляжаць браты радочкам —
На іх розныя сарочкі.
(Каляровыя алоўкі для малявання.)

— Чым яшчэ малююць? (Фарбамі і пэндзлямі.) А чым пішуць на дошцы? (Крэйдай.)

Не куст, а з лісточкамі,
Не кашуля, а сшыта,
Не чалавек, а расказвае. (Кніга.)

— А як называюцца кнігі, па якіх вучацца ў школе? Гэта не проста кнігі, а... (падручнікі). Школьнікі вучацца па падручніках у класе, потым робяць хатнія заданні дома — гэтыя кнігі заўсёды ў іх пад рукой, таму яны называюцца падручнікамі. Які самы галоўны падручнік у першакласніка? (Азбука ці буквар.)

— У мяне на стале ёсць яшчэ адна вельмі важная рэч, патрэбная вучням. Загадка пра яе амаль такая ж, як пра кнігу, але ёсць адно адрозненне. Паслухайце ўважліва: «Не куст, а з лісточкамі, не кашуля, а сшыта». (Сшытак.) Чаму ён так называецца? (Таму што яго лісточкі сшыты.)

— Чым пішуць вучні ў сшытках? (Ручкамі.) Куды кладуць ручку і алоўкі? (У пенал.)

— Аловак, пэндзлік, фарбы, сшыткі, ручка, пенал — усё гэта вучэбныя прылады. Яны патрэбны, каб вучыцца ў школе. Усе вучэбныя прылады носяць у... (ранцы).

Падручнікі, сшыткі
Купіла мне мама.
У школу з сябрамі
Пайду я таксама.

*П. Шыбут*

Выхавальнік завучвае вершык з дзецьмі.

Праводзіцца гульня «Збіраемся ў школу». Адно з дзяцей складвае вучэбныя прылады ў ранец, называючы свае дзеянні: «Я кладу сшытак у ранец, цяпер кладу аловак і ручку ў пенал, а пенал — у ранец» і да т. п.

Гульня паўтараецца 2—3 разы.

Дзеці па адным падыходзяць да стала і на свой выбар вымаюць з ранца вучэбныя прылады, потым называюць кожны свой прадмет. Далей выхавальнік звяртаецца да ўсіх дзяцей: «Чый пенал?» — «Марынін пенал», «Чый сшытак?» — «Валодзяў сшытак», «Чыя ручка?» — «Русланава ручка» і г. д.

# *ДАДАТАК ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАНЯТКАЎ*

## *Знаёмства*

Для замацавання лексікі па тэме «Знаёмства» можна правесці з дзецьмі гульні «Як цябе зваць», «Назаві сваё прозвішча», «Маша» і інш.

### Як цябе зваць

Дзеці ідуць па крузе. У сярэдзіне стаіць вядучы, які прыгаворвае:

Я — Алесь, а ты — Марынка,
Хлопчык — я, а ты — дзяўчынка.
Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Як цябе зваць?

Вядучы паказвае на якое-небудзь дзіця, а тое хуценька называе сваё імя.

### Назаві сваё прозвішча

Праводзіцца аналагічна папярэдняй пад прыгавор:

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Бавім час мы не дарма —
Просім хуценька назваць
Сваё прозвішча, імя!

### Маша

Дзеці выбіраюць «Машу», завязваюць ёй вочы, ставяць у сярэдзіну кола і прыгаворваюць:

Маша, Маша, ты пацеша наша!
Ручкі з золата, ножкі з долата,
Валасы кудлатыя, а вочы зыркатыя.

«Маша» хапае каго-небудзь з кола і павінна адгадаць, хто гэта. Той, чыё імя яна адгадае, становіцца «Машай». Гульня паўтараецца.

### Гэта я

Для замацавання засвоенай тэматычнай лексікі падчас мыцця дзецьмі твараў або ў гульні з лялькай выхавальнік чытае пацешку:

Вадзічка, вадзічка,
Памый маё лічка,
Каб вочкі блішчэлі,
Каб шчочкі чырванелі,
Каб смяяўся раток,
Каб кусаўся зубок.

### Мая сям'я

Іншым разам, успамінаючы ласкавыя словы пра маму, дзецям можна прачытаць або развучыць з імі ўрывак з верша М. Хведаровіча:

Маміна імя
Самае лепшае,
Маміна слова
Найдаражэйшае.
Мама! Матуля! —
Чароўнае слова —
Песняй ласкавай
Гучыць на ўсіх мовах.

## *Цацкі*

### Карагод «Зайчык»

У далейшым па тэме «Цацкі» з дзецьмі можна павадзіць **карагод** — «разам з зайчыкам».

Адно дзіця — зайчык (можна ўзяць у рукі цацку). Усе астатнія становяцца ў кола, водзяць карагод. Выхавальнік спявае, заахвочваючы і дзяцей да паўтарэння слоў песенькі:

Заінька за садочкам,
Шэранькі за садочкам,
Заінька, выйдзі ў садзік,
Шэранькі, выйдзі ў садзік.

«Заінька», які да гэтых слоў ходзіць за кругам, уваходзіць у кола. Усе пляскаюць у далоні і спяваюць:

Заінька, рукі ў бокі,
Шэранькі, рукі ў бокі.
Заінька, топні ножкай,
Шэранькі, топні ножкай.

Заінька, пайдзі ў скокі,
Шэранькі, пайдзі ў скокі.
Заінька, папляшы,
Шэранькі, папляшы.

«Заінька» выконвае ўсе ўзгаданыя дзеянні. Потым яму прапануецца другое заданне:

Заінька, выбірай,
Шэранькі, выбірай.

«Заінька» выбірае каго-небудзь з круга, той становіцца зайчыкам. Гульня паўтараецца.

Для замацавання лексікі па тэме «Цацкі» можна наладзіць **гульню ў магазін**.

— Давайце пагуляем у магазін цацак. Я буду прадаўцом, а вы — пакупнікамі. Пакупнікі прыходзяць у магазін, вітаюцца — кажуць: «Добры дзень!», купляюць адну або некалькі цацак. Напрыклад: «Дайце, калі ласка, чырвоны кубік», «Дайце, калі ласка, мішку і ляльку». Калі пакупнік купіць цацку, ён гаворыць «дзякуй».

— Калі ласка, пакупнікі, заходзьце ў магазін цацак.

— Усе купілі сабе цацкі. Якую цацку купіў Міхасік? Якую цацку купіла Алеся? і г. д.

Паўтарыць назвы цацак можна падчас **разглядвання малюнкаў**, на якіх адлюстраваны дзеці з цацкамі: «Паглядзіце ўважліва на малюнак. Назавіце, з якімі цацкамі гуляюць дзеці. Назавіце цацкі, з якімі любіце гуляць вы».

— Паслухайце вершык пра хлопчыка Федзю, ад якога паўцякалі цацкі:

Зноў без адпачынку
Завіхаўся Федзя:
Паламаў машынку,
Разарваў мядзведзя,
Паадкручваў вушы
Шэранькаму зайку,
Перамазаў тушшу
Штонікі і майку.
З гэтае прычыны
Цацкі паўцякалі:
Заяц да Яніны,
А мядзведзь да Валі.

*Т. Кляшторная*

— Чаму цацкі паўцякалі ад хлопчыка?

— Як вы гуляеце з цацкамі?

## *Ветлівыя словы*

Завучванне верша Т. Кляшторнай «Ветлівыя словы»:

Калі ласка, дзякуй,
Добры дзень —
Ветлівыя словы
Чую ад людзей.

Я таксама буду
Імі даражыць:
З ветлівымі словамі
Лёгка жыць.

Дзеці адказваюць на пытанне, чаму з ветлівымі словамі лёгка жыць.

## *Родная мова*

Завучванне верша «Хто я?»:

Узяў мяне одум:
Хто я такі, адкуль родам?
І дазнацца ў мамы мусіў —
Беларус я, з Беларусі.

*Васіль Вітка*

## *Нашы імёны*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных вершаў:

***

Згатавала Саша
Кашу для Машы.
Маша Сашы ўдзячная,
Каша ў Сашы смачная.

*М. Праснякоў*

**Лічылка**

Ля Яўгена села Лена,
Ля Генадзя села Ядзя,
Каля Зосі — два Антосі,
Каля Надзі — два Аркадзі,
Каля Янкі — тры Святланкі,
Каля Сашы — тры Наташы.

Колькі тут дзяўчат усіх?
Колькі хлопчыкаў ля іх?
Хочаш ведаць — не сядзі,
Сам цяпер лічыць ідзі!

*Н. Парукаў*

Каляровы папяровы
Змей лятаў.
З-пад хмурынак вечаровых
Вы-гля-даў:
Дзе Міхаська-бегунок,
Дзе Адаська-вертунок,
Дзе Настуся-балаўніца,
Дзе Дануся-працаўніца?
Ці чытаюць,
Ці гуляюць,
Ці сядзяць,
Ці памагаюць?
Калі ж рана леглі спаць,
У гульню — не браць!

*М. Чарняўскі*

## *Садавіна і агародніна*

Развучванне верша І. Муравейкі «Ладкі». Дзеці ідуць у **карагодзе** і выконваюць рухі, адпаведныя зместу верша:

Ладачкі-ладкі!..
Мы палолі градкі,
Мы палолі самі,
Сваімі рукамі.

Ад старанай працы
Выраслі на градцы:
Вось такія буракі!
Вось такія агуркі!
А капусты качаны
Вось такой велічыні!

Наступным разам можна прачытаць малым верш Пімена Панчанкі «У магазіне»:

Ідзе вясёлы продаж.
Сам выбірай, бяры
Садоў і агародаў
Духмяныя дары.

Капуста, памідоры
І сопкай бульбы горы,
А кут запаланілі
Цяжкія кавуны.

Арэхамі звінела,
І пахла часнаком,
І яблыкамі спелымі
З бурштынавым бачком...

Дзеці знаходзяць у кошыку ці на малюнку садавіну, пра якую расказваецца ў вершы. Верш можна выкарыстаць у якасці зачыну да гульні ў магазін садавіны і агародніны.

З такой жа мэтай можна выкарыстаць верш Ніны Галіноўскай «Гародніна і садавіна»:

Гародніна
і садавіна
з восеньскага
лімузіна:
грушы, морква,
кабачкі,
слівы, бручка,
буракі,
бульба, яблыкі,
хурма,
гарбузы.
І ўсё — дарма.
Дзеці, вы сказаць
павінны:
што — гародніна,
што — садавіна?

*Н. Галіноўская*

Да тэмы «Агародніна» можна дадаць і верш Л. Пранчака «Памочнікі»:

Бульбу капае
Бабуля на градах.
Бульба ўрадзіла.
Бабуля рада.
Ёй Ганна і Пеця
Дапамагаюць.
Бульбу ў кошык
Лазовы збіраюць.

Бабуля памочнікам
Шчыра ўдзячная.
З бульбы спячэ яна
Дранікі смачныя.
Для ўнукаў увішных —
Анюткі і Пеці —
Дранікі тыя
Смачнейшыя ў свеце!

***

Лета цэлае
Цыбулька
Працавала.
Аж пацела.
Сто сукеначак
Прыдбала
І адразу ўсе
Надзела.

*Л. Шырын*

## *Мой дзень у дзіцячым садзе*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

### Уладзя-майстрыха

Уладзя-майстрыха
Цацкі ўмее рабіць:
Бусла з пластыліну зляпіць,
Улітку, вугра, улюблёнага ў мора,
Чырвоныя яблыкі і памідоры.
А мышку зрабіла, дык Васька-каток
Угледзеў, схапіў — узяў у раток.
Уладзя смяялася, кот хваляваўся,
Пакінуў «здабычу»
І ў кут свой падаўся.

*А. Дзяржынскі*

### Працавітая дзяўчынка

Як маленькую сяброўку,
Ляльку любіць Каця.
То расчэша ёй галоўку,
То памые плацце.

То пагушкае на ручках,
То пацешыць байкай —
Як у лесе ў дрымучым
Заблудзіўся зайка.

Ляльцы ловіць
матылёчка
Шапачкай сваёю,
Праз шнурочак-паясочак
Скача перад ёю.

Спаць паклаўшы паміж
кветак
У цянёк духмяны,
Ёй з пясочку шмат катлетак
Напячэ румяных.

За турботамі, за працай
Так і дзень мінае,
А самой пазабаўляцца
Часу не хапае.

*А. Александровіч*

## Як зроблены цацкі

У Дзяніскі сёння свята:
Цацак дзед прынёс багата —
Верталёт і самаходку,
І пластмасавую лодку,
Матаролер і машыну
З размалёванай кабінай.
Рад Дзяніска, вельмі рад.
І паставіў цацкі ў рад.
Перш узяўся за машыну —
Адвінціў ураз кабіну,
Потым колы паздымаў.
Верталёт той паламаў.
Разабраў на дзіва скора
Да драбніцы матаролер.
Дзед убачыў, забубніў:
— Што ты з цацкамі зрабіў?
Я табе іх нёс гуляць —
Хіба ж можна іх ламаць?
Не купляў бы я, каб ведаў.
А Дзяніска кажа дзеду:

— Мне карцела разабрацца,
Як жа зроблены ўсе цацкі,
А ва ўсім як разбяруся —
Цацкі зноў складу, дзядуся!

*А. Ставер*

### Гэй, мой конік

Гэй, мой конік, гэй, мой сівы!
Танканогі, даўгагрывы!
Галавою страсяні,
Капытамі зазвіні!
І далёка, мілы мой,
Паімчымся мы з табой!

*З. Бядуля*

## ***Наш пакой***

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў.

### Загадкі

Побач стаяць, на вуліцу глядзяць, а сябе ніколі не бачаць. (Вокны.)

Цэлы дзень толькі тым і заняты,
Што праводзяць то ў хату, то з хаты. (Дзверы.)

*А. Клышка*

Два браты адзін на аднаго глядзяць, а разам не сыйдуцца. (Падлога і столь.)

Поле шкляное, а межы дрывяныя. (Акно.)

Поле — шкляное,
Празрыстае,
Чыстае,
Межы —
драўляныя,
Падмаляваныя. (Акно.)

### Дзверы

— Хто ахоўвае кватэру?
— Нам вядома! Гэта дзверы!

Дзверы нашы новыя,
Моцныя, дубовыя.

Хітры ёсць у іх замок
(А дзе ключык — не кажы).
Пазнаюць яны здалёк,
Свой з'явіўся ці чужы.

Тату, маму і сыночка
Ўраз угледзяць круглым вочкам.

*Г. Каржанеўская*

**Акно**

Без вокнаў дому не бывае.
Акно нам далеч адкрывае.

Там школа, а далей — завод,
Снуе па вуліцы народ.

Кудысць бягуць аўтамабілі,
Бы штосьці, бедныя, згубілі.

Каштаны, ліпы зелянеюць,
Ідуць дажджы, вятрыскі веюць.

Акно таксама дзверы ў свет.
Так лічыць сябра ваш, паэт.

*Г. Каржанеўская*

### *Прадукты харчавання*

Чытанне верша Л. Мароза «Каламбір»:

Ліманад, цукеркі, сыр —
Скрозь ласункі ў краме...
— Ты купі мне каламбір! —
Кажа Вова маме.

Цягне маму ў той куток,
Дзе блішчыць вітрына,
Там прыладзіўся латок,
Сіні, як ільдзіна.

І пламбір там напаказ
Выстаўлены белы...
Слова хлапчукова ўраз
Мама зразумела.

Ліманад, цукеркі, сыр
Хтосьці выносіць з крамы...
Ну, а ў Вовы ёсць пламбір —
Каламбір той самы.

### *Адзенне і абутак*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Загадкі**

Ну і дзіўны посуд
Носіш, браце, ты:
Дагары дном — поўны,
Дном уніз — пусты. (Шапка.)

*А. Клышка*

Пухнатае ягнятка — хто ж падумаць мог? —
Днём яно — з нагамі, а ўначы — без ног. (Шарсцяная шкарпэтка.)

*А. Клышка*

Пяць пунь, адны вароты. (Пальчаткі.)

**Рукавічкі**

Воля з Юляю — сястрычкі,
сёння плачуць у двары.
— Мы... згубілі... рукавічкі,
як куляліся з гары.
Мы шукалі іх дарма:
іх нідзе няма... няма...
Выпаўз Тузік з будкі:
— Гаў!
І пабег.
І — адшукаў!!!
— Бярыце, сястрычкі,
свае рукавічкі!
Бегайце,
гуляйце,
болей —
не губляйце!
Гаў!
Гаў!
Гаў!

*Г. Іванова*

**Валёнкі**

Коця коўзацца хадзіў,
сабе лапкі застудзіў.
Прыбег да Алёнкі:
— Пазыч мне валёнкі!

Я зімою панашу,
а вясною прынясу!

*Г. Іванова*

## Абнова

Мне купілі чаравічкі,
Як чырвоныя сунічкі!
Заўтра рана-ўранку
Стану я на ганку,
Па баках пагляджу,
А чаму — не ска-жу!

*Г. Іванова*

## Сандалікі

Тата мне
Купіў сандалікі,
Сандалікі-скакалікі.
Я ў сандалікі
Абулася,
Танцую і любуюся.
Мае ножкі
Не лянівыя.
Я — самая шчаслівая.

*В. Карпечанка*

## Паліто

Добра тым, хто край паўднёвы
Засяліў. Нашто абновы?

Ну, а ў нас без паліто
Не абыйдзецца ніхто.

Нам яно — што зверху мех.
Хай мароз, хай сыпле снег —

Дастаткова зашпіліцца;
Нас тады зіма баіцца.

Бо ад пят да барады
Ад яе схаваны ты.

*Г. Каржанеўская*

## Чаравікі

Я марудзіць не прывык,
Не люблю спакою.

Я — рухавы чаравік.
Нас, дакладней, двое.

Разам — значыць, пара нас.
У садок дзіцячы,
А пасля ў першы клас
Пойдзем, не іначай.

Ну а вырастуць няхай
Ногі ў Ігната,
Скажам хлопчыку «бывай» —
І хутчэй да брата.

*Г. Каржанеўская*

### Шалік

Бываю да пят,
І цяпла ў мяне многа.
Сагрэю малога,
Сагрэю старога.

Прагулка зімовая,
Спорт ці работа —
Я буду дарэчы,
Я дам вам пяшчоту.

Адкуль я, спытаеце,
Добранькі гэткі?
З клубка,
І рукамі матулі сагрэты.

*Г. Каржанеўская*

## *Свойскія жывёлы*

Гульня «Пераблытанка», у якой можна выкарыстаць верш Н. Галіноўскай:

Што за дзіва: сярод ночы
Чутны незвычайны хор.
Кот спявае: «Аў-аў-аў»,
А сабака: «Мяў-мяў-мяў».
Конь сярдуе на яго,
Барытонам цягне: «Му-у-у,
Голас чый, не разбяру».
Нехта цінькае: «Цік-так».
Гэта што там за спявак?
Певень: Вось табе і на!

Выхавальнік чытае верш цалкам, затым па частках, а дзеці выпраўляюць недарэчнасці. Выхавальнік заахвочвае малых да ўтварэння дзеясловаў: кот спявае «мяў-мяў-мяў» — ён мяўкае; сабака гаворыць «гаў-гаў-гаў» — ён брэша (звяртаецца ўвага на род назоўніка *сабака*) і г. д.

— Жывёлы маюць дзіцянят. Паглядзіце на малюнак і скажыце, хто ў каго. (У кошкі — кацяня, у качкі — качаня (голасам падкрэсліваецца *ня*), у казы — казляня, у каровы — цяля, у кабылы — жэрабя, у сабакі — шчаня, у авечкі — ягня, у трусіхі — трусяня.)

У далейшым можна выкарыстоўваць наступныя мастацкія творы:

Зажурыўся кот вусаты:
— Прэч падамся з вашай хаты.
Што мне жыць у вас дарма,
Як мышэй у вас няма!

*Г. Іванова*

У канаву парсючок
Лёг спакойна на бачок.
Лёг, паціху рохкае,
Бы жыццё нялёгкае.
Соладка прыжмурыў вочы
І варочацца не хоча...

*П. Пранузa*

Ой бычок, мой бысенька,
Залатая лысінка,
Бадлівыя рогі,
Тупучыя ногі,
Ты паціхеньку хадзі,
І дзіцятка не будзі.

***Звяры нашых лясоў***

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Воўк і зайцы**

Раз, два, тры, чатыры —
Зайчык вушкі натапырыў.
Ідзе з лесу воўк, воўк
І зубамі шчоўк, шчоўк.
Мы схаваемся ў кусты:
Зайка, я, і ты, і ты,

Ты ж, ваўчына, пачакай,
Як схаваемся — шукай!

*Васіль Вітка*

Верш можна выкарыстаць для рухавай гульні: дзеці-зайцы (4—5) скачуць на дзвюх нагах урассыпную, узгадняючы рух з тэкстам верша. Астатнія стаяць у крузе і пляскаюць у далоні. На апошні куплет дзеці хаваюцца за спінкамі крэслаў, якія стаяць па крузе. Загадзя выбраны «воўк» шукае «зайцоў», забірае тых дзяцей, якія паварушыліся.

### *Птушкі*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

Панадворку, каля хаты,
Ходзяць куры й кураняты.
Хто сакоча, хто кудахча,
Хто па стрэхах спрытна скача.

*Ул. Карызна*

**Хрыпаты пеўнік**

Захварэў пявун, ахрып,
Пэўна, у пеўня страшны грып.
Маці — курыцу-квахтуху —
Не любіў крыклівы слухаць,
Ён хадзіў па садзе босы,
Абтрасаў на траўцы росы,
Пасля гульняў, прапацеўшы,
Ён крычаў, на плоце сеўшы.
Па халодных лазіў лужах,
Вось таму і занядужыў.
Мо ангіна, можа грып?
Захварэў пявун, ахрып.

*С. Шушкевіч*

Не будзільнік,
А праспаць
Гаспадыні
Ён не дасць.

Прапяе шмат раз:
— Пад'ём!
І ўвесь разбудзіць
Дом.

### *Летні дзень*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Лета**

У сукенцы каляровай,
У хусцінцы васільковай
Ходзіць лета па палях,
Па расквечаных лугах.

Звоніць песняй жаўруковай
Кожны дзень званчэйшай, новай.
Дбайна сонечнае лета
Спеліць ягады для дзетак.

Любіць з імі забаўляцца.
Загараць, спяваць, купацца.
Дораць дзеці лету ўсмешкі,
Гульні, песні і пацешкі.
А расчуленае лета
Дорыць ім букеты кветак.

*Н. Галіноўская*

### *Восень*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Восень залатая**

Восень, восень залатая
Сее радасць на зямлі,
Хмарка ў сінім небе тае,
Мкнуць у вырай жураўлі.

Ніткай срэбнай павуцінне
У косах сонейка блішчыць.
Што за цуднае зіхценне!
Што за ціш вакол стаіць!

Я іду лясною сцежкай,
Як па мяккім дыване.
Восень з ветлівай усмешкай
На спатканне выйшла мне.

Ярка, хораша прыбрала
Усюды дрэвы і кусты
І зямлю памалявала
У колер жоўта-залаты.

*С. Новік-Пяюн*

**Збіраюць дзеці лісце**

Не чутна, як калісьці,
Птушыных спеваў-трэляў.
Збіраюць дзеці лісце
Ля сцежак і арэляў.

Альховае, кляновае,
Яно злятае з дрэў.
Дзіцячыя далонькі
Асенні ловяць спеў.

*Н. Пінчук*

## *Ветлівыя словы*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Прабачэнне**

Паглядзі, сяброўка Жэня,
Лыска просіць прабачэння:
Ён крыху мяне аблаяў, —
Думаў, цётка я чужая...
Не пазнаў мяне ў сенцах,
Бо я ў новенькай сукенцы.
Бачу, у Лыскі ёсць сумленне —
Шчыра просіць прабачэння:
Лашчыцца, да ног схіліўся:
— Ой, даруй мне, памыліўся!

*Л. Мароз*

## *Мы прымаем гасцей*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Гасцінцы**

У хусцінцы —
Тры гасцінцы:

Табе, братка, —
Шакаладка,
Табе, дружок, —
Піражок,
А сястрычцы —
Тваражок,
Табе, свінка, —
Хусцінка:
Умыйся,
Утрыся
І спаць
Лажыся.

*Васіль Вітка*

**Малыя аленікі**

Малыя аленікі,
Елі варэнікі,

Журавель — журавіны,
А жырафа — апельсіны,

Бегемот — ананасы,
А янот — бульбу з квасам.

Жук жур жор,
Тхор сыр цёр,

Грызла рысь рыс,
Барбос — барбарыс.

Вам наце
Па аладцы.
Табе, браце, —
Закрывацца.

*Васіль Вітка*

***У пакоі***

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Шафа**

Ого,
высокае стварэнне!
Вышэй, чым лямпачкі святло.

Куды б падзелі мы адзенне,
Калі б яе ў нас не было?

Мы б прапалі, дайце веры,
Паміж сукенак і кашуль.
Усю б завешалі кватэру
І парасkладвалі б паўсюль...

*Г. Каржанеўская*

**Крэсла**

Зоркі першыя мігцяць,
Скора «Калыханка».
Крэсла хоча вас абняць,
Вас чакае зранку.
Добра ў ім,
Прыемна ў ім...
Ці то дрэмлем, ці то спім?

*Г. Каржанеўская*

**Стол**

Да пісьмовага стала
Нас дарожка прывяла.

Кнігі, ручкі тут ляжаць,
А ніжэй — шуфлядак з пяць.

У іх патрэбныя паперы,
Вось і важны стол без меры.

Мэбля ўсё-ткі, шафы брат.
Месца ён займае шмат.

*Г. Каржанеўская*

**Дыван**

І вочы радуе, і ногі лашчыць ён,
Усіх вітае,
Кожнаму відзён.
Як быццам кветнік ці вясновы луг.
Цярплівы наш,
Адданы самы друг.

Многа рэчаў навакол,
Зручных і прыгожых.
«Смачна есці!» кажа... стол,
«Добрай ночы!» — ложак.

*Г. Каржанеўская*

### *Прафесія і праца*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Размова аб прафесіях**

Раз сышліся на двары
Юныя рамеснікі
І пачалі гаварыць
Аб сваіх прафесіях:
Што каштоўней, што важней
Для краіны і людзей.

— Я шліфую, я тачу
Рэчы далікатныя,
Справу токара лічу
Самаю выдатнаю.
Нават трактар без мяне
Кола з месца не скране.

— Муляр з цэглы дом кладзе,
Сценка ў сценку роўныя.
Вы не знойдзеце нідзе
Працы больш шаноўнае.
Дзе ні вуліца, ні пляц,
Як паглядзіш — мой палац.

— Што ты нам не гавары —
Вушы не развешу я,
Я за слесара, сябры,
Вось дзе дык прафесія.
Ні замок, ні нож, ні крук
Без маіх не зробіш рук.

— За варштатам я стаю,
Тку адменнай пражаю,
Я прафесію сваю
Лічу самай важнаю.
Апранаю я народ
У бастон і каверкот.

— А вось справа швейная
Самая надзейная:
Абыходзіць голка свет,
Кожны голкаю адзет.

— Дайце слова, мне пара,
Марна вокал ходзіце,
Лепшай, чым у друкара,
Працы вы не знойдзеце.
Без кніжок ды без газет
Не абыходзіцца ўвесь свет.

*А. Астрэйка*

### Піла

Пілавала, пілавала,
Покуль моцна не прыстала.

Стала горача піле.
Адпачыць бы ёй, але

Птушкі домікаў чакаюць,
На яе надзею маюць.

Выцер пот з ілба хлапчына:
— Ну, піла, ты — малайчына!

*Г. Каржанеўская*

### Малаток

Тату нашаму адданы,
Цвік забіць стараецца.
А якая ў ім загана —
Палец здагадаецца.

*Г. Каржанеўская*

### Нажніцы

Вой, якія ўжо віхры!
Хоць ты іх вяжы, бяры!

Каб дзяўчынкай не зрабіцца
Успамінайце пра нажніцы.

Цёця спрытненька чык-чык —
І відно, што хлоп-чык.

Да ўсяго прывычныя,
Востра-металічныя.

Рэжуць, што ім не падай,
Толькі рук не падстаўляй.

*Г. Каржанеўская*

### *Зіма*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Сняжынкі**

— Мая сняжынка!
— Мая сняжынка! —
Крычаць-спрачаюцца дзве Ірынкі,
Сняжынкі ловячы, якія
Лятуць, як матылькі жывыя.
Пайшлі да зайчыка дзве Ірынкі,
Каб рассудзіў ён: чые сняжынкі?

*Максім Танк*

**Сняжынкі**

Сняжыначкі-пушыначкі
Ляцелі матылькамі,
Над хмызамі, над шызымі
Дыміліся дымкамі.

Зіхцеліся, мігцеліся
У розныя калёры.
Драбнюткія, пякнюткія,
Як зоранькі, як зоры.

Насіліся, кружыліся
Над ціхімі палямі.
Даліначкі сняжыначкі
Пакрылі дыванамі.

Над елкамі, над хвойкамі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
будуем тут у гаі.

Маленькія, міленькія,
Дзіцяткі-птушаняткі,
Ляціце вы, скачыце вы
У светленькія хаткі!

Вушастыя, пушыстыя,
З драцінкамі-вусамі
Вы зайчыкі-малойчыкі, —
У хаткі к нам таксама!»

Сняжыначкі-пушыначкі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі».

*З. Бядуля*

## Сняжынкі

Закружыліся
Сняжынкі
Нізка-нізка
Над зямлёй.

Ціха лётаюць
Пушынкі
Незлічонай
Чарадой.

Быццам тыя
Матылёчкі,
Весяляцца
Нездарма —
Адамкнула
Усе замочкі
У небе ім
Сама зіма.

*А. Дзеружынскі*

## Сняжок

Закружыліся сняжынкі,
Ну, нібыта матылькі.
Надзя — жвавая дзяўчынка —
Ловіць іх у дзве рукі.

А ў самой сняжок
На вейках,
На плячах,
На каўнеры —
Нібы гэта не Надзейка,
А снягурка на двары.

*І. Шуцько*

### *Наша краіна*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Міколкавы пытанні**

— Француз па-французску,
Па-польску — паляк
Гаворань з маленства.
А я, мама, як?

Замежную мову
Я ў садзе вучу,
А на беларускай
Не ўмею, маўчу.

Чаму, адкажыце мне,
Ты, тата і дзед
Не размаўлялі
На роднай нідзе?

Я рускую мову
Люблю і вучу,
І нашу таксама
Я ведаць хачу.

Буквар беларускі
Прашу мне купіць
І родную мову
Пачну я вучыць.

*М. Пазнякоў*

**Мой край**

Ад ветру гнуцца вербалозы,
Бяжыць дарога напрасткі.
Мой край — бялюткія бярозы
Абапал сіняе ракі.

Мой край — лугі і пералескі,
Крыніцы звон і шум лясны,
Мой край — блакітныя пралескі
На сцежках ранняе вясны.

Высока ў небе вырай кружыць:
Ляціць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край.

*В. Вярба*

### *Лічбы і формы*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Народныя лічылкі**

Боб ды боб — два бабы,
А яшчэ боб — тры бабы.
Бег сабака цераз мост,
Чатыры лапы, пяты хвост.

**Загадкі**

Два канцы, два кальцы, а пасярэдзіне цвік. (Нажніцы.)
Чатыры вушкі і два брушкі. (Падушка.)
Чатыры браты адзін капялюш надзелі. (Стол.)
Чатыры тапатыркі, дзве татыркі, сёмы вярцель. (Карова.)

Для замацавання правільнага вымаўлення лічэбнікаў у далейшым можна выкарыстаць наступны матэрыял:

**Рамонкі**

Раз — рамонак,
Два — рамонак,
Тры, чатыры, пяць...
Не злічыць усе —
Наўкола,
Нібы сонейкі, гараць.

*М. Пазнякоў*

(Выхавальнік чытае верш, паказваючы малюнак з выявай мноства рамонкаў, якія прапануе дзецям палічыць.)

**Смачныя ірыскі**

Каля горкі
Два Рыгоркі,
Дзве Марынкі,
Дзве Ірынкі,
Два Барыскі,
Дзве Ларыскі
Елі
Смачныя ірыскі.

*А. Дзержынскі*

Выхавальнік пытаецца: «Колькі дзяцей было каля горкі? Два... (Рыгоркі), дзве... (Марынкі)» і г. д. Прапануе замяніць слова *два* на *тры*: «Каля горкі тры Рыгоркі, тры Марынкі...».

Затым слова *тры* замяняецца на слова *чатыры*.

Гульня «Хто ўважлівы?». Выхавальнік гаворыць, што раскажа верш па-новаму, і прапануе сваім выхаванцам запомніць, колькі было дзяцей у вершы:

Каля горкі
Тры Рыгоркі,
Дзве Марынкі,
Чатыры Ірынкі,
Тры Барыскі,
Дзве Ларыскі
Елі
Смачныя ірыскі.

Выхавальнік пытаецца, колькі было Рыгорак? (Тры Рыгоркі.) Марынак? (Дзве Марынкі.) І г. д.

**Лічылка**

Ля Яўгена села Лена,
Ля Генадзя села Ядзя,
Каля Зосі — два Антосі,
Каля Надзі — два Аркадзі,
Каля Янкі — тры Святланкі,
Каля Сашы — тры Наташы.
Колькі тут дзяўчат усіх?
Колькі хлопчыкаў ля іх?
Хочаш ведаць — не сядзі,
Сам цяпер лічыць ідзі!

*Н. Парукаў*

### *Вясна*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Вясной**

Грэе сонца, свеціць сонца,
Пахнуць кветкі і трава.
Радасць, радасць, гул бясконца!
Скачуць жабы — ква-ква-ква!

Птушкі-грайкі вядуць гулі
На бярозавым суку.
Кліча ў поле птах-зязюля,
Кліча зычна — ку-ку-ку!

Шэпчуць дрэвы. Грае рэчка.
Квокчуць куры на двару.
Скок і скок на луг авечка,
Брыкне, мэкне — мэ-мэ-мэ!

Матылёчак, як вясёлка,
Мігаціць пад гул і шум.
Над мядочкам звоніць пчолка,
Баіць байкі — зум-зум-зум!

Як жывыя — гай, шнурочкі.
Грае, ззяе ўся зямля.
А хлапчына на лужочку
У свісцёлку — тра-ля-ля!

*З. Бядуля*

## Лісце прыляцела

Раненька
На зорцы, на зары
Прыляцелі
Цёплыя вятры,

Сонца на блакіт снягоў
Прынеслі —
Зазвінелі ручайкі,
Як песні.

Прыляцелі жаўранкі
Здалёк,
Кожны галасок —
Нібы званок.

І шпакі за імі
Прыбылі,
Свіст парассыпалі
На палі.

Вось і лісцікі
Нарэшце прыляцелі,
Дружна
На галінках дрэў
Паселі.
Птушак слухаюць,
Паветра п'юць
І, здаецца,
Зараз запяюць!

*Ул. Карызна*

*Кветкі*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Рамонак**

На танюткай ножцы гнуткай
На лужку, ля ручая,
У каўнерыку бялюткім
Гэту кветку ўбачыў я.

Ясным вокам, жоўтым гэткім,
Паглядзела на мяне...
Я сарваць памкнуўся кветку,
А пчала сказала: — Не!

*Н. Пазнанская*

***

Назбіраем
Сініх кветак.
Іх у полі
Многа летам.
Вырастаюць
Ля сцяжынкі.
Як завуць іх?
Адкажы мне.

**Кветкі**

Колькі кветак ля ракі!
Сінія, як вочкі,
Незабудкі і браткі,
Смолкі і званочкі.

І мядунка, і герань,
Слёзкі, мята, кашка!
Сто букетаў назбіраць
Тут за дзень няцяжка.

Паміж кветак, у траве,
Не разгледзець Светку:
Толькі бант на галаве
Мільганецца зрэдку.

Рве па кветачцы адной,
Выбірае з густам.
Нечакана для самой
Напаткала бусла!

Не спалохаўся ані
Прыгажун цыбаты,
Хоць за дзюбу пацягні
І вядзі дахаты.

— Я ж цябе не зачаплю,
Мілы, добры бусел,
Я сабе букет раблю,
Вось ён — палюбуйся!

А цыбаты — хоць бы што!
І не чуе Светку!
Можа быць, дзяўчынку ён
Палічыў за кветку?

*Н. Гілевіч*

## *Лета*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

### Лета

Прыйшло лета. Куды ні глянь — усюды зелена, усё расце, усё наліваецца. Лісце на дрэвах вырасла ва ўвесь рост свой і трапечацца на сонцы. Весела пазірае стары лес, што разросся за сялом і цягнецца па краях поля... кусты арэшніку, рабіны, чаромхі густа разрасліся ўнізе і далёка параскідалі свае зялёныя галіны. Так зелена, так густа, што здаецца, не пралезеш у лес! Птушкі аж глушаць сваімі галасамі, сваім шчэбетам. Некаторыя, раннія, ужо вывелі дзетак і клапатліва шчабечуць каля сваіх гняздэчак, як нянькі каля калыскі...

Густая высокая трава, як мора, калышацца на ветры. А кветак, кветак! Якога толькі колеру не найдзеш тут кветак! Мільёны пчолак, чмялёў уюцца над імі са звонам і шумам. Так і цягне на прывольны луг, дзе так многа кветак, птушак, усякіх конікаў і матылёчкаў, песень, шуму і звону, дзе так прахалодай дыхае чысты, свежы ветрык.

Шчыраю рукою ўбрала лета ўвесь Божы свет.

*Якуб Колас*

*Хутка ў школу*

Замацаванне і актывізацыя лексікі па тэме пры дапамозе наступных мастацкіх твораў:

**Развітанне**

Бывай,
Бывай,
Дзіцячы сад!
Ужо нас
Кліча школа.
З нас сёння кожны
Вельмі рад
І трошкі —
Невясёлы.

Бо развітацца
Нам пара.
Час
Хутка пралятае.
Няхай
Другая дзетвара
Без нас тут
Падрастае.

А вам —
Пашана і любоў,
І дзякуй вам
Таксама,
Усім,
Хто гэтулькі гадоў
Расцілі нас, як мамы!

**Прыказкі, прымаўкі**

Усе веды з азбукі пачынаюцца.

Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць.

Хто многа чытае, той многа знае.

Кніга — маленькае акенца, ды праз яго ўвесь свет відаць.

*А. Грачанікаў*

## *Літаратура*


1. *Арушанова, А. Г.* Речь и речевое общение детей 3—7 лет / А. Г. Арушанова. М., 1999.
2. *Дубініна, Дз. М.* Мая родная старонка / Дз. М. Дубініна, Дз. Ул. Дубінін. Мн., 2000.
3. *Старжынская, Н. С.* Беларуская мова ў дзіцячым садзе / Н. С. Старжынская. Мн., 1995.
4. *Старжынская, Н. С.* Навучанне дашкольнікаў беларускай мове ў дзіцячым садзе з рускамоўным рэжымам / Н. С. Старжынская, Н. І. Маскаленка // Пралеска. 1992. № 6, 7—8, 10.
5. *Старжынская, Н. С.* Падкажы слоўца / Н. С. Старжынская. Мн., 2003.
6. *Старжынская, Н. С.* Развіццё беларускамоўных зносін дашкольнікаў / Н. С. Старжынская, Дз. М. Дубініна. Мн., 2001.
7. *Старжынская, Н. С.* Сябруем і гуляем разам / Н. С. Старжынская. Мн., 1994.
8. *Старжынская, Н. С.* Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення ў дашкольнікаў / Н. С. Старжынская. Мн., 2000.
9. *Старжынская, Н. С.* У свеце слоў і гукаў / Н. С. Старжынская. Мн., 2001.
10. *Чуковский, К. И.* От двух до пяти / К. И. Чуковский. Мн., 1983.
11. *Шылько, Т. М.* Дзеткі вучацца гаварыць па-беларуску / Т. М. Шылько. Гомель, 1996.

## *Змест*

Прадмова ........................................ 3

АЗНАЯМЛЕННЕ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ ДЗЯЦЕЙ РАННЯГА ЎЗРОСТУ ........................................ 6

Маляты (сцэнарыі маўленчых зносін з дзецьмі) ........................................ 7

ЗАНЯТКІ ПА НАВУЧАННІ ДАШКОЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ........................................ 18

Чамучкі (4-ты год жыцця, 2-е паўгоддзе) ........................................ 20

Чамучкі (5-ты год жыцця) ........................................ 28

Фантазёры (6-ты год жыцця) ........................................ 55

ДАДАТАК ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАНЯТКАЎ ........................................ 84

Літаратура ........................................114

Вучэбнае выданне

**СТАРЖЫНСКАЯ** Наталля Сцяпанаўна
**ДУБІНІНА** Дзіна Мікалаеўна

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

*Дапаможнік для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі*

Вядучы рэдактар *Т. Дз. Сасім*
Рэдактар *Т. Дз. Сасім*
Мастак вокладкі *А. М. Рогава*
Тэхнічны рэдактар *А. М. Солапава*

Падпісана да друку з арыгінал-макета 14.12.2007. Фармат 60x84/16. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Друк трафарэтны. Ум. друк. арк. 6,74. Ул.-выд. арк. 5,81. Дадат. тыраж 1000 экз. Заказ 45124.

ТАА ВД «Белы Вецер». ЛИ № 02330/0056758 ад 27.01.2004. 247760, г. Мазыр, вул. Савецкая, 198/4. Філіял: 220007, г. Мінск, вул. Валадзько, 30, оф. 417. Тэл. (017) 224-66-89, 298-50-26, 298-50-27.

Надрукавана рызаграфічным спосабам друку. ТАА ВД «Белы Вецер». 247760, г. Мазыр, вул. Савецкая, 198/4. Тэл./факс (02351) 2-51-03, 2-51-22. E-mail: belveter@mail.gomel.by

ISBN 978-985-514-126-7

**Па пытаннях набыцця
звяртайцеся на адрас:**

ТАА ВД «Белы Вецер»,
247760, г. Мазыр, вул. Савецкая, 198/4.
Тэл./факс (02351) 2-51-03, 2-51-22.
Філіял: 220007, г. Мінск, вул. Валадзько, 30,
оф. 417. Тэл. (017) 224-66-89, 298-50-26,
298-50-27.